ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 Г.
№ 23 (891) 6 — 12 ЧЭРВЕНЯ 2009 Г.

КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

С. 3, 12 — 13

С. 11

С. 7— 8,17 —18

С. 14

У гэтым нумары "Культура" друкуе Зводны план устаноўкі манументальных збудаванняў у Рэспубліцы Беларусь у 2009 — 2012 гг. Гэты дакумент дае нам шырокую панараму тых помнікаў, мемарыяльных знакаў, што паўстануць на вуліцах гарадоў, мястэчак і вёсак нашай краіны ў самым хуткім часе. Немалое месца ў спісе адведзена і тым праектам, якія неўзабаве ўвасобяцца на старадаўніх вулках гасціннага Нясвіжа... Дык чыя ж выява паўстане наступнай перад гараджанамі і турыстамі непадалёк ад палаца Радзівілаў?

Фота Юрыя ІВАНОВА

С. 4 — 5, 19

НЯСВІЖ І НЕ ТОЛЬКІ

Ў АТАЧЭННІ ПАМЯЦІ НАШЧАДКАЎ

Афіцыйна

Кадравыя рашэнні Прэзідэнта

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка назначыў Уладзіміра Матвейчука памочнікам Прэзідэнта Беларусі, вызваліўшы яго ад пасады міністра культуры. Аб гэтым БелТА паведамілі ў Прэс-службе беларускага Лідэра.

Міністрам культуры Беларусі назначаны Павел Латушка. Адпаведнае кадравае рашэнне прыняў сёння Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, паведамілі БелТА ў Прэс-службе беларускага Лідэра.

Да кастрычніка 2008 года Павел Латушка знаходзіўся на дыпламатычнай рабоце: займаў пасаду Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча.

Як адзначыў Павел Латушка ў размове з журналістамі, Прэзідэнт надае вельмі важнае значэнне развіццю культурнай сферы Беларусі, якая з’яўляецца часткай дзяржаўнасці. “Трэба стварыць новы імпульс і новыя магчымасці для развіцця культуры ў Беларусі, звярнуўшы ўвагу на моладзь, магчымасць знаходжання новых талентаў”, — падкрэсліў Павел Латушка.

Кіраўнік дзяржавы, назначаючы яго на новую пасаду, звярнуў увагу таксама на неабходнасць наладжвання больш сістэмнай работы ў сферы культуры ў рэгіёнах, больш увагі надаваць сістэме адукацыі ў галіне культуры.

Латушка Павел Паўлавіч нарадзіўся ў 1973 годзе ў Мінску. У 1995 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. У 1995 — 1996 гадах быў аташэ дагаворна-прававога ўпраўлення Міністэрства замежных спраў Беларусі. У 1996 — 2000 гадах займаў пасады віцэ-консула, консула генеральнага консульства Беларусі ў Беластоку (Польшча). У 2000 — 2002 гадах — начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС Беларусі. У 2002 — 2008 гадах — Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча.

БелТА

“Беларускі народ сапраўды здольны нараджаць таленты!”

29 мая ў сталічным Палацы Рэспублікі Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з маладымі выканаўцамі — удзельнікамі конкурсу “Новыя галасы Беларусі”. І гэтая сустрэча стала чарговым крокам у рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі па падтрымцы маладых талентаў.

У мінулым годзе пад час сустрэчы Кіраўніка дзяржавы з Прэзідэнцкім аркестрам было прынята рашэнне аб правядзенні буйнога рэспубліканскага конкурсу для адбору вакалістаў высокага прафесійнага ўзроўню для работы ў гэтым калектыве. Аляксандр Лукашэнка адзначыў той факт, што ён не проста папрысутнічаў на паўфінальным канцэрце “Новых галасоў Беларусі”, але і сам конкурс трымае на пільным кантролі, хаця, натуральна, гэтым павінны займацца адказныя чыноўнікі, кампазітары, “вялікія артысты, якія сёння лічаць сябе зоркамі”. Прычыны падобнай асабістай увагі Прэзідэнт сфармуляваў наступным чынам: “Мы трацім мільярды рублёў у год, існуюць два прэзідэнцкія фонды па падтрымцы адоранай моладзі, праграма “Дзеці Беларусі”. У нас ёсць таленавітыя дзеці, а чаму мы трацім вялікія грошы і не бачым добрага “прадукту” на вашым узроўні? Гэта мяне вельмі насцярожвае: укладваем вялікія грошы, а аддачы няма”. Адзначаючы, што “дзеці спяваюць, а як толькі даходзіць да дарослых — з паўфіналу ў фінал не выходзім”, Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што для яго было прынцыпова важна ўбачыць, ці ёсць у нас цікавыя маладыя творцы і магчымасці для іх выяўлення. “І я ўпэўніўся, — сказаў ён, — што беларускае грамадства, беларускі народ сапраўды здольныя нараджаць таленты. І сёння яны былі на сцэне”.

Звяртаючыся непасрэдна да ўдзельнікаў конкурснага выступлення, Прэзідэнт падзякаваў ім за тое, што тыя ўскалыхнулі творчае асяроддзе: “Гледзячы на вас, я думаў, што будуць рабіць заўтра нашы зоркі, — сказаў ён. — Я вельмі рады, што вы разварушылі гэтае зарослае цінай дрымотнае царства. Гэта добра, таму што многія нашы так званыя зоркі, ды і палова канкурсантаў, не дацягваюць да патрэбнага ўзроўню”. Але, разам з тым, параіў маладым выканаўцам памятаць, што талент мае патрэбу ў пастаянным развіцці: “Калі вы будзеце працаваць, то з гэтага таленту нешта атрымаецца. Калі вы працаваць не будзеце, то, напэўна, гэта быў ваш першы самы яркі і апошні канцэрт”.

Працягваючы тэму развіцця маладых талентаў, Прэзідэнт звярнуўся да прысутных на сустрэчы чыноўнікаў і рэктараў творчых ВНУ і папярэдзіў іх аб недапушчальнасці сітуацый, калі для таго, каб паступіць у творчую ВНУ, неабходна знайсці ў вас выкладчыка, які будзе рыхтаваць гэтых людзей, яны будуць яму добра плаціць, а потым прыйдуць да гэтага выкладчыка здаваць экзамены ў творчую ВНУ, то гэта не што іншае, як хабар. Скрыты гэта хабар, ці адкрыты, але гэта ёсць у нашым грамадстве, і такая праблема яшчэ раз прагучала за кулісамі гэтага конкурсу”. У сувязі з гэтым ён заявіў, што сёлета правілы прыёму ў творчыя ВНУ будуць пэўным чынам зменены. “Уводзячы цэнтралізаванае тэсціраванне, вы, рэктары творчых ВНУ, мяне пераканалі, што ні ў якім разе ніякага тэсціравання ў вашых ВНУ быць не можа. Я пайшоў у вас на повадзе — вось і атрымаў той вынік, пра які кажу”. Таму сёлета для работы пад час уступных экзаменаў у профільныя ВНУ будуць накіроўвацца стороннія спецыялісты, якія і адбяруць будучых студэнтаў. Тым больш, нагадаў Прэзідэнт, падобная практыка ўжо мела месца 7 — 8 гадоў таму.

У дачыненні да маладых выканаўцаў Кіраўнік дзяржавы сказаў, што не настойвае на тым, каб іх прымалі ў ВНУ без экзаменаў. “Але яны ўжо прайшлі самы жорсткі грамадскі конкурс. Яны ўжо зрабілі першы крок і здалі першы тэст”, — зазначыў ён. Ды, адзначаючы высокі выканальніцкі ўзровень канкурсантаў, Лідэр нашай дзяржавы нагадаў, што, акрамя голасу, неабходна ўмець пець душой, і гэтаму многім з тых, хто выходзіў у гэты дзень на сцэну, варта яшчэ павучыцца. У тым ліку — і ў Прэзідэнцкага аркестра і яго кіраўніка Віктара Бабарыкіна: гэта той узор, калі маладыя таленавітыя музыканты, дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы, літаральна за 7 гадоў вырасліі ў моцны унікальны ансамбль, які годна ўвасабляе нашу маладую краіну — маладую Беларусь.

Адзначаючы, што сучаснае мастацтва не абмяжоўваецца адно толькі эстрадай, Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: “Нам трэба ўзварушыць беларускае грамадства па гэтым прыкладзе, пачынаючы ад эканомікі, палітыкі і заканчваючы мастакамі, выканаўцамі і гэтак далей. Думаю, у бліжэйшы час мы разбяромся, і гэта стане добрай падставай Ураду для прыняцця канкрэтных рашэнняў”.

Таццяна КОМАНАВА

Чарговы этап — у верасні

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася прэс-канферэнцыя паводле вынікаў пасяджэння Экспертнага савета па прэміях Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва за 2009 — 2010 гг.

У сустрэчы прынялі ўдзел першы намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Уладзімір Рылатка, намеснік міністра культуры Расійскай Федэрацыі Андрэй Бусыгін, намеснік Дзяржаўнага сакратара, член Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы Сяргей Шухно, начальнік Дэпартамента па забеспячэнні дзейнасці саветніка Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі па пытаннях развіцця культуры і Савета пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі па культуры і мастацтве Аляксандр Цярэхін, старшыня Саюза мастакоў Расіі, народны мастак СССР Валянцін Сідараў, народны артыст Расіі Барыс Клюеў ды іншыя.

Ва ўступным слове Уладзімір Рылатка распавёў, што Экспертны савет, куды ўваходзяць вядомыя дзеячы літаратуры і мастацтва, прадстаўнікі творчых саюзаў, дзяржустаноў, арганізацый дзвюх краін, разгледзеў прапановы аб намінантах. Першы намеснік міністра культуры нашай краіны азнаёміў таксама з парадкам уручэння прэмій Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва.

На сустрэчу ў залу адукацыйных тэхналогій Нацыянальнай бібліятэкі былі запрошаны намінанты на прэмію Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва за 2009 — 2010 гады. Прысутныя азнаёміліся з серыяй “Палітра майго часу” народнага мастака Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, кавалера ордэна Францыска Скарыны Леаніда Шчамялёва. Другім намінантам стаўся старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, празаік, публіцыст, дзяржаўны дзеяч Мікалай Чаргінец за раманы “Вам — задание!” і “Сыновья”. Намінантамі на прэмію Саюзнай дзяржавы вылучаны стваральнікі помніка Янку Купалу ў Маскве — беларускія скульптары Леў і Сяргей Гумілеўскія і аўтар помніка Аляксандру Пушкіну ў Мінску — народны мастак СССР Юрый Арэхаў. У абедзвюх работах удзельнічаў расійскі архітэктар Юрый Грыгор’еў. На атрыманне прэміі вылучаны таксама народныя мастакі СССР, лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі СССР Сяргей і Аляксей Ткачовы за жывапісныя творы з цыкла “Родная зямля” (1965 — 2004 гг.).

Сёлета ў межах XVIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску” пройдзе дэманстрацыя работ мастакоў і архітэктараў, якія вылучаюцца на атрыманне прэмій Саюзнай дзяржавы, адбудзецца творчая вечарына пісьменніка Мікалая Чаргінца. А ў верасні ў Маскве пройдзе чарговы этап працы Экспертнага савета.

Наталля КІРПІЧЭНКАВА

Славянскае лета

Кажам: “Лета” — маем на ўвазе “Славянскі базар у Віцебску”. Менавіта такая асацыятыўная повязь усё часцей узнікае ў беларускіх дзеячаў культуры і віцебскай публікі. Сёлета гэты Міжнародны фестываль мастацтваў пройдзе 18-ы раз і ахопіць роўна тыдзень — з 10 па 16 ліпеня.

За ўсе гады ў гэтым фестывалі, які стартаваў у 1992-м, удзельнічалі дэлегацыі ўжо 65 краін. Сёлета ў Віцебск завітаюць прадстаўнікі больш як 30-ці дзяржаў. У суквецце разнастайных фестывальных праграм вернецца традыцыя начных канцэртаў. Разнастайных праектаў, прэзентацый будзе шмат. Але ў цэнтры падзей, як заўсёды, апынуцца не толькі гала-канцэрты адкрыцця, закрыцця, Беларусі, Расіі, Украіны і Саюзнай дзяржавы, але і два міжнародныя конкурсы — “дарослы” і дзіцячы. Наша краіна будзе прадстаўлена на фестывалі не толькі гала-канцэртам у Дзень Беларусі, але і сольнымі праектамі Дзяржаўнага харэаграфічнага ансамбля “Харошкі”, Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста краіны, прафесара Міхаіла Фінберга, нарэшце, праектам “Новыя галасы Беларусі”.

Асабліва хваляваццa мы будзем за нашых канкурсантаў. Саліст Гомельскай абласной філармоніі Андрэй Коласаў праходзіць “конкурсную падрыхтоўку” ў студыі “Песняроў” на чале з Вячаславам Шарапавым. Дарэчы, сёлета ўпершыню выступленні канкурсантаў пад фанаграму “мінус адзін” будуць аздоблены харэаграфічнымі нумарамі і разнастайнымі шоу. У дзіцячым конкурсе мы зможам убачыць Машу Новік, якая займаецца ў Святланы Стацэнка ў Нацыянальным цэнтры музычнага мастацтва імя Уладзіміра Мулявіна, а таксама Лаліту Гайдукевіч — вучаніцу СШ № 64 г. Мінска. “Дарослае” журы ўзначаліць Мікалай Баскаў, а “дзіцячае” — наш знакаміты кампазітар, народны артыст Беларусі Леанід Захлеўны.

“...Наш агульны дом” у гонар Перамогі

27 чэрвеня ў Белдзяржфілармоніі ўрачыста адкрыецца VIII Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур “Мы разам кавалі Перамогу”.

Як распавяла “К” дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Ірына Лемцюгова, у святочных мерапрыемствах возьмуць удзел лепшыя калектывы і салісты звыш 10 нацыянальных суполак, якія пражываюць у Беларусі. Перад пачаткам фестывалю запланавана прэс-канферэнцыя, а пасля ў Белдзяржфілармоніі распачнецца ўрачысты канцэрт.

Сёлета арганізатарамі фестывалю падрыхтавана для наведвальнікаў і гасцей незвычайная акцыя: на пляцы перад філармоніяй разгорнецца тэатралізаваная дзея пад назвай “Беларусь — наш агульны дом”. Пад адкрытым небам запланавана выстаўка нацыянальных рамёстваў і выстаўка-дэгустацыя, дзе можна будзе пакаштаваць нацыянальныя стравы краін — удзельніц фестывалю. Таксама каля філармоніі будуць праходзіць выступленні нацыянальных творчых калектываў, праводзіцца шматлікія конкурсы і гульні, адбудуцца паказальныя выступленні тэатра роставых фігур.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Інфармацыя
аб адкрытым маладзёжным конкурсе на стварэнне літаратурнага сцэнарыя мастацкага фільма, прысвечанага нацыянальнай тэматыцы

У адпаведнасці з даручэннем Кіраўніка дзяржавы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь сумесна з грамадскімі аб’яднаннямі “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі”, “Беларускі саюз кінематаграфістаў”, “Саюз пісьменнікаў Беларусі”, а таксама вытворча-творчым рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам “Беларускі відэацэнтр” штогод праводзіць адкрыты маладзёжны конкурс на стварэнне літаратурнага сцэнарыя мастацкага фільма, прысвечанага нацыянальнай тэматыцы (далей — Конкурс).

Конкурс праводзіцца з мэтай выяўлення і стымулявання эстэтычных пошукаў маладых аўтараў, увасаблення і прасоўвання іх сцэнарных работ на экраны рэспублікі.

Да ўдзелу ў Конкурсе дапускаюцца паўналетнія грамадзяне, узрост якіх на момант прадстаўлення заявы на ўдзел у Конкурсе не перавышае трыццаці аднаго года.

Для ўдзелу ў Конкурсе аўтары павінны накіраваць на адрас Дэпартамента па кінематаграфіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (пр-т Пераможцаў, 11, 220004, г. Мінск) з пазнакай “На конкурс”:

заяву па форме згодна з дадаткам;

літаратурны сцэнарый мастацкага фільма, прысвечанага нацыянальнай тэматыцы, у двух экземплярах;

копіі старонак дакумента, што сведчыць асобу заяўніка, якія ўтрымліваюць звесткі аб прозвішчы, імені, імені па бацьку, даце і месцы нараджэння, месцы жыхарства заяўніка (пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, нацыянальны пашпарт грамадзяніна замежнай дзяржавы, від на жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь, іншы дакумент, што ўтрымлівае звесткі, якія сцвярджаюць асобу заяўніка).

Літаратурны сцэнарый павінен быць прадстаўлены на папяровым носьбіце ў фармаце А4 (на адным баку ліста, шрыфт Times New Roman (Times New Roman Cyr), звычайны, памер — не менш за 14 пунктаў, міжрадковы інтэрвал — двайны).

Літаратурныя сцэнарыі не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.

Падвядзенне вынікаў Конкурсу праходзіць у перыяд з 1 кастрычніка па 30 лістапада 2009 г.

Пераможцам Конкурсу ўручаюцца адпаведныя дыпломы і грашовыя прэміі ў памеры:

адна першая — 40 базавых велічынь;

адна другая — 30 базавых велічынь;

адна трэцяя — 20 базавых велічынь.

Памер грашовай прэміі вызначаецца, зыходзячы з памеру базавай велічыні, устаноўленай у Рэспубліцы Беларусь на дзень выплаты прэміі.

Па выніках Конкурсу журы, пры неабходнасці, можа перагледзець колькасць і памер прэмій.

Аргкамітэт мае права засноўваць дадатковыя заахвочвальныя прызы і дыпломы, іншыя формы заахвочвання ўдзельнікаў Конкурсу.

Абвяшчэнне вынікаў Конкурсу і ўзнагароджванне пераможцаў ажыццяўляецца 17 снежня 2009 г. у межах правядзення мерапрыемстваў, прысвечаных святкаванню Дня беларускага кіно.

Сцэнарысты-прызёры будуць рэкамендаваны для экранізацыі на Нацыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм”.

Больш падрабязная інфармацыя змешчана на афіцыйным сайце Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь: http://kultura.by/
Тэлефон для даведак у Дэпартаменце па кінематаграфіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь: (017) 209-43-86.

Лучнасць часу і творчасці

Калі гэты нумар рыхтаваўся да друку, стала вядома, што Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ, паводле якога былі зацверджаны афіцыйныя гербы і сцягі Віцебшчыны. Свае геральдычныя сімвалы атрымалі сама Віцебская вобласць, а таксама Лепель, Дзісна, Міёры, Новалукомль, Паставы, Чашнікі, Сянно і Сенненскі раён, гарадскія пасёлкі Багушэўск, Расоны, вёска Пераброддзе. Узгадалася, што амаль усе гэтыя і многія іншыя населеныя пункты былі пазначаны на карце вобласці, з відэапаказу якой пачынаўся гала-канцэрт творчай справаздачы “Віцебшчына — калыска маёй Беларусі”, прысвечанай 65-годдзю вызвалення нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Гарады былі пазначаны не толькі назвамі, але і сваімі “візітоўкамі” — самымі адметнымі архітэктурнымі помнікамі. Такая ж “гістарычна-архітэктурная” карта трапіла і на вокладку праграмкі канцэрта, што ўяўляла з сябе ледзь не буклет: “уступнае слова” і “пасляслоўе”, змястоўна ўзнёслыя паэтычныя эпіграфы, цікавы дызайн, дзе кожная старонка, у адпаведнасці з канцэртным блокам, мае сваё адметнае аблічча, і, вядома, дакладнае пералічэнне не толькі нумароў і іх выканаўцаў, але і тых, хто застаўся “за кадрам”, — усёй пастановачнай групы, уключаючы тэхнічныя службы. Скажаце, “індывідуальны падыход”? Але такая “індывідуалізацыя”, імкненне паказаць не толькі масавасць, але і твар кожнага, з каго ўтвараюцца тыя “народныя масы”, — усё гэта было ўласціва і самому гала-канцэрту, і выстаўцы народных майстроў, і прывітальнаму слову, якое агучыў першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Навадскі:

— Віцебшчына — край багатай гісторыі, унікальнай прыроды і працавітых людзей. Яна апета ў паэтычным слове і на мастацкіх палотнах. Наша старажытная зямля падарыла чалавецтву цудоўных людзей. Без іх творчасці і духоўнай спадчыны нельга ўявіць сабе развіццё нацыі. Гэта гуманісты і асветнікі Еўфрасіння Полацкая, Францыск Скарына, Сімяон Полацкі, Васіль Цяпінскі, бацька беларускага тэатра Ігнацій Буйніцкі, блізкія нам па часе Уладзімір Караткевіч, Міхаіл Савіцкі, Васіль Быкаў, Павел Сухой, Жарэс Алфёраў, Пётр Машэраў і многія іншыя асобы першай велічыні. Тысячы сапраўдных майстроў узмацняюць сёння эканоміку, робяць багацей і прыгажэй родны край.

Прыгажосць і багацце Віцебскага краю адлюстроўвала ўжо выстаўка. Кожны Дом рамёстваў і народны клуб меў не толькі спецыяльна падрыхтаваныя экспазіцыі, але і багата аздобленыя друкаваныя матэрыялы з аповедам пра тыя рамёствы, якія развіваюцца ў іх асабліва плённа, фотавыявы лепшых работ, звесткі пра самі ўстановы, калектывы, майстроў, пра ўдзел у святах і фестывалях і шмат чаго іншага. Дый кожная з устаноў мела свайго “экскурсавода”, таму нават аповед пра кожны рэгіён Віцебшчыны меў свае асаблівасці.

На лесвіцы, што вядзе ў залу, публіку сустракалі дзяўчаты ў адметных сукенках-эмблемах, на якіх былі паэтычна адлюстраваны асноўныя сімвалы Віцебска: Ратуша, забудовы Старога Горада, эмблема “Славянскага базару ў Віцебску”, помнік воінам-вызваліцелям.

Кожны куточак-закуточак выстаўкі меў сваё адметнае музычнае суправаджэнне: у фае віравала сапраўдная “поліфанія пластоў”, асабліва яркая на “памежжы”. Хтосьці сустракаў прыпеўкамі, хтосьці — інструментальнай музыкай, можна было нават паслухаць і паглядзець казку “Калабок” у... батлеечным варыянце. Дарэчы, Віцебшчына прадставіла дзве розныя батлейкі: больш аўтэнтычную (тэатр лялек “Капялюш” Цэнтра рамёстваў і традыцыйнай культуры Наваполацка) і больш звыкла лялечную, шумілінскую. Увогуле, разнастайных лялек (і маленькіх, і вялікіх) было шмат. Яны “ажывалі” не толькі ў спектаклях, але і калі моўчкі стаялі на подыуме, дэманструючы нацыянальныя строі, ці калі заміралі ў кампазіцыі “Сялянскі двор”, які быццам “выхапіў” тэатралізаваную сцэнку з сялянскага жыцця.

У цэнтры выстаўкі апынуўся святочны карагод адноўленых старадаўніх строяў — розных часоў, рэгіёнаў і сацыяльных груп. Там былі строі жаночыя, мужчынскія, сялянскія, мяшчанскія. І кожны — не толькі са сваімі асаблівасцямі і адметным арнаментам, але і з дакладным тлумачэннем свайго прызначэння.

Гэта канцэпцыя “лялькі і людзі” сталася, на маю думку, асноўнай ва ўсёй справаздачы. Бо Віцебшчына быццам імкнулася ажывіць гісторыю, напоўніць яе асобамі і падкрэсліць гэты індывідуальны пачатак абсалютна ва ўсіх прадстаўленых работах.

Наведвальнікі маглі параўнаць і дзве розныя драўляныя выявы старадаўніх цэркваў, і два розныя “гастранамічныя” куткі. На нашых вачах майстры выраблялі паясы, плялі вырабы з лазы, займаліся ткацтвам.

Увагу прыцягвала вельмі тонкае тканае палатно з асаблівым малюнкам, якое вырабляла кіраўнік гуртка па ткацтве Гарадоцкага дома рамёстваў і фальклору Марына Гушчо.

— Нашы бабулькі, — распавяла Марына Леанідаўна, — такую тонкую, ажурную тканіну з ільну называюць кісяёй. Гэткія “празрыстыя” ручнікі нават выкарыстоўвалі замест фіранак. Мне нават часам шкада было, што маладыя не надзявалі іх як вэлюм. Але сапраўды: праца над такімі вырабамі патрабуе вялікай цярплівасці, нейкага асаблівага, вельмі светлага светаўяўлення. А ў нас на Гарадоччыне такіх рэчаў шмат.

Гала-канцэрт меў некалькі кульмінацый, сярод чаго цяжка было вызначыць “самую-самую”. Ужо на пачатку прадстаўлення ўразіла кампазіцыя “Колазварот часу”, аздобленая цудоўнымі дэкарацыямі. Перад намі быццам круцілася кола гэткага гістарычнага млына, якое часам спынялася, і на першы план, зноў-такі, выходзілі асобы. Гарманічным пераходам ад класічна-акадэмічнага блока канцэрта да ваеннага стала аздобленая тэатралізацыяй песня “Праважала сына маці” з цыкла Уладзіміра Мулявіна “Праз усю вайну”, выкананая народным вакальным квартэтам “Натхненне”. Песні ваенных гадоў спалучалі сучасныя аранжыроўкі і ілюзію абсалютнай рэальнасці дзеяння: сцэнаграфія ўяўляла з сябе “жывы” лес, на сцэну выязджаў сапраўдны грузавік тых часоў, у кузаве якога сядзелі артысты “франтавой канцэртнай брыгады”. Ды ўсё ж канчатковае яднанне сцэны і залы адбылося ў момант шанавання ветэранаў, якія сядзелі сярод публікі.

Народны блок быў з'яднаны тэмай кірмашу, дзе кожны з калектываў мог прапанаваць свае “творчыя вырабы”. Вабілі прафесіяналізм ансамбля песні, музыкі і танца “Талака” Віцебскай абласной філармоніі, шляхетная адметнасць наваполацкага ансамбля “Камарыкі”, элементы танцавальнай аўтэнтыкі ў фальклорна-этнаграфічнага ансамбля “Сунічкі” з вёскі Стайкі, дый увогуле выбітная харэаграфія практычна ўсіх нумароў: “танчылі” нават самі кірмашовыя прылаўкі, якія час ад часу раз'язджалі па сцэне, вадзілі карагоды ды круціліся, бы кірмашовыя каруселі.

Старадаўняя ладдзя, што праплыла па сцэне, запрасіла ўсіх у старажытны і сучасны Віцебск. У гэтым дзівосным падарожжы было некалькі прыпынкаў: ля храма, будаванне якога ўвасобіла сучасная харэаграфія Дзіяны Юрчанка; у памятных мясцінах Марка Шагала, чые жывапісныя вобразы паэтычна ўвасаблялі артысты трох цыркавых студый; на экспазіцыі сучаснага жывапісу, што пачынаўся з дзейнасці УНОВИС (“Утвердителей нового искусства”, 1919 г.). Прайшла “экскурсія” і па “Славянскім базары ў Віцебску”. А над усім гала-канцэртам лунаў дух добрага харэаграфічнага густу і, шырэй, сучаснай філасофска-заглыбленай эстэтыкі фестывалю сучаснай харэаграфіі ў Віцебску (IFMC) — яшчэ і таму, што аўтарам ідэі, сцэнарыя і рэжысёрам відовішча выступіла галоўны арганізатар гэтага форуму Марына Раманоўская.

Творчая справаздача Віцебшчыны стала папраўдзе магутным акордам гэтага творчага праекта да 65-годдзя вызвалення Беларусі, які ахапіў усе вобласці Беларусі і яе сталіцу.

Надзея БУНЦЭВІЧ

На здымках: першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Навадскі; велічны фінал гала-канцэрта; у фае Палаца Рэспублікі гледачоў чакала нямала цікавага.

Фота Юрыя ІВАНОВА

Спеўным шляхам у Маладзечна

13 чэрвеня ў Маладзечне адбудзецца Х Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі. Юбілейнае свята абяцае быць надзвычай насычаным: у адным дні змесцяцца адразу некалькі буйных мерапрыемстваў. І хаця да фестывалю яшчэ цэлы тыдзень, ужо сёння можна меркаваць: свята атрымаецца рознакаляровым і шматгранным.

— Фестываль, — запэўніў на прэс-канферэнцыі, што адбылася ў Мінскім аблвыканкаме, першы намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Уладзімір Рылатка, — ахопіць практычна ўсю беларускую эстраду і прадэманструе моц беларускай песеннай творчасці. У гэтым кірунку ён будзе развівацца і надалей, ператвараючыся ў агляд народна-эстраднай музыкі ўсёй рэспублікі, уключаючы самадзейнасць, і ахопліваючы не толькі дзеячаў культуры з усіх рэгіёнаў нашай краіны, але і беларускія дыяспары за мяжой.

У цэнтры фестывалю, паводле даўняй традыцыі, апынецца Рэспубліканскі конкурс маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні. У складзе прадстаўнічага журы — вядомыя дзеячы культуры нашай краіны. А ўзначаліць “судзейскую калегію” народны артыст Беларусі, кампазітар Эдуард Зарыцкі.

На маладзечанскі конкурс адабраны 21 малады выканаўца — па тры ад кожнай вобласці і асобная тройка спевакоў ад сталіцы. Адразу пасля ранішняй рэпетыцыі ўдзельнікі прадэманструюць па дзве песні: адну — у суправаджэнні Нацыянальнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста краіны, прафесара Міхаіла Фінберга, а другую — пад фанаграму “мінус адзін”. Конкурсныя выступленні пройдуць у Маладзечанскім гарадскім палацы культуры.

Але ж і на адкрытых пляцоўках будзе горача — незалежна ад надвор'я. Разгорне сваю працу Горад майстроў, пройдзе выстаўка-продаж, дзе свае вырабы прадставяць 109 лепшых майстроў рэспублікі. Амаль з поўдня і да вечара ў Парку культуры і адпачынку імя Перамогі і на іншых гарадскіх пляцоўках будуць ладзіцца разнастайныя канцэртныя выступленні, сустрэчы беларускіх паэтаў і кампазітараў з жыхарамі ды гасцямі горада і раёна. Можна будзе пачуць і ўбачыць лепшыя аматарскія калектывы, юных артыстаў дзвюх эстрадных студый Маладзечанскага палаца культуры — “Жывы гук” і “Спяваем разам”, а таксама дзіцячыя калектывы ўстаноў адукацыі. У пешаходнай зоне пройдзе раённы фестываль-конкурс сельскіх ансамбляў “Паклон табе, мой беларускі край!”. Адбудзецца і конкурс чытальнікаў.

Увогуле, паэтычнае беларускае слова, вершы нашых класікаў і сучасных паэтаў будуць гучаць абсалютна на ўсіх пляцоўках. Але спачатку паэты наведаюць Вязынку, радзіму Янкі Купалы.

Завершаць свята два канцэрты, што, паводле традыцыі, пройдуць на Цэнтральнай плошчы Маладзечна. А 17-й гадзіне адбудзецца канцэрт народнай музыкі, а следам за ім — эстрадны гала-канцэрт “Твой зорны шлях, мая Айчына”. Мастацкім кіраўніком гэтага фінальнага дзейства выступае народны артыст Беларусі, кампазітар Леанід Захлеўны, а рэжысёрам — Ніна Осіпава. Асаблівасцю канцэрта стане тое, што ён прадставіць вельмі шырокую панараму беларускага эстраднага мастацтва.

— Навінкай фінальнага гала-канцэрта фестывалю, — распавяла рэжысёр Ніна Осіпава, — стане тое, што на ім будуць прадстаўлены ўсе вобласці нашай краіны. Для гэтага мы звярнуліся ў абласныя ўпраўленні культуры, і ўсе яны дэлегавалі сваіх салістаў і калектывы. Акрамя таго, да многіх песень рыхтуюцца харэаграфічныя нумары.

Як запэўніў першы намеснік старшыні Маладзечанскага райвыканкама Яфім Ідзельчык, горад цалкам гатовы да прыёму гасцей. Упершыню на гэтым фестывалі частка білетаў будзе дадзена ў продаж. Але іх кошт (ад 3 да 5 тысяч рублёў) дазволіць наведаць конкурсныя выступленні і заключны гала-канцэрт усім ахвотным.

Аляксей СВЕЦІЧ

Бронзавы “Кадэт” на “Залатым Віцязі”

Задуманы народным артыстам Расіі Мікалаем Бурляевым амаль два дзесяцігоддзі таму, міжнародны кінафорум “Залаты Віцязь” кожны год змяняе сваю “дыслакацыю”. Мінчане памятаюць “Залаты Віцязь-1996”, які праходзіў у беларускай сталіцы. То былі першыя крокі фестывалю, і падтрымка з боку нашай дзяржавы і яе кіраўніцтва вельмі дапамагла ператварыць яго ў паўнавартасную старонку на календары фестывальнага руху.

“Залаты Віцязь-2009” запомніўся не толькі паказамі, імпрэзамі, сустрэчамі, але, найперш, мноствам дыскусій. Як распавёў “К” мастацкі кіраўнік студыі “Летапіс” Нацыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм” і адзін з членаў беларускай дэлегацыі Міхаіл Жданоўскі, пад час ліпецкага форуму спецыялісты абмяркоўвалі сучаснае становішча кінамастацтва. Дарэчы, беларусы прынялі ў пасяджэннях самы актыўны ўдзел.



Рэжысёр Віталь Дудзін.

Не засталася наша дэлегацыя і без узнагарод. Так, у самым прэстыжным конкурсе поўнаметражнага ігравога мастацкага фільма пачэснае трэцяе месца і статуэтку “Бронзавага Віцязя” атрымала стужка “Кадэт” рэжысёра Віталя Дудзіна.

Спецыяльны прыз Ліпецкай епархіі “За лепшы праваслаўны фільм” на “Залатым Віцязі-2009” атрымала анімацыйная стужка Ірыны Кадзюковай “Старажытная аповесць пра жыццё і каханне”. У конкурсе дэбютных і студэнцкіх фільмаў дыплом прысуджаны маладому рэжысёру-дакументалісту Кацярыне Махавай і яе фільму “Коліш”. У конкурсе дзіцячага кіно спецыяльны дыплом атрымала карціна “Навагоднія прыгоды ў ліпені” Алены Туравай і Івана Паўлава. Не засталося без высокай ацэнкі і старэйшае пакаленне беларускіх дакументалістаў. За кароткаметражную стужку “Пётр Конюх” узнагароджаны рэжысёр Анатоль Алай: яму ўручылі спецыяльны дыплом імя Аляксандра Сідзельнікава з фармулёўкай “За вяртанне забытага імя і ўзбагачэнне культурнай спадчыны народаў Беларусі і Расіі”.

С.А.

Калектыў Рэдакцыйна-выдавецкай установы “Культура і мастацтва” выказвае свае шчырыя спачуванні міністру інфармацыі Рэспублікі Беларусь Русакевічу Уладзіміру Васільевічу з прычыны напаткаўшага яго вялікага гора — смерці маці.

Згодна з даручэннем Кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь працягвае працу па стварэнні Зводнага плана ўстаноўкі манументальных збудаванняў. Мэта гэтых захадаў — сістэматызаваць дзейнасць па ўвекавечванні ў бронзе і камені асоб і падзей нашай мінуўшчыны. Работа гэтая плённа вядзецца сёння ў шматлікіх кутках краіны. Важнасць фарміравання Зводнага плана ў тым, каб зрабіць яго тэмай шырокага грамадскага абмеркавання.

ЗВОДНЫ ПЛАН (праект)

устаноўкі манументальных збудаванняў у Рэспубліцы Беларусь у 2009 — 2012 гг.

МІНСК

I. Мемарыяльныя збудаванні гістарычным дзеячам і выбітным асобам у гісторыі Беларусі

1. Помнік **Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу**, класіку беларускай літаратуры.

2. Помнік-бюст **Дзюнану Анры**, заснавальніку Чырвонага Крыжа.

II. Мемарыяльныя збудаванні да значных гістарычных падзей, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі

1. Мемарыял на тэрыторыі былых могілак **ахвяр Першай сусветнай вайны.**

2. Помнік **камсамольцам-добраахвотнікам** у парку Перамогі.

МІНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

I. Мемарыяльныя збудаванні гістарычным дзеячам і выбітным асобам у гісторыі Беларусі

1. Вілейка. Помнік **Азі Асланаву**, двойчы Герою Савецкага Саюза, генерал-маёру (рэалізацыя праекта — 2009 г.; крыніца фінансавання — Культурна-асветніцкае грамадскае аб'яднанне "Габустан").

2. Валожын. Помнік-бюст збіральніку фальклору, паэту і публіцысту **Старому Уласу** (У.П. Сівому-Сівіцкаму) да 145-годдзя з дня нараджэння (рэалізацыя праекта — 2010 г.; крыніца фінансавання — раённы бюджэт).

3. Нясвіж. Скульптура **Францішкі Уршулі Радзівіл** (рэалізацыя праекта — 2011 г.; крыніца фінансавання — раённы бюджэт).

II. Мемарыяльныя збудаванні да значных гістарычных падзей, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі

1. В. Сняжкова, Вілейскі раён. Мемарыяльны комплекс, прысвечаны **зніклым вёскам Вілейскага раёна** (рэалізацыя праекта — 2009 г.; крыніца фінансавання — раённы бюджэт).

2. Нясвіж. Памятны знак **старой таполі** (рэалізацыя праекта — 2009 г.; крыніца фінансавання — раённы бюджэт).

БРЭСЦКАЯ ВОБЛАСЦЬ

I. Мемарыяльныя збудаванні гістарычным дзеячам і выбітным асобам у гісторыі Беларусі

1. Г.п. Шэрашава, Пружанскі раён. Мемарыяльны знак у гонар **Міхаіла Бабароўскага**, філосафа і рэлігійнага дзеяча XIX ст.

2. Кобрын. Помнік уладзіміра-валынскаму князю **Уладзіміру Васількавічу і княгіні Вользе**.

3. В. Доўгае, Пружанскі раён. Мемарыяльны знак да 200-годдзя з дня нараджэння **Ю.І. Крашэўскага**, знакамітага пісьменніка XIX ст.

4. Івацэвічы. Памятны знак у гонар Героя Савецкага Саюза **Мікалая Мультана.**

5. В. Скокі, Брэсцкі раён. Мемарыяльны знак да 250-годдзя з дня нараджэння пісьменніка XVIII — XIX стст. **Юльяна Нямцэвіча.**

6. Г.п. Ружаны, Пружанскі раён. Мемарыяльны знак у гонар канцлера ВКЛ **Льва Сапегі.**

7. Івацэвічы. Мемарыяльны знак у гонар кіраўніка партызанскага руху на Брэстчыне **Аляксея Чарткова.**

8. В. Ясянец, Баранавіцкі раён. Мемарыяльны знак у гонар апошняга канцлера ВКЛ **Іахіма Храптовіча.**

II. Мемарыяльныя збудаванні да значных гістарычных падзей, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі

1. Брэст. Помнік **да 1000-годдзя заснавання Брэста.**

2. Брэст. Мемарыяльны знак **да 70-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР.**

3. Паміж вёскамі Чарнаўчыцы і Турна, Брэсцкі раён. Мемарыяльны знак у памяць **аб ахвярах фашызму ў гады Вялікай Айчыннай вайны.**

4. П. Жамчужны, Баранавіцкі раён. Помнік **да 65-й гадавіны вызвалення Беларусі.**

5. Івацэвічы. Скульптурная кампазіцыя **"Паравоз" да 490-годдзя горада.**

6. Камянец. Помнік **вязням Камянецкага гета.**



7. Кобрын. Скульптурная кампазіцыя **заснавальнікам горада.**

8. Лунінец. Скульптурная кампазіцыя ў памяць **аб ахвярах фашызму.**

ВІЦЕБСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

I. Мемарыяльныя збудаванні гістарычным дзеячам і выбітным асобам у гісторыі Беларусі

1. Віцебск. Помнік **княгіні Вользе**, заснавальніцы Віцебска (рэалізацыя праекта — 2010 г.).

2. Полацк. Помнік **княгіні Рагнедзе** (рэалізацыя праекта — 2010 г.).



3. Полацк. Помнік пісьменніку XIX ст. **Яну Баршчэўскаму** (рэалізацыя праекта — 2010 г.).

4. Полацк. Помнік дойліду, будаўніку Спаса-Праабражэнскай царквы XII ст. **Іаану** (рэалізацыя праекта — 2010 г.).

5. Полацк. Помнік-бюст першаму беларускаму кінарэжысёру **Юрыю Тарычу** (рэалізацыя праекта — 2009 г.).

6. Орша. Памятны знак аўтару першага беларускага буквара, заснавальніка друкарні ў Куцейнінскім манастыры **Спірыдону Собалю.**

II. Мемарыяльныя збудаванні да значных гістарычных падзей, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі

1. Віцебск. Памятны знак **да 600-годдзя ўдзелу віцебскага палка ў Грунвальдскай бітве** (рэалізацыя праекта — 2010 г.).

2. Полацк. Помнік (аднаўленне) **Айчыннай вайне 1812 г.**

ГОМЕЛЬСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

I. Мемарыяльныя збудаванні гістарычным дзеячам і выбітным асобам у гісторыі Беларусі

1. Г.п. Ветка. Помнік-бюст савецкаму палітычнаму дзеячу, дыпламату **Андрэю Грамыку.**

2. Г.п. Ветка. Помнік-бюст паэту Дзмітрыю Кавалёву.

3. Г.п. Ветка. Помнік-бюст заснавальніку Веткаўскага музея народнай творчасці **Фёдару Шкляраву** (рэалізацыя праекта — 2010 г.).

4. Светлагорск. Памятны знак у гонар беларускага навукоўца-мовазнаўца **Сцяпана Некрашэвіча** (рэалізацыя праекта — 2010 г.).

5. Гомель. Помнік-бюст **княгіні Ірыне Паскевіч**, уладальніцы гомельскага маёнтка (XIX — XX стст.).

6. Гомель. Помнік-бюст князю, генерал-фельдмаршалу **Івану Паскевічу**, уладальніку гомельскага маёнтка (XVIII — XIX стст.).

7. Гомель. Помнік-бюст князю **Фёдару Паскевічу,** уладальніку гомельскага маёнтка (XIX — XX стст.).

8. Гомель. Помнік-бюст архітэктару **Станіславу Шабунеўскаму** (рэалізацыя праекта — 2010 г.).

9. Гомель. Помнік-бюст графу, генерал-фельдмаршалу **Пятру Румянцаву-Задунайскаму.**

10. Хойнікі. Памятны знак палітычнаму дзеячу XVIII — XIX стст. **Каралю Прозару** (рэалізацыя праекта — 2010 г.).

11. Чачэрск. Помнік-бюст графу, дзяржаўнаму дзеячу, які ўнёс значны ўклад у фарміраванне гістарычнага аблічча Чачэрска XVIII ст., **Захарыю Чарнышову** (рэалізацыя праекта — 2009 г.).

II. Мемарыяльныя збудаванні да значных гістарычных падзей, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі

1. Г.п. Лоеў. Памятны знак **"Лоеўская бітва"**, прысвечаны казацка-сялянскаму паўстанню сярэдзіны XVII ст. (рэалізацыя праекта — 2009 г.).

2. Г.п. Загалле, Хойніцкі раён. Памятны знак **"Загальская бітва"**, прысвечаны казацка-сялянскаму паўстанню сярэдзіны XVII ст. (рэалізацыя праекта — 2010 г.).

3. Добруш. Помнікі "Алея герояў", прысвечаны **воінам Вялікай Айчыннай вайны** (рэалізацыя праекта — 2009 г.).

4. Добруш. Помнік загінулым землякам — **воінам-інтэрнацыяналістам** у час ваенных дзеянняў у Афганістане (рэалізацыя праекта — 2009 г.).

5. Г.п. Карма. Памятны знак **мірным жыхарам, расстраляным у 1941 годзе** (рэалізацыя праекта — 2010 г.).

6. Г.п. Лоеў. Памятны знак, прысвечаны **фарсіраванню Дняпра ў 1943 г.** (рэалізацыя праекта — 2009 г.).

7. Светлагорск. Памятны знак **савецкім маракам, загінулым у 1941 г.** (рэалізацыя праекта — 2009 г.).

8. Г.п. Брагін. Помнік загінулым землякам — **воінам-інтэрнацыяналістам** у час ваенных дзеянняў у Афганістане (рэалізацыя праекта — 2009 г.).

9. Калінкавічы. Памятны знак **вёскам, адселеным пасля аварыі на ЧАЭС** (рэалізацыя праекта — 2009 г.).

10. Г.п. Карма. Памятны знак **да 500-годдзя заснавання гарадскога пасёлка** (рэалізацыя праекта — 2009 г.).

11. Калінкавічы. Памятны знак **да 450-годдзя заснавання горада** (рэалізацыя праекта — 2010 г.).

ГРОДЗЕНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

I. Мемарыяльныя збудаванні гістарычным дзеячам і выбітным асобам у гісторыі Беларусі

1. Смаргонь. Помнік беларускаму пісьменніку XIX ст. **Францішку Багушэвічу** (рэалізацыя праекта — 2010 г.).

2. Навагрудак. Помнік **каралю Міндоўгу** — заснавальніку Вялікага княства Літоўскага (рэалізацыя праекта — 2010 г.).

3. Гродна. Помнік дзяржаўнаму дзеячу **Антонію Тызенгаузу** (рэалізацыя праекта — 2010 г.).

4. В. Дабраволя, Свіслацкі раён. Памятны знак у гонар героя-падпольшчыка гадоў Вялікай Айчыннай вайны **Міхаіла Урбановіча**.

II. Мемарыяльныя збудаванні да значных гістарычных падзей, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі

1. Г.п. Іўе. Мемарыяльны знак у гонар **землякоў, што не вярнуліся з франтоў Вялікай Айчыннай вайны** (рэалізацыя праекта — 2010 г.).

2. Свіслач. Мемарыяльны знак **воінам-афганцам** (рэалізацыя праекта — 2010 г.).

3. Ліда. Мемарыяльны знак **да 2010-годдзя Нараджэння Хрыстовага** (рэалізацыя праекта — 2010 г.).

МАГІЛЁЎСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

I. Мемарыяльныя збудаванні гістарычным дзеячам і выбітным асобам у гісторыі Беларусі

1. П. Леніна, Горацкі раён. Помнік генералу, камандзіру 1-й пяхотнай дывізіі Войска Польскага **Зыгмунту Берлінгу.**

2. Г.п. Глуск. Помнік-бюст пісьменніку **Сяргею Грахоўскаму**.

3. Магілёў. Помнік-бюст беларускаму палітычнаму дзеячу, паэту **Дзмітрыю Жылуновічу (Цішку Гартнаму)**.

4. Асіповічы. Помнік **Фёдару Крыловічу,** аднаму з арганізатараў падпольнага руху ў раёне ў час Вялікай Айчыннай вайны.

5. Г.п. Бялынічы. Помнік-бюст Герою Савецкага Саюза **Іосіфу Свідзінскаму.**

6. Касцюковічы. Помнік беларускаму пісьменніку **Аркадзю Куляшову** (рэалізацыя праекта — 2012 г.).

7. Мсціслаў. Помнік князю **Расціславу Мсціслававічу,** заснавальніку горада (рэалізацыя праекта — 2016 г.).

II. Мемарыяльныя збудаванні да значных гістарычных падзей, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі

1. Магілёў. Помнік **"Дзецям вайны".**

2. Слаўгарад. Памятны знак на месцы жорсткіх баёў **137-й стралковай дывізіі,** сфарміраванай у Горкаўскай вобласці.

(Заканчэнне на стар. 19.)

Чым абумоўлены такі фундаментальны падыход да манументальнага мастацтва, як гэта вынікае з прапанаваных зводных планаў? З гэтага пытання пачалася гутарка карэспандэнта "К" з першым намеснікам міністра культуры Рэспублікі Беларусь Уладзімірам РЫЛАТКАМ.

Манументальны пасыл у будучыню, або "Помнік з надпісам "ТУТ НАРАДЗІЎСЯ..." можа стаяць толькі ў адным месцы на свеце"

— Апошняе дзесяцігоддзе стала папраўдзе пераломным у манументальным мастацтве Беларусі. Паглядзіце, колькі новых адметных помнікаў паўстала за гэты час — не толькі ў Мінску, але і ў многіх іншых гарадах нашай краіны! І гэтая паўсюдная тэндэнцыя сведчыць пра адраджэнне гістарычнай памяці народа. Ці мог хто нават марыць у былыя часы, што краявіды Полацка будуць упрыгожваць постаці яго князёў? А цяпер жыхары нашай краіны здолелі ўбачыць сваю мінуўшчыну на ўласных вуліцах.

Кіраўнік дзяржавы ўсведамляе неацэнную важнасць гэтай ініцыятывы не толькі ў эстэтычным, але і ў выхаваўчым, патрыятычным аспекце. Натуральна, што гэтая дзейнасць патрабуе сістэмнага падыходу. І таму сёння перад намі пастаўлена задача яе ўпарадкаваць.

На дадзены момант зроблены толькі першыя крокі па стварэнні гэтага плана. Мы атрымалі прапановы ад кожнай з абласцей Беларусі — якія помнікі ім хацелася б бачыць на сваёй зямлі, — а потым накіравалі гэты спіс для абмеркавання ў Нацыянальную акадэмію навук Беларусі і творчыя ВНУ. Літаральна днямі атрымалі першы водгук — ад НАН Беларусі. Лічу, ён варты самай пільнай увагі.

Пасля грамадскага абмеркавання, да якога мы заахвочваем і чытачоў "К", задумы будуць узгоднены з кіраўнікамі абласцей і набудуць адпаведны прававы статус, ператварыўшыся ў перспектыўны план манументальных збудаванняў.

— І тады да іх матэрыялізацыі застанецца адзін крок?

— Будзем рэалістамі: няма сумневу ў тым, што задуманае рэалізуецца зусім не вокамгненна. Магчыма, на гэта спатрэбіцца цэлае дзесяцігоддзе. Складанасць такога планавання заключаецца ў тым, што ідэалагічныя прыярытэты і прыгожыя ідэі павінны спалучыцца з рэальнымі магчымасцямі — у першую чаргу, фінансавымі, але таксама і творчымі.

— Хацелася б засяродзіць увагу менавіта на апошнім аспекце. Зразумела, што паміж задумай і рэалізацыяй павінен прайсці пэўны адмежак часу. Ці паспеюць нашы творцы выканаць запланаванае?

— Многія задумы ўжо існуюць не толькі на паперы, але і ў выглядзе праектаў, якія можна ўбачыць у майстэрнях скульптараў. Кіруючыся сваім патрыятычным пачуццём і спадзеючыся, што рана ці позна іх высілкі будуць запатрабаваны, творцы працавалі на будучыню.

Аўтары самых маштабных праектаў будуць вызначаны конкурсным шляхам. Скульптурная школа на Беларусі вельмі добрая, пра што сведчыць хаця б яе запатрабаванасць за мяжой. Магу адзначыць і маладых скульптараў — у тым ліку і тых, хто яшчэ толькі вучыцца. Яны выпраменьваюць свежыя ідэі і маюць майстэрства, каб іх рэалізаваць. Спадзяюся, талент гэтай творчай моладзі будзе задзейнічаны напоўніцу.

Думаю, пабачыўшы на вашых старонках пералік асоб і падзей, якім плануецца прысвяціць мемарыяльныя збудаванні, скульптар выбярэ са спісу тую тэму, якая найбольш яго цікавіць, возьме свой штодзённік і зробіць там пазнаку. Напрыклад: "Не забыць! У Гродзенскай вобласці плануюць паставіць помнік Антонію Тызенгаузу". У творцаў ёсць досыць часу, каб паразважаць над праектам — у тым ліку і наведаць бібліятэку, каб глыбей вывучыць гісторыю, звязаную з той ці іншай персаналіяй або падзеяй.

— Напэўна, сістэматызацыя ў сферы манументальнага мастацтва дазволіць выкрышталізаваць і агульную яго канцэпцыю — прынамсі, на бліжэйшую перспектыву...

— Не толькі на бліжэйшую, але і на далёкую. Яе можна выказаць літаральна ў некалькіх словах: увекавечванне знакавых постацей і падзей беларускай гісторыі. Манументальнае мастацтва здатнае азнаёміць з ёю не горш, чым школьны падручнік. Прыехаўшы ў незнаёмы горад, ты ідзеш па яго вуліцах і міжволі задаеш сабе пытанне: "А каму гэты помнік?" І спакваля, бы адкрытую кнігу, чытаеш лёс гэтай зямлі і яе народа. Пакуль жа ў Мінску няма помніка Усяславу Чарадзею або яго сыну Глебу — першаму мінскаму князю. Нідзе на Беларусі не ўбачыш і велічную постаць Тадэвуша Касцюшкі...

Не так даўно было прынята рашэнне Саюзнай дзяржавы па стварэнні двух манументальных збудаванняў. Адно з іх прысвечана падзеям 1812 года — гэта аднаўленне помніка, які быў узведзены ў Полацку да сотай гадавіны перамогі над Напалеонам. Другая звяртае ўвагу на вайну, якая нашым народам, прызнацца, крыху падзабыта, — Першую сусветную. Помнік паўстане ў Смаргоні — горадзе, які напалам перарэзала лінія фронту і які быў амаль цалкам зруйнаваны.

Дарэчы, выдатнае адлюстраванне гэтай канцэпцыі — велічны манумент, які ў хуткім часе мае паўстаць да тысячагоддзя Брэста. У ім злучаны гістарычныя постаці розных эпох. Мы павінны шанаваць і далёкіх продкаў, і герояў Вялікай Айчыннай вайны, і тых асоб, якія былі нашымі сучаснікамі і адышлі ў вечнасць зусім нядаўна, зрабіўшы вялізны ўнёсак у развіццё беларускага грамадства. Таму, апрача маштабных помнікаў, увага будзе канцэнтравацца таксама і на ўсталяванні мемарыяльных дошак.

— Без сумневу, увекавечванне землякоў залежыць ад актыўнасці кіраўнікоў рэгіянальнага ўзроўню. Якую ролю ў рэалізацыі Зводнага плана можна адвесці "ініцыятыве з месцаў"?

— Выключную. Манументальнае мастацтва — гэта перш-наперш асэнсаванне сваёй гісторыі. Цяперашні досвед паказвае: у тых рэгіёнах, дзе добра пастаўлена краязнаўчая і музейная справа, актыўна з'яўляюцца і помнікі слынным землякам або знамянальным падзеям. Найлепшы прыклад тут — той самы Полацк. Як бачым, знаходзяцца і творчыя, і фінансавыя рэсурсы — галоўнае, каб была патрэба!

— Але ж часам такая ініцыятыва спараджала моманты непаразумення паміж Рэспубліканскім саветам па манументальным мастацтве і асобнымі прадстаўнікамі муніцыпальных улад.

— Думаю, гэта ўжо ў мінулым. Дзякуючы павышанай увазе Кіраўніка дзяржавы да манументальнага мастацтва, гэтая работа становіцца ўсё больш і больш сістэмнай. Вельмі важны зрух — стварэнне экспертных саветаў па манументальным мастацтве ў кожнай з абласцей. Сёння яны толькі "ўстаюць на ногі", але неўзабаве, спадзяюся, будуць выконваць сваю галоўную задачу: суаднесці ініцыятыву на месцах з дзяржаўнай палітыкай у галіне культуры.

Хочацца верыць, што і ўсе прадстаўнікі мясцовых улад паставяцца да гэтай пазіцыі з разуменнем. Бо яна не мае на мэце забараніць або неяк абмежаваць чыюсьці ініцыятыву. Зусім не! Гутарка пра іншае: добрая задума павінна быць і выканана належным чынам. Гэта тычыцца і працы скульптара, і аптымальнага архітэктурнага вырашэння, і яшчэ многіх аспектаў, якія можна даверыць толькі прафесіяналам.

Так, сёння некаторыя грэбуюць іх прыдзірлівым меркаваннем і кажуць: маўляў, мы ўсё самі зробім, не марнуючы сіл на ўзгадненні, і помнік у хуткім часе будзе стаяць. Ён і сапраўды будзе стаяць доўгія гады. Пытанне ў іншым: ці не давядзецца нашчадкам пра гэта пашкадаваць? Ці не скажуць яны потым, што ён толькі псуе аблічча іх горада? Гэта прыкра ўдвая: яшчэ і таму, што такое ўспрыняцце тычыцца не толькі аўтараў помніка, але і той асобы, каму ён прысвечаны. Мастак-манументаліст можа ўзвялічыць гістарычную постаць, на вякі стварыць яе прывабны вобраз, якому будуць верыць нават болей, чым біяграфічным фактам. А можа і наадварот — прынізіць. Не вельмі ўдалыя помнікі геніяльным асобам у нас ужо ёсць, і не варта множыць іх лік.

— Ці "зацвердзяць" цяперашнія ўзоры манументальнага мастацтва нашчадкі, адназначна казаць немагчыма: ніхто не ўмее прадказваць будучыню. Але ж "візу" сучаснікаў яны могуць атрымаць і сёння — праз грамадскае абмеркаванне з удзелам спецыялістаў.

— Канешне! Вельмі кепска, калі новыя ініцыятывы абмяркоўваюцца і рэалізуюцца "за зачыненымі дзвярыма", а грамадскасць потым ставяць як бы перад фактам. Трэба, каб свае прапановы адносна таго ці іншага помніка маглі выказаць усе зацікаўленыя людзі, а не якоесьці вузкае кола, дзе кожны адстойвае свае інтарэсы. Калі паўстанне новых манументальных аб'ектаў ахутана штучнай "аурай таямнічасці", ніякага парадку ў гэтай сферы не будзе. Таму самае галоўнае тут — галоснасць.

Апошняе тычыцца і выбару тэм. Магу прадбачыць такую рэакцыю з боку прадстаўніка мясцовых улад: маўляў, мне не патрэбны помнік гэтаму дзеячу, бо ён у сваім жыцці праявіў сябе не толькі з лепшага боку. І тут узнікае пытанне: ці можа адзін чалавек выносіць такія прысуды гістарычным асобам? Як вядома, адназначна станоўчых герояў у гісторыі не так і шмат.

Паўтаруся: помнікі ствараюцца не на год і не на два. Таму іх паўстанне патрабуе дэталёвага ўліку кожнай важнай дэталі і карпатлівай працы прафесіяналаў з розных сфер.

— Карыстаючыся нагодай, закрану яшчэ адну спрэчную тэму — малыя архітэктурныя формы, якія нярэдка ўсталёўваюцца без дазволу экспертнага савета. Ці патрэбна іх жорсткая рэгламентацыя?

— Зусім неабавязкова везці з Мінска цэлы аўтобус экспертаў, каб тыя разглядалі, скажам, скульптуру дзяўчынкі з апельсінам у парку пэўнага райцэнтра. Лічу, што калі рэгіянальныя саветы па манументальным мастацтве пачнуць працаваць у поўную сілу, пытанне будзе знята само сабою. Зрэшты, для гэтага патрэбна і яшчэ адна ўмова: каб ініцыятары паўстання "малых форм" падпарадкоўваліся дзяржаўным законам і запрашалі членаў савета — прафесійных архітэктараў і скульптараў. Тады гэтая сфера ўпарадкуецца.

— У гісторыі ёсць нямала прыкладаў, калі шырокія колы грамадства бралі ўдзел не толькі ў абмеркаванні праекта помніка, але і ў яго стварэнні самым непасрэдным чынам: ахвяруючы ўласныя грошы. Ці актуальныя падобныя акцыі ў наш час?

— Так, вельмі актуальныя, і яны маюць свой прыклад: простыя грамадзяне ахвотна ахвяруюць сродкі на паўстанне помніка Тысячагоддзя Брэста. Ды, зрэшты, нават не ў грошах тут справа. Галоўнае тое, што і стаўленне да помніка, які стаў вынікам грамадскага пачыну, у гараджан будзе іншым. Уяўляеце, з якім гонарам яны стануць паказваць яго гасцям!

Дарэчы, важна прыгадаць і яшчэ адзін аспект агульнаграмадскага абмеркавання — гістарычную асвету. Стараецца спецыяльнае інфармацыйнае поле, і трапіўшы ў яго, уцягнуўшыся ў дыскусію, людзі пачынаюць цікавіцца біяграфіямі і падзеямі. У іх з'яўляецца патрэба лепш ведаць гісторыю свайго краю.

Такі "эфект далучанасці" вельмі важны. Помнік — гэта пасланне ў будучыню, пасланне сучаснікаў нашчадкам. І, адначасова, вяртанне на радзіму тых нашых продкаў, якія калісьці былі вымушаны яе пакінуць.

— Але якім чынам адбываецца гэтае вяртанне?

— Тут прыгадваюцца словы Льва Гумілёва (цытую па памяці): "Беларусы, вы так шмат і шчодра раздалі чалавецтву. Калі ж вы, нарэшце, пачняце збіраць?" Так, многія сыны беларускага народа ўвайшлі ў гісторыю іншых краін, і іх лёсаў ужо не зменіш. Але помнік з надпісам "Тут нарадзіўся..." можа стаяць толькі ў адным месцы на свеце.

Ілля СВІРЫН

Па слядах выступлення "Культуры"

Фінансаванне рамонту працягнута

У № 16 "К" гэтага года пад рубрыкай "Родная зямля: час крэатыву" быў змешчаны артыкул "Ці шмат імпэту назапасіць СДК у ашчаднай касе?". Гаворка ў ім вялася пра аграгарадкі Сенненскага раёна, што з-за недахопу грошай на рамонт устаноў культуры трапілі ў лік пераходных, пра будынак РДК, які маральна і матэрыяльна састарэў. Публікацыя была накіравана на рэагаванне. Вось што адказвае рэдакцыі старшыня Сенненскага райвыканкама Эдуард Герасіменка:

"Артыкул "Культуры" разгледжаны на апаратнай нарадзе ў старшыні райвыканкама.

У Сенненскім раёне чатыры аб'екты ўстаноў культуры з'яўляюцца пераходнымі: "Мадэрнізацыя сельскага Дома культуры ў Ходцах", "Мадэрнізацыя сельскага клуба ў Багданаве", "Капітальны рамонт сельскага клуба ў Студзёнцы", "Рэканструкцыя СДК у Белай Ліпе". Невыкананне паказчыкаў Дзяржпраграмы адраджэння і развіцця сяла на 2005 — 2010 гады тлумачыцца тым, што раённы бюджэт фінансуецца дзяржавай на 70 працэнтаў.

На 01.05.2009 г. завершаны рамонтна-будаўнічыя работы на аб'екце "Мадэрнізацыя СДК у Ходцах". Асвоена 1022,0 млн. рублёў. У абноўленым будынку размясціліся сельскі Дом культуры, музычная школа, бібліятэка. Урачыстае адкрыццё адбылося 30.04.2009 г.

Цяпер вядуцца работы на аб'екце ў Студзёнцы: уладкаванне ацяплення, унутраныя і знешнія аддзелачныя работы, уладкаванне павеці для захоўвання мясцовых відаў паліва, добраўпарадкаванне. Асвоена 54,2 млн. рублёў, з іх 7,5 — у бягучым годзе, аплачана — 46,7 млн. рублёў. Для рамонтна-будаўнічых работ са сродкаў раённага бюджэту выдаткоўваецца 58,4 млн. рублёў. Тэрмін уводу аб'екта — чэрвень 2009 года.

На аб'екце ў Багданаве асвоена 254,8 млн. рублёў. Запазычанасці за выкананыя работы няма. Неабходна выканаць тэрманавацыю вонкавых сцен, добраўпарадкаванне. Рэшта наяўных фінансавых сродкаў складае 82 млн. рублёў.

У кастрычніку 2008 года пачаліся рамонтна-будаўнічыя работы ў Белай Ліпе. Асвоена 51,5 млн. рублёў. Запазычанасць — 83,2 млн. рублёў: генпадрадчыку ПГБУП "Будкамгандаль" — 18,9 млн., праектнаму інстытуту "Віцебскаблсельбудпраект" — 63,6, тэхнагляду — 0,7 млн. рублёў. Для завяршэння рамонтна-будаўнічых работ згодна з праектна-каштарыснай дакументацыяй неабходна 1040,6 млн. рублёў.

Сенненскі РДК мае патрэбу ў рэканструкцыі, бо будынак — 1937 года ўзвядзення, а капітальны рамонт праводзіўся 20 гадоў таму. Распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя па рэканструкцыі РДК. Каштарысны кошт у дзеючых цэнах — 3 млрд. рублёў. Працягласць выканання рамонтна-будаўнічых работ складае 14 месяцаў. На 2009 год з раённага бюджэту выдаткавана 180 млн. рублёў. Заказчыкам і распарадчыкам фінансавых сродкаў вызначана КУП "Сенненскае УКБ". "Віцебскаблрэмбуд" вядзе вышукальныя работы, высвятляючы магчымасць надбудовы аднаго дадатковага паверха пры рэканструкцыі РДК і будынка цэнтральнай раённай бібліятэкі ў Сянно.

Для выканання поўнага аб'ёму работ згодна з праектна-каштарыснай дакументацыяй (прыбудова танцзалы, ЗАГСа, Дома рамёстваў, бібліятэкі, рамонт існуючага РДК) Сенненскі раённы выканаўчы камітэт просіць аказаць фінансавую падтрымку з абласнога бюджэту з уключэннем аб'екта ў інавацыйную Праграму 2010 года".

А вось адказ начальніка ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама Мікалая Пашынскага:

"Па даручэнні Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта ўпраўленне культуры разгледзела пытанні, азначаныя ў артыкуле "Ці шмат імпэту назапасіць СДК у ашчаднай касе?", надрукаваным на старонках газеты "Культура," і паведамляе наступнае.

Сапраўды, у Сенненскім раёне існуюць праблемы па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў культуры.

Аб'екты культуры, якія падлягаюць уладкаванню ў аграгарадкі, маюць слабую матэрыяльную базу. Як правіла, гэта будынкі 60-х гадоў, якія не рамантаваліся з часу пабудовы. На іх умацаванне неабходны работы капітальнага характару са значнымі будаўнічымі аб'ёмамі і падоўжанымі нарматыўнымі тэрмінамі будаўніцтва.

За перыяд рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі ў Сенненскім раёне з 7 аб'ектаў культуры аграгарадкоў здадзены ў тэрмін і працуюць толькі 3. Асвоена грашовых сродкаў больш за 1,5 млрд. рублёў. Засталіся пераходныя аб'екты з патрабуемым аб'ёмам фінансавання 1,2 млрд. рублёў. Райвыканкамы самі распрацоўваюць пашпарты аграгарадкоў, дзе плануюць выкананне і кошт будаўнічых работ. Але недастатковасць сродкаў з года ў год нарошчвае аб'ёмы незавершанага будаўніцтва.

У адпаведнасці з рашэннем Віцебскага аблвыканкама ад 04.05.2009 г. № 264 у 2009 годзе прадоўжана фінансаванне рамонту на пераходных аб'ектах культуры аграгарадкоў 2006 — 2007 гг. Дзякуючы гэтаму завершаны работы і ўведзены ў эксплуатацыю Дом культуры в. Ходцы — аграгарадка 2006 г. Таксама забяспечана фінансавая магчымасць працягу рамонту Багданаўскага клуба.

Згодна з заявамі райвыканкама на развіццё сацыяльнай сферы аграгарадкоў 2008 — 2009 гг. у раён накіравана 2,4 млрд. рублёў (рашэнне аблвыканкама ад 13.05.2009 г. № 284), у тым ліку на ўладкаванне ўстаноў культуры в. Студзенка і в. Белая Ліпа.

Белаліпская сельская бібліятэка часова пераведзена ў чатырохпакаёвую кватэру жылога двухпавярховага дома. Па даных статыстычнай справаздачы, у Белаліпскай сельскай бібліятэцы за 2008 год, у параўнанні з 2007 годам, колькасць чытачоў паменшылася на 40 чалавек і складала на канец года 430 чалавек. А колькасць наведванняў, наадварот, павялічылася на 145 і складала 3194 наведванні. У наступны час праводзіцца работа па ўпарадкаванні астатніх памяшканняў установы.

Што да клуба, дык яго перавод у памяшканне ашчаднай касы з'яўляецца вымушанай часовай мерай на перыяд рамонту.

Па пытанні фінансавай дапамогі ў рэканструкцыі Сененскага раённага Дома культуры паведамляем наступнае.

Улічваючы тое, што неабходны аб'ём інвестыцый на гэты аб'ект складае каля 3,0 млрд. рублёў, а цэнтралізаваны фонд упраўлення культуры на рамонт у 2009 годзе не прадугледжаны, упраўленне культуры выступіла з хадайніцтвам перад аблвыканкамам аб уключэнні аб'екта ў абласную інвестыцыйную праграму.

Такім чынам, цяжкае эканамічнае становішча і абмежаванасць фінансавання прымушаюць планаваць рамонт з улікам існуючых сродкаў.

Упраўленне культуры і надалей будзе весці кантроль і супрацоўніцтва па рэалізацыі планавых заданняў Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі на 2005 — 2010 гады і ў межах сваёй кампетэнцыі рэгуляваць пытанні, якія патрабуюць рашэння на абласным узроўні".

Чытач — Газета — Міністэрства

kultura@tut.by

На аснове якога дакумента фарміруецца штат бібліятэкі ССНУ сістэмы Міністэрства культуры? Да якой групы па аплаце працы адносяцца бібліятэчныя работнікі ССНУ? На аснове якога дакумента бібліятэчным работнікам прысвойваюцца катэгорыі?

На пытанні адказвае кансультант эканамічнага ўпраўлення Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Ніна АЛЯКСЕЕВА:

— Аб увядзенні ў штатны расклад сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў пасады бібліятэкара і парадку прысваення ім кваліфікацыйнай катэгорыі Міністэрства культуры паведамляе наступнае.

У тыпавых штатах сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў культуры і мастацтва, зацверджаных загадам Міністэрства культуры ад 30.08.1996 г. № 206 і ўзгодненых з Міністэрствам фінансаў і Міністэрствам эканомікі, пасады бібліятэчных работнікаў не прадугледжаны. У сувязі з вытворчай неабходнасцю, па ўзгадненні з вышэйстаячай арганізацыяй і фінансавымі органамі могуць быць уведзены дадатковыя пасады, у тым ліку і бібліятэчных работнікаў. Трэба зазначыць, што службовы аклад бібліятэкара не залежыць ад групы па аплаце працы кіраўнікоў устаноў.

У дадзены час Міністэрствам культуры рыхтуецца праект тыпавых штатаў і нарматываў колькасці работнікаў навучальных устаноў культуры і мастацтва, што забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай адукацыі, дзе прадугледжваюцца пасады бібліятэчных работнікаў.

Прысваенне бібліятэкару, бібліёграфу кваліфікацыйнай катэгорыі ажыццяўляецца згодна з пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь ад 30 сакавіка 2004 г. № 32 "Аб зацвярджэнні структуры і агульных палажэнняў адзінага кваліфікацыйнага даведніка пасад служачых".

kultura@tut.by

Прашу растлумачыць, ці павінна мне, у дадзены час выкладчыку дзіцячай школы мастацтваў, залічвацца ў педагагічны стаж праца з 1984 па 1987 гг. у якасці кіраўніка студэнцкага вакальна-інструментальнага ансамбля Палаца культуры Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі? Зарплату за працу кіраўніка гуртка я атрымліваў у студэнцкім прафкаме Акадэміі.

На пытанне адказвае галоўны спецыяліст упраўлення навучальных устаноў і кадраў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Ірына АНЦІПЕНКА:

— У адпаведнасці з абзацам 5 пункта 5 Інструкцыі аб асаблівасцях вылічэння стажу працы па спецыяльнасці (у галіне) работнікаў арганізацый сістэмы адукацыі, фінансуемых з бюджэту, зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 31 кастрычніка 2002 г. № 45, у стаж працы па спецыяльнасці выкладчыкам школ мастацтваў залічваецца час працы ў арганізацыях па спецыяльнасці, якая адпавядае профілю прадмета (дысцыпліны), што выкладаецца, зместу выконваемай работы. Згодна з дадзенай інструкцыяй, педагагічным работнікам вылічаецца стаж працы па спецыяльнасці, паняцце ж "педагагічны стаж" заканадаўствам не прадугледжана.

Улічваючы той факт, што заработная плата атрымлівалася ў прафсаюзным камітэце Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі, па рашэнні наймальніка ў стаж працы па спецыяльнасці можа быць залічаны перыяд працы ў арганізацыях, незалежна ад формы ўласнасці або іх структурных падраздзяленняў, характар работы якіх аналагічны рабоце, што выконваецца ў дзяржаўнай арганізацыі, на пасадах, прадугледжаных пералікам (пункт 17 Палажэння аб парадку вылічэння стажу працы па спецыяльнасці (у галіне) і павышэння тарыфных ставак (акладаў) работнікаў арганізацый, якія фінансуюцца з бюджэту і карыстаюцца дзяржаўнымі датацыямі, за стаж працы па спецыяльнасці (у галіне), зацверджаным пастановай Міністэрства працы Рэспублікі Беларусь ад 12.01.2000 г. № 4.

Юрыдычныя тонкасці (elegantia juris)

kultura@tut.by

Ці магчыма дазволіць унутранае сумяшчальніцтва 0,5 стаўкі пасады тэхніка па эксплуатацыі будынкаў і збудаванняў ва ўстанове адукацыі загадчыку гаспадаркі? Ці мае дачыненне дадзеная пасада да дзяржаўнай асобы, прыраўнаванай да яе асобы у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь "Аб барацьбе з карупцыяй"?

На пытанне адказвае начальнік юрыдычнага аддзела Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Алена ВЕШТАРТ:

— У адпаведнасці з артыкулам 17 Закону Рэспублікі Беларусь "Аб барацьбе з карупцыяй" дзяржаўная службовая асоба не мае права выконваць іншую аплачваемую працу, не звязаную з выкананнем працоўных абавязкаў па месцы асноўнай працы (акрамя выкладчыцкай, навуковай, культурнай, творчай дзейнасці і медыцынскай практыкі).

Да дзяржаўных службовых асоб адносяцца Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў, якія ажыццяўляюць свае паўнамоцтвы на прафесійнай аснове, а таксама іншыя дзяржаўныя служачыя, асобы, што займаюць пасады ў дзяржаўных арганізацыях, Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь, другіх войсках і вайсковых фарміраваннях Рэспублікі Беларусь і адносяцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь да службовых асоб.

Як бачым, да дзяржаўных службовых асоб адносяцца асобы, якія займаюць пасады ў дзяржаўных арганізацыях і адносяцца да службовых асоб.

Зыходзячы з вызначэнняў, што маюцца ў заканадаўстве (артыкул 1.3 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністратыўных правапарушэннях, артыкул 4 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь), службовая асоба — гэта асоба, якая пастаянна, часова або па спецыяльным паўнамоцтве выконвае арганізацыйна-распарадчыя ці адміністратыўна-гаспадарчыя функцыі.

Да тых, хто займае пасады, звязаныя з выкананнем арганізацыйна-распарадчых абавязкаў, неабходна адносіць асоб, якія ажыццяўляюць кіраўніцтва дзейнасцю арганізацыі, яе структурных падраздзяленняў, расстаноўку і падбор кадраў, арганізацыю працы ці службы работнікаў, падтрыманне дысцыпліны, прымяненне заахвочвальных мер і накладанне дысцыплінарных спагнанняў і да т. п.

Тымі, хто займае пасады, звязаныя з выкананнем адміністратыўна-гаспадарчых абавязкаў, патрэбна прызнаваць, у прыватнасці, асоб, якія ажыццяўляюць паўнамоцтвы па кіраванні і распараджэнні маёмасцю і грашовымі сродкамі, а таксама арганізацыю ўліку і кантролю за водпускам і рэалізацыяй матэрыяльных каштоўнасцей.

У адпаведнасці з Кваліфікацыйным даведнікам "Пасады служачых, агульныя для ўсіх галін эканомікі", зацверджаным пастановай Міністэрства працы Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 1999 г. № 159, загадчык гаспадаркі адносіцца да кіраўнікоў і ажыццяўляе кіраўніцтва працай па гаспадарчым абслугоўванні арганізацыі ці яе падраздзяленняў, кіруе працай абслугоўваючага персаналу і г. д.

Такім чынам, загадчык гаспадаркі выконвае арганізацыйна-распарадчыя функцыі і адносіцца да службовых асоб, а значыць, калі ён працуе ў дзяржаўнай арганізацыі, то з'яўляецца дзяржаўнай службовай асобай.



“КУФАР-РАДЦА”

выпуск № 6 (30)

Шаноўныя культасветработнікі!
Каб вы паспелі падрыхтаваць да пастаноўкі ў сваіх калектывах п'есу “Маленькі Ясь і Папараць-кветка, або Прыгоды ў ноч на Івана Купалу”, мы вырашылі прапанаваць вам яшчэ адзін “Куфар-радцу” запар. Па традыцыі, старонкі ягоныя паспрыяюць і пашырэнню рэпертуару вакалістаў ва ўстановах культуры нашай краіны. І адкрывае гэты выпуск песня Дзмітрыя Даўгалёва на верш Васіля Віткі “Беларусь”, прасякнутая высокай любоўю да роднай краіны, нашай Беларусі. Чарговы, ужо 30-ы па ліку, “Куфар” будзе карысным асабліва цяпер — у час летніх канікул школьнікаў.
Да новых сустрэч!

Беларусь

Словы Васіля Віткі
Музыка Дзмітрыя Даўгалёва

Ухвалена Глебавым

Шчаслівы той кампазітар, якому не сорамна нават за свае студэнцкія работы. Гэта — пра Дзмітрыя Даўгалёва. Бо песню “Беларусь”, якая і сёння застаецца надзвычай актуальнай і запатрабавальнай, ён напісаў, калі вучыўся на чацвёртым курсе Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі.

— Песня заняла першае месца, — распавядае Дзмітрый, — на кансерваторскім конкурсе патрыятычных твораў. Такія конкурсы тады праводзіліся рэгулярна, па ініцыятыве тагачаснага рэктара, знакамітага кампазітара Уладзіміра Алоўнікава. І мелі працяг, прычым не толькі ў выглядзе невялікай грашовай узнагароды. Песня была запісана дзіцячым хорам Беларускага радыё і тэлебачання пад кіраўніцтвам Веры Лашук і тамтэйшым эстрадна-сімфанічным аркестрам на чале з Барысам Райскім (дарэчы, я сам рабіў яе аркестроўку). І ледзь толькі песня загучала ў эфіры, да мяне сталі звяртацца харавыя калектывы: дзе ўзяць ноты? Я падрыхтаваў копіі, і твор спявалі больш як дзесяць хораў: не толькі з Мінска, але і з Віцебска, Наваполацка, Гродна, Брэста. Тыя гады былі папраўдзе “харавой эпохай”. Сёння назіраецца своеасаблівае адраджэнне харавых традыцый, таму, спадзяюся, песня атрымае новыя выканальніцкія версіі.

— Як вам працавалася з паэзіяй Васіля Віткі?

— Цудоўна! Можна сказаць, яна сама мяне знайшла. Пад час вучобы я часта хадзіў у бібліятэкі — па цішыню, “хаваючыся” ад інтэрнатаўскага шуму. Браў якую-небудзь кніжку — пагартаць, але больш прыходзіў у чытальную залу, каб проста адпачыць. Узяў чарговы раз нейкі паэтычны зборнік розных аўтараў — і ён разгарнуўся акурат на гэтым вершы. Усё адбылося быццам само сабой: толькі ўчора я даведаўся пра конкурс, і тут раптам — гатовы тэкст. Адразу ўразіў вобраз: Беларусь — як зялёны кляновы лісток, што зляцеў на карту свету. Прыгадалася наша беларуская прырода, прыгажосць краявідаў, па якой заўсёды сумуеш у горадзе. Патрыятызм гэтай песні не “плакатны”, не “лозунгавы”, а — вельмі асабісты, шчыры, кранальна лірычны: “душы запаветны куток”. Таму і мелодыя нарадзілася быццам сама — засталося толькі запісаць.

— Ці паказвалі вы яе свайму педагогу, у класе якога тады займаліся, — Яўгену Глебаву?

— Канешне! І саму песню, і яе далейшую партытуру, хаця ствараласяўсё гэта, зразумела, па-за вучэбнымі планамі. Я прыносіў Яўгену Аляксандравічу ўсё, што пісаў. І калі ён гаварыў: “Не”, — я ці цалкам перапрацоўваў матэрыял, ці ўвогуле ад яго адмаўляўся і больш нідзе нікому не паказваў. Але гэтую песню ён ухваліў. Таму і сёння мне за яе не сорамна.

— Яна і папраўдзе гучыць, быццам напісаная цяпер, блізкая і зразумелая людзям усіх узростаў: “як песня гарачага лета”, “як роднае матчына сэрца”...

Надзея БУНЦЭВІЧ

На карце вялікага свету
Яна, як зялёны лісток,
Як песня гарачага лета,
Крынічнай вады глыток.

Прыпеў:
Адвечная калыханка,
Душы запаветны куток.
Трапеча гарачым ранкам
На дрэве нястомны лісток.
Трапеча гарачым ранкам
На дрэве нястомны лісток.

А ў навальніцу б'ецца
Нябачны паміж лісця,
Як роднае матчына сэрца,
Што мне даражэй жыцця.

Прыпеў.

На карце вялікага свету
Яна, як зялёны лісток...



Маленькі Ясь і Папараць-кветка, або Прыгоды ў ноч на Івана Купалу

Драматычная казка ў дзвюх дзеях з пралогам і эпілогам

Алесь КОЗЕЛ

Дзейныя асобы

- **Вядучы-Падарожнік**
- **Ясь**
- **Марыся (старэйшая сястра Яся)**
- **Бацька**
- **Маці**
- **Рагуля (карова)**
- **Ночка (цялушка)**
- **Тры авечкі**
- **Мядзведзь**
- **Ліса**
- **Вожык**
- **Заяц**
- **Папараць-кветка**
- **Чароўная лясная дзева**

ПРАЛОГ

На авансцэну выходзіць Падарожнік. Ён апрануты, як турыст, у руках — кіёк, а цераз плячо вісіць мальберт. Уздыхае. Скідае з пляча мальберт і садзіцца на пянёк. Азіраецца навокал.

Вядучы-Падарожнік. Няма на свеце нічога прыгажэйшага за родныя мясціны! Пабываць тут для мяне — самы лепшы адпачынак. Шкада толькі, што не часта атрымліваецца. Але хоць раз на год я стараюся сюды прыехаць. Яшчэ стаіць наша старая хата, дзе я нарадзіўся і вырас. Нават да гэтага часу памятаю кожную шчыліну ў яе шурпатых сценах... Тут нават паветра іншае. І такія знаёмыя пахі — радзімы і маленства. А колькі цікавых казак я тут пачуў! А колькі сапраўдных выпадкаў сталі казкамі!

Калі ж гэта было? Не так ужо і даўно. Якраз тады, калі ўсё здавалася іншым: трава — гусцейшай і зелянейшай, хлеб — смачнейшым, цукар — саладзейшым. Карацей кажучы — у дзяцінстве, дзе нават сны, у якіх я часта лятаў над роднымі палеткамі, былі дужа яркімі і чароўнымі. Вось тады і пачуў я гэтую легенду.

Святло робіцца цямнейшым. У глыбіні сцэны высвечваецца драў-

Пагуляй са мной!

Словы Уладзіміра Пецюкевіча
Музыка Дзмітрыя Даўгалёва

“Кошкі-мышкі” з камп’ютэрам

— Дзмітрый, — звяртаюся я да кампазітара, — як вы пачалі супрацоўнічаць з Уладзімірам Пецюкевічам? На працягу 20-годдзя гэтае сяброўства прыводзіць да з’яўлення вашых лепшых хітоў.

— Свае першыя дзве песні на яго вершы — “Гаю мой, не кліч” і “Поле горкіх палыноў” — я напісаў, так бы мовіць, “завочна”, атрымаўшы яго тэксты ад сваіх сяброў. А пазнаёміліся мы толькі праз 6 гадоў. І цяпер вельмі часта працуем сумесна. Калі некалькі гадоў таму зразумелі, што катастрафічна не хапае дзіцячых песень на беларускай мове, задумалі цэлы цыкл, разам шукалі адпаведныя вобразы, цікавыя сучаснай дзятве. Дарэчы, тэму гэтай песні падказалі мае ўласныя дзеці.

— У вас іх трое: сын Яўген і дзве дачкі — Насця і Маша. Хто ж дакладна можа лічыцца “аўтарам ідэі”?

— Ну, ідэя не была іхняй. Проста, Жэня з Насцяй аднойчы “не падзялілі” камп’ютэр — і паэт зрабіў з гэтай жартоўнай гісторыі песенны верш.

— А ці даводзіцца вам асабіста “ваяваць” з дзецьмі з-за камп’ютэра?

— Хіба я падобны на ваяўнічага чалавека? У мяне свой камп’ютэр, выключна для працы, а ў дзятвы — свой. Але ў ім таксама няма ніякіх “стралялак” ці “жахлітыкаў” — толькі навучальныя праграмы, электронныя версіі падручнікаў, энцыклапедычных даведнікаў, развіваючыя гульні. Так што застаецца хіба абмяжоўваць час, што праводзіцца ля камп’ютэра. Але старэйшы, Жэня, цяпер у 9-м класе, захапляецца праграмаваннем, мікрасхемамі. Можа, з цягам часу гэтая цікавасць і стане штуршком да прафесіі. Але галоўнае — каб ніякі камп’ютэр не замяняў жывыя чалавечыя стасункі. Пра гэта і песня!

Ты з камп’ютэрам гуляеш,
Нібы коцік з мышкай.
А з сястрычкай забываеш
Пагуляць хоць крышку.

Прыпеў:
Пагуляй, брацік мой,
Пагуляй са мной!
Пагуляй, брацік мой,
Пагуляй са мной!

Не забуду дзён шчаслівых,
Як з табой гуляла:
Ты іграў на піяніна,
А я танцавала.

Прыпеў.

Кінь ты гэтую машынку,
Дай вачам палёгку:
Пагуляй са мной хвілінку —
Так мне адзінока!

Прыпеў.



Квінтэсенцыя патрыятызму: не быць трэскай, што плыве па цячэнні

Ідэя правядзення газетай “Культура” “круглага стала” на тэму “Патрыятызм у сучасным беларускім мастацтве”, які прайшоў на базе Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага, узнікла цалкам не выпадкова. Сёння, у перыяд крышталізацыі актыўнай грамадзянскай пазіцыі, айчыннае мастацтва не можа заставацца ўбаку, задавольваючыся адно толькі творчымі пошукамі. Адчуваць “пульс” свайго народу і размаўляць з ім на адной мове — гэтыя спрадвечныя задачы, якія павінен ставіць перад сабой любы творца, не страцілі актуальнасці і ў XXI стагоддзі.

Удзельнікамі нашай размовы на актуальную тэму сталі драматург, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена ПАПОВА, скульптар Канстанцін СЕЛІХАНАЎ, галоўны рэжысёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага Сяргей КАВАЛЬЧЫК, эстрадная спявачка СТЭЛА, кінарэжысёр Іван ПАЎЛАЎ і кампазітар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Алег ХАДОСКА, рэдактар аддзела газеты “Культура” Таццяна КОМАНАВА.

Таццяна Команава:

— Тэму патрыятызму можна аднесці да шэрагу вечных: кожнае новае пакаленне спрабуе асэнсаваць яе па-свойму. Вось толькі, як выявілася, на сённяшні дзень розныя пакаленні нашага грамадства ўкладаюць у гэтае паняцце рознае значэнне. І гэта, я пераканана, датычыцца не толькі беларусаў, але, не ў меншай ступені, і прадстаўнікоў іншых нацый. Для кагосьці патрыятызм — гэта сляза на вачах пры сустрэчы з ушанаваным ордэнамі і медалямі ветэранам, для іншага — магчымасць купляць беларускае. А знойдуцца і тыя, для каго патрыятызм — гэта толькі гучнае слова, якое выклікае раздражненне ці, яшчэ горш, недаўменне… Я не заклікаю прызнавацца ва ўласным патрыятызме і любові да Радзімы. Нашмат важнейшым мне падаецца пагутарыць пра тое, наколькі патрыятычнае наша сучаснае мастацтва ўвогуле, у якой ступені яно павінна такім быць і наколькі можа сабе тое дазволіць? Ці актуальная гэтая катэгорыя для сённяшняй культурнай прасторы? Прапаную распачаць нашу размову Івану Паўлаву, які проста з парога заявіў нам, прысутным тут, пра ўласны касмапалітызм. Між іншым, мяркуючы па вашых, Іван, фільмах, складваецца абсалютна іншае ўражанне, бо літаральна ўсе яны прасякнуты беларускай тэматыкай: “Свежына з салютам”, “Глыбокая плынь”, “На спіне ў чорнага ката”…

Іван Паўлаў:

— Акурат у сувязі з гэтым хачу расказаць адну гісторыю з уласнага жыцця. 1991 год, жнівень, я — студэнт політэхнічнага інстытута — знаходжуся ў складзе будатрада ў Польшчы. Аднойчы мы прыходзім на працу і заўважаем, што мясцовыя вадзіцелі і будаўнікі глядзяць на нас з нейкім жалем у вачах. З іх радыёпрыёмнікаў чуем, што ў нас на радзіме нешта адбылося. Праз некалькі гадзін прыязджае гаспадар фірмы і кажа: “Я даю вам від на жыхарства, забяспечваю працай і жыллём”. З трыццаці чалавек дваццаць адразу ж адказалі: “Так, мы застаёмся”. Я тэлефаную бацькам, каб запытацца, што ж там адбываецца. Яны кажуць: маўляў, танкі па вуліцах не ездзяць, але калі ёсць магчымасць застацца — заставайся… Сказаць, што мы былі ў шоку, значыць не сказаць нічога: людзі ў адзін момант страцілі Радзіму... 21 жніўня ўсё завяршылася.

Па кантрасце да гэтага выпадку мы, вяртаючыся цягнікам дадому, перасякаем мяжу Мінска. І літаральна ўсім вагонам спяваем песню “Родина” Юрыя Шаўчука. Ніколі, ні раней, ні пазней, мы так не спявалі! І вось адкажыце мне, дзе патрыятызм: калі дваццаць чалавек сказалі, што застануцца за мяжой, бо ім стала страшна вяртацца дадому, ці потым, калі гэтыя людзі, усё ж вяртаючыся, пелі песню Шаўчука? Пасля такіх сітуацый я і называю сябе касмапалітам: за мяжою мне падабаецца радзіма, а калі я дома, то… час ад часу згадваю пра тое, што “добра там, дзе нас няма”…

Складваецца ўражанне, што Паўлаў робіць сваё кіно пра беларускую вёску? Але ж я здымаю, найперш, — пра чалавека ў розных сітуацыях, не важна, жыве ён у беларускай вёсцы ці ў афрыканскіх джунглях. Мне нашмат важней, каб глядач суперажываў сітуацыі і самому герою. Іншая справа — які ён сам па сабе: зараз пануе нейкая тэндэнцыя, згодна з якой галоўнага персанажа патрэбна шкадаваць. Можа, і я пра такога героя свой наступны фільм буду здымаць, бо

Таццяна Команава.

Сяргей Кавальчык.

Рэмба ў нас не “каціруецца”. Мы і не зможам зняць пра Рэмба.

Таццяна Команава:

— Чаму ж вы расказваеце пра магутныя пачуцці, перажытыя на ўласным вопыце, але здымаеце зусім іншае кіно — пра людзей, якіх, зыходзячы з вашых слоў, можна толькі шкадаваць? Чаму не прапануеце станоўчага героя-лідэра, які б стаў сапраўдным кумірам маладога пакалення і на якога хацелася б быць падобным?

Канстанцін Селіханаў:

— Я б усё ж хацеў канкрэтызаваць, пра што мы збіраемся гаварыць: пра асабісты патрыятызм ці пра патрыятызм у мастацтве? Бо з’яўляючыся патрыётам, у сваёй прафесіі, у мастацтве я магу рабіць усё, што заўгодна.

Таццяна Команава:

— Гэта вельмі істотнае пытанне. Не так даўно я паглядзела спектакль “Чалавек-падушка” па п’есе моднага ірландскага драматурга Марціна МакДонаха. Галоўны герой — пісьменнік, які стварае жахлівыя, крывавыя, але бязмерна таленавітыя гісторыі, і яны самым незвычайным чынам уражваюць чытачоў. Да такой ступені, што яго родны брат вырашае праверыць, наколькі ўражанне ад рэальнага ўвасаблення гэтых зладзействаў адпавядае таму эфекту (ці афекту?), які даюць іх мастацкія апісанні. І ў гэтым аспекце мне цікава, наколькі сучасны творца гатовы думаць пра падобны зваротны эфект? Ён хоча ўвасобіць тое, што носіць у сабе, ці ўсё ж пралічвае (няхай нават падсвядома), наколькі яго твор будзе выхоўваць і ўвогуле — якім чынам адгукнецца ў душах людзей?

Сяргей Кавальчык:

— У сувязі з гэтым не магу не прыгадаць “Сталкера” Андрэя Таркоўскага. Памятаеце, што адказаў герой Кайданоўскага на пытанне пра лёс папярэдняга сталкера і пра тое, чаму ж сталкеры не ўваходзяць у пакой? Таму што папярэдні сталкер увайшоў у пакой з жаданнем шчасця для ўсіх, а праз некаторы час атрымаў велізарную суму грошай, спіўся і павесіўся. Ён ішоў, дэкларуючы адно, а па сутнасці жадаў іншага. І атрымаўшы тое, чаго жадаў, зразумеў розніцу… Гэта аксіёма: не з’яўляючыся патрыётам, патрыятычны твор не створыш, таму што ў мастака гэта павінна быць у падсвядомасці, а не праяўляцца на ўзроўні дэкларацый.

Майму пакаленню саракагадовых давялося вельмі складана, бо станаўленне наша адбывалася ў перыяд сацыяльнага злому з выхадам на прастору, дзе ля тваіх ног — тысячы дарог, і ты не ведаеш, па якой пайсці. Іван тады вучыўся ў БПІ, а я якраз атрымаў акцёрскі дыплом. Мы з гонарам адмовіліся ад Тэатра-студыі кінаакцёра, хаця Аляксандр Яфрэмаў прапаноўваў ісці да яго з нашымі “Вясёлымі жабракамі”. Мы заявілі, што будзем ствараць уласны тэатр. Праўда, правалілі яго на першым жа годзе, бо не мелі аніякага ўяўлення пра тое, што і як неабходна рабіць, што тут таксама існуюць свае законы. Нас прываблівала думка: маўляў, увесь свет — ля нашых ног. Ды на паверку аказалася, што гэты самы “свет” адказаў: вы нам не патрэбны, у нас ёсць свае, уласныя ўяўленні, таму ці падладжвайцеся пад нас, ці ідзіце на ўсе чатыры бакі.

Сёння ж у айчынным тэатры хоць і невялікая, але настойлівая тэндэнцыя вяртання да мастацтва, яго вытокаў, — да ідэі. У такі складаны час, як цяпер, задача дзеячаў мастацтва — сфармуляваць і агучыць такую нацыянальную ідэю, якая б натхняла масы. Паглядзіце: амерыканцы ганарацца сваёй Грамадзянскай вайной і перамогай у ёй, французы — Рэвалюцыяй... А мы, маючы багатае мінулае, так і не можам вызначыцца, чым жа мусім ганарыцца: то гэта рэвалюцыя 1917 года, то Вялікае княства Літоўскае… Як жа можна вызначыцца з тым, хто мы такія, калі ў нас такая няпэўнасць у дачыненні да прыярытэтаў?

Таццяна Команава:

— А я лічу, што нам сёння неабходна не выбіраць з гісторыі тыя ці іншыя этапы развіцця нацыі, якія выклікаюць гонар, а прызнаць і прыняць той факт, што мінулае айчыны каштоўнае якраз сваёй цэласнасцю і непадзельнасцю, суплётам гераічных і трагічных яго старонак. І задача наша — упісаць увесь гэты гістарычны багаж у сучаснае мысленне беларусаў, “навесці масты” паміж мінулым і днём сённяшнім беларусаў, стаць своеасаблівым пасылам у заўтра нашай краіны.

Алена Папова:

— Асабіста ў мяне няма гэтага пачуцця раздвоенасці паміж патрыятызмам знешнім і ўнутраным. Усё гэта — толькі фразы, выбудаваныя пэўным чынам. Давайце зірнём больш шырока: самымі вялікімі патрыётамі ва ўсе часы былі самыя шчырыя аўтары. І дзякуючы гэтай вернасці ўнутранай праўдзе ніякага раздваення ў іх не ўзнікала. Нядаўна натрапіла ў Астаф’ева на невялічкі ўрывак пра вайну, які мяне ўразіў самым надзвычайным чынам. Чалавек, які прайшоў Вялікую Айчынную і бачыў, як кажуць, усё, прызнаецца: на Дняпроўскіх парогах мы перажылі такое, што “я не магу пра гэта пісаць” Гэткая шчырасць мастака, што — не патрыятызм?

Хачу вярнуцца да таго, з чаго пачаў Іван Паўлаў. Давайце ўспомнім Пушкіна, які гаварыў: “Я глубоко презираю Отечество свое, но мне больно, когда эти чувства со мной разделяет иностранец”. Іншымі словамі, нашы ўнутраныя “разборкі” — гэта выключна наша справа, а ёсць жа і момант знешняй этыкі. Відаць, недзе тут і праходзіць той самы падзел. Але ж для сапраўднага мастака і яго не існуе.

Што да нашага мастацтва, дык яму нашмат больш, чым патрыятызму, бракуе элементарнай якасці. І гэта мае адносіны літаральна да ўсіх яго відаў: калі я думаю не пра якасць, а выключна пра ўласную кішэню, то буду без цені сарамлівасці прасоўваць сваё “барахло” і “зажимать талантливо собрата”. І вось гэта якраз глыбока непатрыятычна: калі мы са сваімі падобнымі “дасягненнямі” выйдзем на міжнародную арэну, а нам скажуць: “Няўжо сапраўды гэта — узровень беларускага мастацтва?..” А ўсё — з прычыны элементарнай адсутнасці ўнутранай шчырасці. Давайце пачнём з сябе: будзем у мастацтве высакароднымі і прыстойнымі людзьмі, перастанем па прынцыпе “Ты — мне, я — табе” “прасоўваць” каго-небудзь і станем падтрымліваць па-сапраўднаму таленавітых людзей. Вось тады і будуць у нас абсалютна шчырыя ўзаемаадносіны.

Таццяна Команава:

— Я мяркую, што манументальнае мастацтва застаецца “ў вяках”, бадай, мацней, даўжэй за ўсе іншыя віды творчасці...

Канстанцін Селіханаў:

— Так, у нашай сферы ідэалогія працуе спраўна. Вось толькі ў ранейшыя часы мы нашмат больш гаварылі пра якасць. Былі конкурсы, спаборніцтвы, часам — “бойкі” і спрэчкі, але якасць ад гэтага не цярпела. Ды і адказнасць самога мастака была на парадак вышэйшая, чым цяпер! Гледзячы ж на тое, што часам адбываецца ў манументалістыцы сёння, у мяне ўзнікла ідэя, якую, дарэчы, падтрымаў і адзін з вядучых архітэктараў горада: адкрыць спецыяльны фонд для скульптараў, які будзе выплачваць ім ганарары за перамогі ў конкурсах. З адной-адзінай умовай: каб свае праекты, якія перамагаюць і за якія ў поўным аб’ёме выдаецца ганарар, гэтыя дзеячы… не ўвасаблялі ў матэрыяле! Атрымалі свае выйграныя грошы — і супакойцеся! Бо не магу я спакойна глядзець на тое, што паўстала ў нас сям-там літаральна за апошнія дзесяцігоддзі!

Сяргей Кавальчык:

— Дарэчы, а як ты, Канстанцін, ставішся да выкарыстання ў творах мастацтва пэўных атрыбутаў дзяржаўнасці?

Канстанцін Селіханаў:

— Давайце ўспомнім фільм “Ратуючы радавога Райна”: там ёсць амерыканскі сцяг, а разам з ім — цэлы камплект прапагандысцкіх “штампаў”, якія пэўным чынам мяне асабіста раздражняюць. Але там маецца і свая гісторыя, з-за якой я з задавальненнем гляджу гэты фільм: менавіта таму, што яна, а не сцяг, мне цікавая, бо зроблена якасна, на высокім прафесійным узроўні. Не было б яе — нічога не было б.

Сяргей Кавальчык:

— А калі б не было сцяга, ці была б гэтая гісторыя такой самай?.. Іншымі словамі, ці магчымы ў мастацтве патрыятызм “без сцягоў”?

Канстанцін Селіханаў:

— Чаму ж не? Магчымы!

Таццяна Команава:

— Напэўна, самымі яркімі прадстаўнікамі мастацтва “без сцягоў” з’яўляюцца творцы ад музычнага цэха...

(Працяг на стар. 10.)

Квінтэсенцыя патрыятызму:

не быць трэскай, што плыве па цячэнні

Алег Хадоска.

Іван Паўлаў.

Стэла.

(Працяг. Пачатак на стар. 9.)

Канстанцін Селіханаў:

— А я адкажу і пра музычны жанр. Возьмем апошняе “Еўрабачанне”, дзе ўсё раскрылася наўпрост. Перамог хлопчык з Нарвегіі — і адразу ж у нас прачнуўся патрыятызм: усе ўспомнілі, што ён — з Беларусі. Больш за тое: калі б Рыбак браў удзел у нашым, беларускім, адборы на “Еўрабачанне”, ці перамог бы ён? Ды і ў самога спевака была б зусім іншая якасць твору. А яна і ёсць тая галоўная рэч, якая дазволіла нам успомніць, што ён — наш. А колькі такіх нашых браткоў-славян з’ехалі за мяжу і канулі ў невядомасць?.. Але быў і Марк Шагал, які, нягледзячы на тое, што прызналі сваім яго мы не так даўно, займеў славу бліскучага мастака!

Таццяна Команава:

— Тады наступнае пытанне я адрасую Стэле. На ваш погляд, што больш патрыятычна: ехаць туды, дзе ты атрымаеш шырокую вядомасць і магчымасці для рэалізацыі ўласнага таленту, напрыклад, на Захад, ці “апрацоўваць” свой “агарод”: ездзіць па краіне, наведваць райцэнтры, аграгарадкі?

Стэла:

— Я нарадзілася ў Баку, і ў Беларусь прыехала ў 1989 годзе як бежанка. Для мяне гэта было надзвычай трагічна. Але я звыклася з тым, што буду жыць у новай, іншай дзяржаве, і свядома вырашыла прыняць усе яе парадкі. Так, у сваёй сям’і мы шануем і прытрымліваемся нашых бацькоўскіх звычаяў і традыцый, але калі я ў грамадстве — прымаю і паважаю ўсе законы і нормы гэтай краіны. На той момант адной з умоў маёй будучай кар’еры было тое, што я мусіла спяваць на беларускай мове. З гэтага я і пачала: знайшла чалавека, які дапамог мне яе вывучыць. Стала прымаць удзел у конкурсах, перамагаць… І аднойчы мне патэлефанавалі з наступнай прапановай: “Мы праводзім акцыю “Чарнобыльскі шлях — дарога жыцця”. Акцыя гэтая вельмі складаная, таму што на працягу паўтара месяца неабходна будзе ездзіць з канцэртамі па чарнобыльскай зоне”. І я дала згоду, бо хаця б гэтым хацела аддзячыць народу, які прыняў мяне і маю сям’ю. Вось ужо каторы год я езджу ў гэтыя рэгіёны з канцэртамі. І сёлета, калі не змагла паехаць, мне патэлефанавалі, і я пачула ў трубцы: “Дзе ж наша Стэла?” Людзі прызналі мяне “сваёй”, і гэта — дарагога каштуе.

Канстанцін Селіханаў:

— Гэтаму, Стэла, безумоўна паспрыяў ваш унутраны маральны стрыжань.

Стэла:

— Магчыма. Але я ведаю, што далёка не ўсе беларускія артысты, калі ім прапануюць канцэрты ў чарнобыльскіх рэгіёнах, даюць згоду, знаходзячы самыя розныя “аб’ектыўныя” прычыны. Многія проста адмаўляюцца. А я еду, бо бачу вочы людзей, да каго мала хто даязджае, каб даць ім радасць сустрэчы з музыкай. І мне кажуць: вы нам падарылі дзесяць гадоў жыцця! Гэтыя шчырыя словы ўдзячных гледачоў дарагога каштуюць. Калі потым мае калегі, якія, ведаю, адмовіліся ад падобных прапаноў, пытаюцца ў мяне: “Ну, як ты, Стэла, сябе пасля гэтага адчуваеш?”, — я заўсёды адказваю: “Нармальна!” Бо пераканана, што неабходна не гнацца за славай і прызнаннем за сем мораў, а шукаць яго ў сябе дома, ладзіць уласнымі сіламі. І я не стамляюся гаварыць, што любы патрыятызм павінен пачынацца са сваёй “маленькай радзімы” — з сям’і: тут ён узрастае, набірае моцы, і толькі потым можа выпраўляцца ў свет.

Канстанцін Селіханаў:

— Але, калі вярнуцца да Шагала, цікава: калі б ён не з’ехаў, а застаўся тут, у Віцебску, ці стаў бы ён такім знакамітым?.. Хачу сказаць, што ў кожнага — свой лёс, і калі чалавек сапраўды адданы сваёй працы, ён не пакіне творчай дзейнасці, а значыцца, і не пазбавіцца ўнутранага стрыжня, незалежна ад таго, як далёка ад радзімы ён знаходзіцца.

Таццяна Команава:

— Ды толькі для даволі значнай часткі людзей той жа Шагал цікавы не толькі як мастак, але і як чалавек, хто ўсё сваё жыццё заставаўся адданым сынам сваёй зямлі, і родны Віцебск не забываў нават у самыя ліхія часы. Таму, не менш за мастацкія вартасці твораў, мы цэнім яго асабістую патрыятычную пазіцыю, якая выявілася зусім не ў лозунгах, а ў адданым служэнні сваёй творчай музе. І, што цікава, у карцінах гэты сапраўдны патрыятызм самога творцы дае ўяўленне і пра яго Беларусь.

А вось тое, якім часам бачаць аблічча Беларусі сучасныя творцы, у мяне вельмі часта выклікае недаўменне. Не буду гаварыць за ўсіх, але даволі нярэдка даводзіцца сутыкацца з тым, што пад маркай патрыятызму і пашаны да свайго мінулага нам прапануецца набор банальных штампаў пра беднага і няшчаснага памяркоўнага беларуса, які адно толькі і просіць, што лепшае долі. А між тым, варта проста паглядзець наўкол, каб убачыць, што беларусы сёння — актыўная і прагрэсіўная нацыя, якая дынамічна развіваецца і можа шмат што прапанаваць свету. Дык што, атрымліваецца, нашы дзеячы мастацтва проста не жадаюць зірнуць на сябе ў люстэрка і ўбачыць, якія ёсць на самой справе?

Канстанцін Селіханаў:

— Гэта проста нежаданне творча працаваць! Вазьміце большасць сучасных конкурсаў: людзі зазвычай адпраўляюць на іх “штампаваныя” загатоўкі — тое, што праверана часам і што нармальна “праходзіць”. І мала хто рызыкуе прапанаваць штосьці новае, нетрывіяльнае: а раптам хто-небудзь што-небудзь падумае?.. Зрэшты, гэтае пытанне не толькі да мастакоў, але і да тых, хто сядзіць у журы падобных конкурсаў: адзін раз адхіляць прапанову мастака, другі раз, трэці… А яму ж таксама есці трэба. І вось ужо ён прыносіць, скажам, “загагуліну” з арнаментам — каб на сто працэнтаў “прайшло”. І праходзіць!

За гэтым стаіць яшчэ адна праблема: нашы творцы не ставяць перад сабой “задачы максімум”. У выніку на ўзроўні ўнутранага спажывання іх мастацтва можа і “прайсці”, спрацаваць, а вось няхай бы яны паспрабавалі дабіцца гэткага ж эфекту на сур’ёзным міжнародным узроўні! Чаму б, дапусцім, мастакоў, якія ў нас лічацца “зорнымі”, не адправіць хаця б на Венецыянскую біенале — што яны там пачуюць пра якасць сваёй працы?

Сяргей Кавальчык:

— Прабачце, сябры, але ў свой час “Песняроў” адправілі ў Канны, і там яны зрабілі сапраўдны фурор!

Алена Папова:

— Ды толькі такі прэцэдэнт надараецца раз на сто гадоў!

Канстанцін Селіханаў:

— Дык давайце і будзем працягваць працаваць, як мулявінскія “Песняры”! Справа ж не ў тым, у якой краіне ты жывеш. Аляксандр Глеб зрабіў так, што людзі даведаліся пра Беларусь, і ўсё таму, што хлопец проста нармальна гуляе ў футбол! Але дзіўная справа: са спортам у нас усё ў парадку, што ж да мастацтва — сітуацыя не заўжды падобная.

Сяргей Кавальчык:

— Гэта нармальна, таму што спорт аказвае больш масавае ўздзеянне на людзей, чым мастацтва. Вось глядзіце: калі той жа “Зеніт” выйграе Кубак чэмпіёнаў, усе расійскія тэлеканалы пра гэта гавораць. А калі я ці Стэла прывязём Гранпры з якога-небудзь буйнога міжнароднага фестывалю, пра гэта, у лепшым выпадку, напішуць у газеце “Культура” ды згадаюць у афіцыйным дакладзе. З іншага боку, калі мы гаворым пра такія з’явы, як брадвейскі мюзікл ці, скажам, элітарнае французскае кіно, — гэта ўжо культурныя брэнды нацыянальнага характару, якія маюць сваю рэпутацыю і ў якія таксама ўкладаюцца немалыя сумы грошай.

Іншая справа, што творы мастацтва аказваюць сваё ўздзеянне на масы непрамым, ускосным шляхам. Як вызначаў Леў Талстой, ёсць два асноўныя станы грамадства: вайна і мір. Вайна — калі маецца непасрэдная пагроза жыццю і дабрабыту грамадства, і мір — калі яе няма. Зараз з’явіўся трэці стан — крызіс, не важна, эканамічны, тэхнагенны: калі непасрэднай пагрозы нібыта няма, але яна прысутнічае. І ва ўсіх гэтых розных станах грамадства задача твораў мастацтва — аказваць пэўнае ўздзеянне. У той час, як вораг стаіць пад Сталінградам, няма нічога лепшага, чым плакат. А калі мы сёння спрачаемся, што лепш: сацыялізм ці капіталізм, — тут плакатам уздзейнічаць складана, бо павінен адбывацца самастойны выбар. Менавіта таму мне падаецца, што патрыятычны твор мастацтва мусіць дакладна адпавядаць свайму часу пры выбары тых ці іншых сродкаў уздзеяння. Як ні парадаксальна, сёння размаўляць на патрыятычныя тэмы мовай лозунгаў вельмі страшна, бо плакатнасць, наадварот, палохае і адмяжоўвае.

Дарэчы, я сваю першую работу на сцэне Рускага тэатра — булгакаўскі “Бег” — першапачаткова разглядаў як патрыятычны твор. У ім ёсць два паняцці: вялікая Радзіма і малая радзіма. Хлудаў кажа: “Я вярнуся ў Расію”, а Серафіма: “Я вярнуся на Караванную” — маленькую вулачку ў Санкт-Пецярбургу. І геній Булгакава выяўляецца ў тым, што гэтыя два паняцці ён зводзіць да агульнай роўніцы. У выніку, карыстаючыся эзопавай мовай тэатра, мы гаворым пра сям’ю — а маем на ўвазе дзяржаву. І калі чалавек пасля прагляду спектакля, кінафільма, наведвання карціннай галерэі, канцэрта класічнай ці эстраднай музыкі выходзіць з хаця б крышку прыўзнятай самасвядомасцю — гэта і ёсць патрыятызм.

Хачу расказаць пра гастролі ў Волагдзе з маім спектаклем “Адвечная песня”. Я быў здзіўлены: чаму 800 расіян пасля спектакля на працягу пяці хвілін, стоячы, пелі з намі на беларускай мове нашы песні? І зразумеў, які тонкі момант закрануў Купала: мужык (не важна, хто: беларус, рускі — славянін) жыў сабе, працаваў, араў, сеяў… Але раптам прыйшлі іншаземцы, спыніліся ў вёсцы, навесілі на мужыка арэнду. За тое, што ў яго не было грошай, мужыка пасадзілі ў астрог, дзе ён і памёр. А потым паўстаў і сказаў: “Я — чалавек і буду жыць!” І кожны з гледачоў у зале атаясамліваў, мусіць, сябе з героем спектакля, а крыўду ягоную ўспрымаў як сваю асабістую!

Алена Папова:

— Гэта цалкам натуральна: дакладней за ўсё і магутней спрацоўвае архетып. А гэта якраз і ёсць той выпадак!

Алег Хадоска:

— Я ўзгадваю Гётэ, які казаў, што патрыятызму ў мастацтве быць не можа, як не можа быць яго ў навуцы. Я таксама не заўсёды разумею, дзе мяжа паміж патрыятызмам і, напрыклад, местачковасцю? Калі мастак стварае, ён зусім не думае пра тое, што мусіць напісаць так, каб прымусіць моладзь любіць сваю краіну, ці пра што-небудзь іншае падобнага кшталту. Я, да прыкладу, пішу таму, што мяне хвалюе тая ці іншая сітуацыя, мне хочацца нешта выказаць. І калі потым я “трапляю” і людзі выходзяць з залы са слязамі на вачах — гэта цудоўна.

І яшчэ. Паглядзіце на англійскіх фанатаў: нармальныя хлопцы, і калі паставіць іх побач з нашымі ў адной кампаніі — не адрозніш. Твары — такія ж, толькі ў англічан ёсць грошы для таго, каб прыехаць на матч у Мінск. Але ж гэта роўным чынам ні на што не ўплывае, а ўжо на ўзровень іх маральнасці — дакладна!

Сяргей Кавальчык:

— Чытаў у газеце, што пасля перамогі зборнай СССР на чэмпіянатах свету па хакеі ў краіне павялічвалася вытворчасць працы! І гэта не казкі. Вось у чым адрозненне патрыятызму ад нацыяналізму: у тым, што патрыятызм — гэта сацыяльнае пачуццё, у якім праяўляецца любоў да Радзімы, павага да яе традыцый, гісторыі, дня сённяшняга.

Канстанцін Селіханаў:

— Ды не, любоў да Радзімы пачынаецца тады, калі ў цябе ўсё ў парадку: нармальная зарплата, бэнтлі ў гаражы…

Сяргей Кавальчык:

— А як жа тады ставіцца да Шастаковіча, які сваю знакамітую шостую сімфонію пісаў у блакадным Ленінградзе, — ці ўсё ў яго было ў парадку?

Канстанцін Селіханаў:

— Шастаковіч — вялікі творца! Я ж у дадзеным выпадку кажу ў большай ступені пра сябе. Ведаю, што мае равеснікі, з якімі мы разам пачыналі, ездзяць зараз на бэнтлі, а я на іх фоне выглядаю, так бы мовіць, блякла, — сяджу ў сваёй майстэрні і працую…

Сяргей Кавальчык:

— Ну і што? Андрэй Рублёў таксама на бэнтлі не ездзіў, але ж ён ад гэтага горшым не стаў!

Алена Папова:

— А я лічу, што пакуль у нашых маладых дзеячаў культуры і мастацтва не будзе ўласнага маральнага стрыжня і дакладна акрэсленай грамадзянскай пазіцыі, наўрад ці можна ўсур’ёз гаварыць пра творчасць у высокім разуменні гэтага слова.

Алег Хадоска:

— Вось мы прызвычаіліся гаварыць і думаць пра грамадства як пра нейкую чалавечую масу. Але ж у глядзельнай ці ў канцэртнай зале кожны чалавек — гэта не натоўп. Яны ўсе самі па сабе. І кожны з іх самастойна слухае музыку ці глядзіць фільм, і суперажываюць яны самастойна. Тут пачынаюць дзейнічаць абсалютна іншыя законы.

Таццяна Команава:

— У працяг тэмы, закранутай Алегам, хачу звярнуць увагу і на яшчэ адзін аспект. Мы збольшага гаворым пра тое, чым для нас з’яўляецца патрыятызм і як мы яго выяўляем. Але нельга не браць пад увагу шырокае кола людзей, якія чакаюць ад нас творчага патрыятызму, каб з гонарам сказаць: “Гэта — нашы!” Пакуль жа больш падстаў для рэплікі: “Чаму ж нашы так не могуць зрабіць?”

Алег Хадоска:

— Але ж ніякімі дэкларацыямі гэтага не зрабіць. Можна колькі заўгодна заклікаць: “Купляйце беларускае!”, але ніхто не будзе купляць, пакуль не пераканаецца: нашы халадзільнікі, тэлевізары — лепшыя. Так і з мастацтвам: людзі не пойдуць у канцэртныя залы, галерэі ці тэатры, пакуль не ўбачаць якасць. І якасць гэтая — справа мастакоўскага сумлення!

Таццяна Команава:

— І ўсё ж менавіта попыт нараджае прапанову. Калі мы проста будзем ігнараваць айчынны прадукт, не важна, тычыцца гэта эканамічнай сферы ці культурнай, нічога, акрамя раздражнення і апатыі, мы ў адказ не атрымаем. А вось калі кожны з нас, купляючы менавіта беларускае, будзе выказваць тым самым сваю прынцыповую пазіцыю грамадзяніна, неабыякавага да развіцця і нацыянальнай эканомікі, і нацыянальнай культуры, — гэта ўжо будзе якасна іншы, канструктыўны падыход да праблемы.

(Працяг на стар. 15.)

Брама ў Ружаны і... Кападонію

В.Альшэўскі. "Ружаны".

Праект для Магілёўшчыны: "Легенды нашай цывілізацыі"

Не выпадкова канцэпцыя гэтай незвычайнай выстаўкі ўзнікла ў мастака, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Віктара Альшэўскага менавіта ў Год роднай зямлі і 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Назва яе — "Легенды нашай цывілізацыі". Справядліва палічыў творца, што духоўная культура Беларусі ў кантэксце сусветнай культуры мае сваё, асаблівае, нацыянальнае прызначэнне.

Першапачатковая ідэя арганізаваць такую перасовачную, вандроўную выстаўку на малой радзіме мастака — Магілёўшчыне — належыць старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Барысу Батуру. Менавіта з яго лёгкай рукі 30 карцін Віктара Альшэўскага адправілі ў дарогу па рэгіёне — Бялынічы, Шклоў, Крычаў, Асіповічы, Бабруйск, Магілёў, — каб сродкамі жывапісу паказаць землякам прыгажосць зямлі Беларусі, яе багатую спадчыну, каштоўныя жывыя ніці "ўспамінаў пра будучыню", якія моцна звязваюць нас з гісторыяй чалавечай цывілізацыі.

Барыс Батура ў прадмове да каталога выстаўкі В.Альшэўскага падкрэсліў: "Калекцыя карцін "Легенды нашай цывілізацыі" дапамагае больш глыбокаму пазнанню гісторыі Беларусі, нацыянальнай культуры, традыцый. Палотны мастака гарманічна знітоўваюць у мастацкай прасторы далёкія гістарычныя падзеі і сучаснасць, розныя культуры і народы. І нам адкрываецца, якім дыяментам зіхаціць у свеце наша родная Беларусь. Найперш — яе духоўныя скарбы, святыні, помнікі нацыянальнага дойлідства. Перад карцінамі гэтага мастака адчуваеш жывую, непарыўную сувязь пакаленняў. Ахоплівае гарачае жаданне берагчы родны край, памнажаць яго багацці — прыродныя, духоўныя, культурныя. Сэрцам авалодваюць вялікая любоў і замілаванасць да радзімы, і з новай сілай абуджаюцца мужнасць, пяшчота і гонар".

В.Альшэўскі. "Калона Славы. Магілёўская ратуша".

Восенню 2009 года выстаўка будзе экспанавацца ў Нацыянальным мастацкім музеі, і тады мінчане ды госці сталіцы таксама пазнаёмяцца з палотнамі мастака, большасць якіх — новыя, выкананыя ў апошнія два гады, у тым ліку "Нікольская царква ў Магілёве", "Слуцкая брама ў Нясвіжы", "Крыніца", "Ружаны", "Траекторыя", "Калона Славы. Магілёўская ратуша", "Трансфармацыя", "Свята для кветкі", "Партрэт Валянціна Елізар'ева", "Загадкавая Кападонія" і інш.

Б.К.

Шагал, Азгур, Гіпакрат і Гран-пры

В.Магучы. Мемарыяльная дошка Заіру Азгуру.

Чаму скульптар — знаходка для жанчыны?

Нядаўна вядомаму віцебскаму мастаку Валерыю МАГУЧАМУ споўнілася 50 гадоў. Больш за 20 гадоў ён натхнёна працуе ў галіне манументальнай і станковай скульптуры. З'яўляецца аўтарам шэрагу помнікаў, бюстаў і мемарыяльных дошак у горадзе Віцебску, у тым ліку Марку Шагалу, мастацтвазнаўцу Івану Салярцінскаму, філосафу Міхаілу Бахціну, скульптару Заіру Азгуру, беларускай паэтэсе Еўдакіі Лось, а таксама Гіпакрату, Асклепію, Авіцэнну. Ён жа аўтар Гран-пры дарослага і дзіцячага вакальных конкурсаў Міжнароднага фэсту мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску"... Зроблена нямала, а што наперадзе?

— У горадзе мала дэкаратыўна-паркавых скульптур, шмат скверыкаў, якія пустуюць. Калі я гуляю па Віцебску, у розных месцах, уяўляю, як добра глядзеліся б скульптуры ў бронзе, у мармуры. Напрыклад, ля Мастацкага музея, я лічу, вельмі вялікае поле дзейнасці для скульптараў.

— Вы ўжо зрабілі аднойчы герб Віцебска "Ісус Збавіцель", які ў 1997-м годзе быў усталяваны на ратушы, а зараз стаіць у сярэдзіне яе. Ці хочаце стварыць новы герб горада — з анёламі?

— Вядома, я хацеў бы зрабіць гэты герб. Лічу, яго трэба выканаць у некалькіх асобніках. Папершае, ёсць звесткі, што ён знаходзіўся на франтоне ратушы, і там жа мог бы паўстаць і цяпер. Па-другое, можна яго паставіць і дзесьці на адным з уездаў у горад.

— Што для вас у занятку скульптурай самае цяжкае?

— Самае цяжкае — нятворчая частка, адсутнасць неабходных фінансаў. Скульптура — гэта від мастацтва, які больш за іншыя патрабуе аўтарскіх укладанняў сродкаў. Таму часам не можаш давесці работу да таго стану, у якім яе жадаеш бачыць.

Хто такі скульптар? Гэта не адзін чалавек, а — некалькі. Таму што скульптар, акрамя асноўнага занятку, павінен набываць яшчэ масу ўсялякіх дадатковых навыкаў. Трэба адчуваць колер, з'яўляцца добрым графікам, таму што ўсё пачынаецца з эскіза на лісце паперы, трэба ўмець каркас рабіць, зварваць яго, быць яшчэ і архітэктарам абавязкова. Карацей, з гэтага пункта гледжання, кожны скульптар — знаходка для жанчыны: няма такога скульптара, які не ўмее забіць цвік.

— Што наогул можа зрабіць вас шчаслівым?

— Толькі занятак творчасцю робіць мяне шчаслівым, таму што тады я не адчуваю часу.

Алена АЛІМАВА
Віцебск

Іерогліфы у "Абсерваторыі рэчаіснасці"

А.Валігурска. "Іерогліфы".

Гродзенская гарадская выставачная зала прапануе завітаць у "Абсерваторыю рэчаіснасці". Серыю работ пад такой назвай прывезла ў горад над Нёманам творчае аб'яднанне выпускнікоў Акадэміі мастацтваў польскага горада Гданьска.

Ідэя стварэння гэтага незвычайнага аб'яднання нарадзілася пад час рэалізацыі дабрачыннага праекта. Цягам 2004 года група студэнтаў-добраахвотнікаў упрыгожвала фрэскамі сцены новай дзіцячай анкалагічнай бальніцы ў Гданьску. Вопыт сумеснай працы спарадзіў асэнсаванне адзінства творчых поглядаў і даў штуршок да злучэння крэатыўных сіл.

Прадстаўленыя ў "абсерваторыі" палотны ўражваюць не толькі сваімі велізарнымі памерамі, але і яскравасцю фарбаў, спалучэннем, здавалася б, неспалучальных прадметаў. Серыі карцін "Без назвы" вяртаюць нас да ўнутраных уражанняў, прымушаючы задумацца, параўнаць сваё светаўспрыманне з аўтарскім. Некаторыя з прадстаўленых работ можна было б назваць "звышрэалістычнымі": настолькі дакладна, часам нават фатаграфічна, адлюстраваны ўсе дэталі.

Тут шмат філасофскіх матываў: разважанне над марнасцю быцця ў серыі "Чэрап", спроба здабыць "Філасофскі камень" ці напіцца "Вады жыцця".

На сценах, побач з выявамі такіх вечных жаночых вобразаў, як Божая Маці, Ева, Венера, — партрэты звычайных сучасных жанчын. Шматлікія дэталі, на першы погляд, бессістэмна раскіданыя прадметы вакол фігуры чалавека, нібы іерогліфы, — знаёмыя і загадкавыя адначасова. Яны запрашаюць нас прачытаць і зразумець тое, з чаго складаецца рэчаіснасць для аўтара.

Аляксандра ДУБРАВІНА
Гродна

АЗЁРНЫ КРАЙ – КАЛЫСКА БЕЛАРУСІ НАШАЙ

ТВОРЧАЯ СПРАВАЗДАЧА ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ, прысвечаная 65-ай гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

Фота Юрыя ІВАНОВА





Калі канцэрт — гэта, часцяком, сустрэча з даўно вядомым і таму любімым, дык конкурс — заўсёды адкрыццё. Ці хаця б спадзеў на адкрыццё чагосьці пакуль невядомага, але выбітнага. Калі ж ведаеш, што адбор вёўся па ўсёй краіне, і было праслухана ледзь не дзве тысячы прэтэндэнтаў, міжволі ўзгадваеш гісторыю Папялушкі: уладальніцу чароўнага пантофліка шукалі папраўдзе сярод усіх-усіх-усіх. Таму і спадзяванні на праект "Новыя галасы Беларусі", які быў ініцыяваны Прэзідэнтам краіны, былі параўнальныя хіба з фіналам казкі. Але да фіналу яшчэ далёка — ёсць час ацаніць самі пошукі. Тым больш, што мне давялося паглядзець не толькі тэлеверсію выступлення з Прэзідэнцкім аркестрам адабраных спевакоў, але і само выступленне, што праходзіла ў Палацы Рэспублікі.

Фота www.ont.by

Новыя "старыя" галасы

Агульнае ўражанне ад канцэртнай версіі было вельмі добрым. "Безгалосых" не назіралася, асабліва-га "фальшу" не адчувалася, нумары — стылёва разнастайныя, ды яшчэ і большасць з іх — харэаграфічна аздобленыя. Сярод 25-ці прэтэндэнтаў прысутнасць літаральна адзінак здавалася "неабавязковай", а два дзесяткі спевакоў, з якіх двое сёстраў выступалі дуэтам, — як на падбор: галасістыя, прыгожыя, маладыя. І ўсе "прымяралі" на сябе "старыя песні" — і пра галоўнае, і пра асабістае: моладзі прапанавалі праспяваць старадаўнія рамансы, хіты беларускай, савецкай, замежнай эстрады, прычым без аніякіх пераасэнсаванняў музычнага матэрыялу. У выніку атрымалася гэткае "караоке", а часам і сапраўдная імітацыя вядомых спевакоў, калі пераймаліся не толькі спеўныя штрыхі, але і самі тэмбравыя адценні голасу зорных знакамітасцей...

Што да тэлеверсіі, то "незацікаўлены" экран не мог схаваць ні выраз вачэй, ні стан душы (а многія пачувалі сябе няўпэўнена), ні дробныя інтанацыйныя хібы, ні праславуты "супрамат" — узаемаадносіны спевакоў і прапанаванага ім музычнага матэрыялу.

Ці ўсе здалі іспыт па супрамаце?

У такіх умовах яшчэ больш востра паўстала вечная праблема творчай індывідуальнасці. Існуе навуковая тэорыя, паводле якой нараджэнне чалавечых талентаў размеркавана па геаграфічным прынцыпе абсалютна раўнамерна. Можа, так яно і ёсць. Тым больш, што, паводле яшчэ адной навуковай тэорыі, абсалютна ўсе дзеці — таленавітыя, толькі кожны — у чымсьці сваім. Але ж як выявіць тую індывідуальнасць? Як напоўніцу раскрыць сваё прызначэнне? Гэта застаецца таямніцай — з мноствам прыкладаў у абодва бакі. Які ж з іх выбралі канкурсанты?

Мала "прымерыць" прыгожую "песню-сукенку" — трэба яшчэ адчуваць яе "сваёй", роднай. Такое ўзаемадапаўненне выканаўцы і твора атрымалася ў нямногіх. Мінчанка Марта Голубева, якой дасталася песня з рэпертуару Алы Пугачовай, праспявала яе, бы ўласнае прызнанне. Яно і не дзіва: за плячыма 18-гадовай дзяўчыны — 2-гадовая канцэртная "школа" ў складзе ансамбля "Верасы" (праўда, такі ж сцэнічны стаж не дапамог яшчэ адной салістцы "Верасоў" — Вользе Сансевіч: можа, таму, што ёй давялося "кланіраваць" Машу Распуціну). У параўнанні з такімі спрактыкаванымі спевакамі сёлетні выпускнік Лідскага музычнага вучылішча Аляксандр Маркевіч — зусім "зялёны пачатковец", хаця за яго плячыма лаўрэацтвы на тэлепраекце "Зямля пад белымі крыламі", Рэспубліканскім конкурсе "БелАЗаўскі акорд". Здавалася б, хіба можна ў 19 гадоў асэнсаваць пакладзены ў аснову песні "Зімняя ноч" знакаміты верш Барыса Пастэрнака? Бо ён увесь пабудаваны на шматслойных асацыяцыях: свяча як сімвал духоўнасці, завея — знак рэпрэсій, каханне як скрыжаванне лёсаў... Тым не менш, малады спявак змог знайсці ўласную нотку — можа, яшчэ таму, што і сам піша песні? Гэтак жа "не згубіўся" сярод вялікіх тэнараў свету 20-гадовы Еглазар Фарашан з Веткі: яго цудоўныя спевы папраўдзе гучалі годным вакальным прынашэннем "Памяці Каруза". Запомнілася і 24-гадовая міжнародная лаўрэатка Юлія Воляк з Калінкавічаў, якой было прапанавана "Адажыо" Альбіноні (перашкаджала хіба адценне засяроджанасці на твары).

Увогуле, гэтак жа выглядалі многія канкурсанты. Можа, у тым выявілася іх уяўленне пра "жорсткасць спаборніцтва"? А вось 19-гадовы Генадзь Чарняўскі з Івянца знайшоў неабходныя фарбы смугі і пяшчоты, нягледзячы на надзвычайную складанасць лучанкоўска-багдановічаўскай песні "Вераніка", ды яшчэ ў аранжыроўцы, дзе аніяк не "прапісана" вакальная партыя, і салісту даводзіцца літаральна блукаць па мудрагелістых рытмаінтанацыйных "лабірынтах".

"Майстар-класам" для канкурсантаў стала выступленне Аляксандра Рыбака, які ўдзельнічаў у працы журы. Уразіла не толькі яго пераможна-"Еўрабачанная" "Казка", што прагучала ў новай выканальніцкай версіі, але і наша знакамітая "Купалінка". Але цудоўная фінальная песня Ізмаіла Капланава, якую з запалам спяваў "зводны хор" канкурсантаў, не завяршыла спаборніцтва: наперадзе — другі тур, што чакаецца ў чэрвені. А пераможцы выступяць потым з Прэзідэнцкім аркестрам Беларусі на "Славянскім базары ў Віцебску".

На здымку: удзельнікі праекта "Новыя галасы Беларусі".

Спакушэнне далікатнасцю

Нікога не здзівіш тым, што вакалісты, заканчваючы Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі, атрымліваюць у якасці іспыта вядучыя партыі ў оперных спектаклях: на тое яна і оперная студыя. Сёлета ўвага пастаноўшчыкаў спынілася на "Дон Жуане" В.-А. Моцарта — нішто сабе рэпертуарчык! Бо гэты твор (чаго каштуюць у ім хаця б найскладаныя ансамблі) нават ад загартаваных прафесіяналаў патрабуе не абы-якіх намаганняў, а тут — студэнты розных курсаў.

"Дон Жуан" калісьці ішоў у нашым тэатры, але ж увогуле на савецкай і постсавецкай прасторы да гэтага сусветнага шэдэўра звярталіся не так ужо і часта: ну чаму можа навучыць моладзь усім вядомы распуснік, якога кампазітар, насуперак шматвяковай традыцыі, увасобіў не такім ужо і адмоўным персанажам? Нездарма яго бурлівая арыя з шампанскім у пэўныя часы ўвогуле ўспрымалася "недабранадзейнай".

Як бы тое ні было, а цяперашняя студэнцкая пастаноўка стала заклікам да высакароднасці, далікатнасці, інтэлігентнасці і папраўдзе высокага прафесіяналізму. Бо аднойчы ўзяць вяршыню можна і на "голым энтузіязме", на хвалі натхнення, прыроднай адоранасці, а трымаць тую планку ў якасці стартавай — гэта і ёсць прафесіяналізм. Нельга сказаць, каб склад удзельнікаў паказаных двух спектакляў быў цалкам зорным. Але сярод звыкла добрых выканаўцаў аказаліся і папраўдзе адметныя.

Ракавога спакушальніка жанчын давялося ўвасабляць даволі сціпламу ў жыцці пяцікурсніку Канстанціну Батурыну. Яго герой атрымаўся не гэткім мачо, а надзвычай галантным, далікатным рамантыкам з псіхалогіяй цікаўнага падлетка, які, адчуваючы сябе ўсеагульным улюбёнцам, не супраць крыху пасвавольнічаць. Мяккі, пяшчотны барытон, часам з лісліва абаяльным прыдыханнем, надзвычайная музычнасць, калі да кожнай фразы артыст ставіцца, быццам да сваёй каханай, шчырая, а не найграная пачцівасць у манерах — і хрэстаматыйна вядомая гісторыя заззяла зусім іншымі фарбамі.

Побач з такім Дон Жуанам яго служка Лепарэла ўспрымаўся незадачлівым "выхавацелем", які наўпрост не ведае, як яму справіцца з усё новымі фантазіямі "распешчанага дзіцяці". Бліскучым выканаўцам гэтай характарнай партыі "бурклівага старога" стаў Яўген Глебаў (цёзка, але не сваяк знакамітага кампазітара). Не маючы музычнай адукацыі і толькі пасля 30-ці гадоў вырашыўшы прафесійна займацца спевамі, ён скончыў падрыхтоўчае аддзяленне БДАМ і ўжо некалькі гадоў запар паспяхова ўдзельнічае ў пастаноўках опернай студыі — на вольных пачатках, без адрыву ад асноўнага месца працы. А яшчэ — увесь час займаецца самастойна, з канцэртмайстрам, упэўнена пераадольваючы прыступку за прыступкай на шляху да дасканаласці.

А як "вырасла" за апошні час Алена Таболіч! Скончыўшы Акадэмію музыкі, яна спявае ў хоры нашага Вялікага тэатра і працягвае супрацоўніцтва з опернай студыяй. Яркае, палётнае сапрана, выразнасць вакалу як у гучных, так і ў ціхіх, кранальных спевах зрабілі яе Донну Анну сімвалам сапраўднай высакароднасці і чысціні.

Збалансавана, не заглушаючы салістаў, гучаў студэнцкі аркестр, якім кіравалі нядаўнія выпускнікі БДАМ, а цяпер дырыжоры нашага Вялікага тэатра Іван Касцяхін і Андрэй Іваноў. А ўвесь спектакль пакінуў надзею на далейшыя сустрэчы і з маладымі артыстамі, і з новымі пастаноўкамі опернай студыі — тым больш, што праз год там павінны паказаць свае работы і студэнты класа опернай рэжысуры.

На здымках: Я.Глебаў (Лепарэла), К.Батурын (Дон Жуан); А.Таболіч (Донна Анна).

Квінтэсенцыя патрыятызму:

не быць трэскай, што плыве па цячэнні

(Працяг. Пачатак на стар. 9 — 10.)

Але ёсць яшчэ адна вельмі істотная рэч, якая займае пэўнае месца ў сучаснай культуры, — ідэя нацыянальнай адметнасці, пад якую нярэдка мы спісваем нашы пралікі і няўменні. Таму і заклікі да выхаду на рэальны ўзровень канкурыравання, агучаныя Канстанцінам, аказваюцца без адказу. Узгадваю інтэрв'ю ў нашай газеце з Максімам Петрулём, дзе ён, вярнуўшыся з Пекіна, распавядаў, што вялікім мінусам, але, адначасова, і вялікім плюсам для беларусаў з'яўляецца тое, што пра нас у свеце няма пэўнага стэрэатыпу, які мы павінны падтрымліваць ці абвяргаць, і з гэтай прычыны мы можам быць якімі пажадаем. І гэта, напэўна, яшчэ адна з задач?

Канстанцін Селіханаў:

— На мой погляд, важна не проста сфарміраваць нейкі адзін агульны стэрэатып, а стварыць для людзей магчымасць выбару таго ці іншага культурнага прадукту. У нас жа, па сутнасці, гэты выбар адсутнічае: прапануецца адно толькі мас-культура, прычым далёка не заўсёды высокай якасці. Возьмем хаця б радыё: хто з прысутных тут слухае FM-станцыі?

Іван Паўлаў:

— Я слухаў, пакуль не было тэлевізара на кухні.

Канстанцін Селіханаў:

— Але ж гэта проста немагчыма слухаць: усе станцыі — аднолькавыя! А чаму? Чаму мы не можам выбіраць? Тое самае і паўсюль. Школьнікам, замест таго, каб даць выбар і падштурхнуць іх да ініцыятывы, проста ўбіваюць у галаву: “Ведай “таго” ці “іншага”!” Дарэчы, чаму практычна ўсе ведаюць з мастакоў Шышкіна, Левітана? Ды таму, што ў дзяцінстве ў нашых падручніках былі ўклейкі з іх карцінамі: памятаеце, — “Весна”, “Грачи прилетели”? Але ж ці ў нас няма сваіх цікавых мастакоў? Чаму б не зрабіць шэраг уклеек, якія давалі б дзецям уяўленне пра сучасную беларускую выяўленчую культуру?

Алег Хадоска:

— Але ж ноты ў падручнік не ўклеіш…

Канстанцін Селіханаў:

— А вы проста заходзьце ў клас, прывязвайце іх да парт і прымушайце слухаць: яны будуць вас за гэта ненавідзець, але дакладна запомняць!

Стэла:

— Зрэшты, калі казаць пра музычную культуру — тут тая ж самая бяда: такое адчуванне, быццам зусім няма сучасных кампазітараў! Раскрываю падручнік па музыцы і бачу, што там — тыя ж імёны і творы, якія вывучалі не адно дзесяцігоддзе.

Канстанцін Селіханаў:

— Цудоўная рэч — тэлебачанне: уключыў, пару хвілін паглядзеў, і, калі не падабаецца, можна пераключыць на іншы, больш цікавы канал. А ў манументалістыцы, на жаль, няма такой “кнопачкі”, якую можна націснуць: стаіць пасярод вуліцы якая-небудзь бронзавая дзесяціметровая раскірака, і, колькі ні старайся, ніяк яе не “пераключыш”!

Стэла:

— Але часам здараецца, што цябе “выключаюць” проста так — без асаблівых на тое прычын, а таму, што трэба проста “скараціць”. У мяне быў такі выпадак, калі адзін паважаны чалавек сказаў, што можна скараціць канцэрт, калі выкрасліць мяне і яшчэ чалавек пяць — самых моцных. А я ў той дзень атрымлівала прэмію камітэта па справах моладзі і проста не магла не выйсці на сцэну. Дык вось, калі гэта высветлілася, той чалавек, які адным словам “параіў” ад мяне пазбавіцца, пачаў біць сябе ў грудзі і казаць: “Мяне выкрасліце — Стэлу пакіньце!”... Мне пашанцавала, што рэжысёр канцэрта аказалася жанчынай прынцыповай і патрабавальнай, а будзь на яе месцы хто іншы — выкраслілі б і не заўважылі.

Канстанцін Селіханаў:

— Тое, што вы выйшлі ўсё ж на сцэну і спелі — гэта ўжо добра. І я ў гэтым сэнсе гатовы прымаць удзел ва ўсіх конкурсах, лезці паўсюды, бо разумею, што не магу не браць удзелу ў гэтым працэсе, — вось гэта і ёсць мой патрыятызм.

Іван Паўлаў:

— Мне падаецца, патрэбна вызначыцца, чаго жадаем дамагчыся гэтым сваім патрыятызмам. Гонару, каб, прыязджаючы ў іншую краіну, мы маглі пахваліцца сваёй радзімай, — гэта адна задача, дарэчы, не такая ўжо і невырашальная. Калі ж мы ўвогуле жадаем быць нумарам адзін ці, хаця б, у першай дзесятцы, — то нам давядзецца папацець ва ўсім! Але ж ва ўсім быць першымі мы не зможам! Дык давайце паглядзім на тых жа кітайцаў: думаю, якраз яны першымі выберуцца з крызісу, бо калі ты ў Кітаі хочаш зарабляць — у цябе ёсць для гэтага ўсе магчымасці. Таму яны і ідуць у сваім развіцці такімі гіганцкімі крокамі.

Дарэчы, назавіце за мяжой Беларусь — і адразу ўспомняць нашы трактары, халадзільнікі і, асабліва масквічы пра гэта кажуць, — надзвычайную чысціню нашых гарадоў.

А што да сімвалаў, дык самая яркая іх праява ў скульптуры натрапілася мне ў Бабруйску. Калі я ўпершыню прыехаў у гэты горад, ведаеце, куды мяне пацягнулі? Да бронзавага бабра! Маўляў, дакраніся да яго — і будзе табе шчасце. І я не ведаю ў Бабруйску іншых помнікаў, акрамя скульптуры гэтага бабра! Я пытаў: дзе ж у вас Ленін? Забудзь пра яго, казалі мне, — вунь бабёр стаіць!

Сяргей Кавальчык:

— Думаю, што гэткая папулярнасць бабра звязана з тым, што ідэя яго з'яўлення была з самага пачатку блізкая жыхарам горада. І, як любая здаровая ідэя, вырасла знутры і была падхоплена натуральным чынам. Што б мы ні казалі, але такі шлях “з народу” і ёсць найвышэйшая форма патрыятызму: калі людзі самі прапагандуюць каштоўнасці, важныя не толькі для ўласнага дабрабыту, але і для сваёй супольнасці, для грамадства, у якім яны жывуць.

Алег Хадоска:

— У прынцыпе, любы твор мастацтва — музыка, спектакль, фільм, карціна, — калі ён зроблены цікава, таленавіта і прафесійна, сам па сабе ўжо патрыятычны, незалежна ад таго, ці будзе там дзяржаўны сцяг, беларуская мова і гэтак далей.

Алена Папова:

— Ведаеце, многія з тых, хто аб'яўлялі сябе вялікімі патрыётамі, даўно ўжо з'ехалі адсюль: яны цудоўным чынам абрабляюць чужыя палеткі, у дзяцей пусцілі чужую кроў… А я лічу, што гэтыя пошукі патрыятызму патрэбна пачынаць з сябе, са свайго ўласнага маленькага прыватнага жыцця.

Канстанцін Селіханаў:

— Дарэчы, у тым жа Беластоку ёсць сапраўдныя патрыёты з нашых. І патрыятызм у такіх людзях, магчыма, жыве таму, што, насуперак нейкім аб'ектыўным рэчам, яны працягваюць захоўваць нашу культуру і нейкую містычную сувязь са сваёй радзімай.

Алена Папова:

— Скажыце мне, калі ласка, якую культуру яны захоўваюць? Добра, калі не забываюць беларускую мову і размаўляюць на ёй, — тады, згодная.

Стэла:

— А вось мы ў сям'і, дарэчы, не ставім на першае месца ў якасці абавязковай умовы — неабходнасць размаўляць на сваёй мове. Але ж гэта не замінае нам захоўваць нашы нацыянальныя традыцыі!

Алена Папова.

Канстанцін Селіханаў.

Алена Папова:

— У вас, Стэла, крыху іншая сітуацыя: вашы традыцыі развіваліся шмат у чым аўтаномна і не мелі такога моцнага знешняга ўплыву, як нашы. У нас жа ўвогуле славянскія традыцыі ва ўсе часы былі блізкія паміж сабою. Не варта забывацца і пра дзесяцігоддзі савецкай улады, якая ўсё надзвычай моцна перамяшала і знівелявала. Яна пазбавіла чалавека вельмі многага. Я не хацела б разглядаць нацыянальныя традыцыі на ўзроўні дранікаў. Ці можа, людзі за мяжой для таго, каб захоўваць традыцыі, вешаюць лапці на сцяну?

Я думаю, што нашмат больш вызначальным з'яўляецца паняцце нацыянальнага характару. Заўсёды буду гэта адстойваць, бо разумею, што беларускі чалавек — гэта не рускі і не ўкраінец. Ён — носьбіт асаблівай, сваёй уласнай ментальнасці, якую не зблытаеш ні з якой іншай. Вось дзе жыве дух народа — там, дзе разам з'ядноўваюцца характар, глеба, прырода!

Таццяна Команава:

— Вось вы пра гамункулаў кажаце, а я ўзгадваю вашы п'есы, у якіх заўсёды прысутнічае сям'я і момант вяртання героя ў да яе.

Алена Папова:

— Не, Таццяна, гэта не сям'я. Гэта — людзі. Бо што такое сям'я?

Сяргей Кавальчык:

— Як — што? Гэта і ёсць людзі пад адзіным дахам, якія сабраліся не прымусова, а згодна з уласнымі перакананнямі.

Алена Папова:

— Не толькі, а і ў выніку пэўнага лёсу.

Сяргей Кавальчык:

— А мне ў дачыненні да пытання захавання традыцый узгадаліся гастролі ў Іркуцку, дзе, як вядома, маецца магутная беларуская супольнасць. Там існуюць беларускія вёскі, дзе яны стараюцца захоўваць традыцыі сваёй зямлі. Вы не ўяўляеце тыя вочы, якія я бачыў: з усёй Іркуцкай вобласці з'язджаліся людзі, каб паглядзець на нас!

Таццяна Команава:

— На “жывых” беларусаў?

Сяргей Кавальчык:

— Так, на сапраўдных беларусаў з той радзімы, якой яны мо ніколі і не бачылі, а ведаюць толькі па расповедах. І гэтыя людзі, што размаўляюць на беларускай мове, прыходзілі ў залу і глядзелі на нас, нібы на багоў, якія спусціліся з Алімпа. З гэтага ў мяне склалася ўражанне, што яны там ставяцца да сваёй нацыянальнай спадчыны з большай трапятлівасцю, чым мы, жывучы тут.

Канстанцін Селіханаў:

— Дык што, для таго, каб пачаць трапятліва ставіцца да сваёй радзімы, неабходна ехаць у Іркуцк?

Сяргей Кавальчык:

— Іронія — іроніяй, а вось Гогаль, як ні дзіўна, напісаў свае лепшыя творы, знаходзячыся ў Італіі.

Іван Паўлаў:

— Нядаўна, дарэчы, паглядзеў новую экранізацыю “Тараса Бульбы” і проста жахнуўся: аказваецца, ва ўсёй гогалеўскай гісторыі, наскрозь прасякнутай ідэямі славянскай моцы, патрыятызму і велічнасці чалавечага духу, аўтары фільма чамусьці праявілі адно толькі... марадзёрства! Чым жа тут ганарыцца?

Алена Папова:

— Хачу нагадаць, хаця думаю, што вы з гэтым фактам знаёмы: Гогаль стварыў “Дзіканьку”, “Міргарад” і многія іншыя свае творы ў дваццаць тры гады! Уяўляеце, ён ужо да трыццаці гадоў усё напісаў і пачаў хварэць!

Таццяна Команава:

— Вось Іван згадаў “Тараса Бульбу”, а мне прыйшоў на памяць іншы фільм, які нядаўна выйшаў у пракат: зняты расіянамі паводле аповесці “Пайсці і не вярнуцца” Васіля Быкава — “Вырачаныя на смерць”, дзе героі, якіх іграюць расійскія акцёры, размаўляюць на беларускай мове. І — надзвычай дакладна і тонка ўвасабляюць на экране беларускі характар.

Канстанцін Селіханаў:

— Прабачце за рытарычнасць, але чаму ж пра наша, уласнае, мы самі не здымаем так?

Сяргей Кавальчык:

— А я б прапанаваў паспрабаваць пайсці шляхам Курасавы, які зрабіў фільм па матывах шэкспіраўскага “Караля Ліра”, адаптаваўшы матэрыял да японскай ментальнасці.

Іван Паўлаў:

— Ды бралі ўжо шмат разоў! Але адразу ж узнікае мноства закавырыстых пытанняў. Да прыкладу, мы здымалі “Глыбокую плынь” пра партызан. Я з задавальненнем забыў бы пра гэтую сваю рэжысёрскую работу, бо яе стылістыка — нібыта з 1975 года. Адзіны “плюс” — у тым, што мы, на шчасце, не атрымалі ад ветэранаў на арэхі: яны проста не прывыклі да сучаснага мантажу, і таму некаторыя моманты нам даравалі. А калі пачынаеш капаць гістарычны матэрыял глыбей, аказваецца — усё зусім не так проста.

Таццяна Команава:

— Прасцей у чарговы раз выдаць архетып, які будзе проста працаваць і пазбавіць нас неабходнасці напружвацца?

Канстанцін Селіханаў:

— Дзіўная рэч: мы ўжо загадзя баімся і з самага пачатку не хочам браць на сябе адказнасць. А, між тым, Таркоўскі, нягледзячы ні на што, здымаў свае фільмы — не спыняў работы.

Алена Папова:

— Але ў яго была каласальная падтрымка.

Канстанцін Селіханаў:

— Пра якую падтрымку мы гаворым, калі чалавек здымаў кіно раз на пяць гадоў?

Іван Паўлаў:

— Усё роўна, што даць скульптару замест каменя кавалак пенапласту: як ён будзе ваяць?

Канстанцін Селіханаў:

— Добра, не будзем здымаць чарговую “Анастасію Слуцкую”, а возьмем гісторыю якога-небудзь нашага сучасніка. Не трэба замахвацца на Галівуд, вазьміце, як Ларс фон Трыер, адну камеру на плячо і наперад — зараз шмат такіх фільмаў.

Стэла:

— А чым не паказальная гісторыя з бамжом, які сам зняў фільм і нават атрымаў за яго ў Каннах прыз?

Іван Паўлаў:

— Якраз з гэтым бамжом усё не так проста — перад намі хітрая піар-акцыя: нават для таго, каб проста паехаць у Каны, патрэбны грошы. Я ўжо не кажу пра мноства іншых момантаў. Можна было б успомніць і аб прадуманай рэкламнай кампаніі “Ведзьмы з Блэр”, і шмат пра што яшчэ: варта толькі капнуць глыбей — і ўсплывае шмат цікавых падрабязнасцей і дэталей.

Алег Хадоска:

— Але ж менавіта з іх, гэтых дэталей, і складваецца агульнае цэлае.

Канстанцін Селіханаў:

— Заўважыў цікавую тэндэнцыю: у нас ёсць схільнасць многае ў жыцці адкладваць “на потым”. Асабліва ярка гэта назіраю ў мастакоў старэйшага пакалення. Ім ужо за шэсцьдзесят і за семдзесят, а такое адчуванне, нібыта яны збіраюцца жыць вечна: маўляў, зараз хуценька зраблю нешта просценькае, а потым як разгарнуся… А дзе тое “потым”?

Таццяна Команава:

— А можа нам проста не хапае прадуманага піару? Вось калі б мне расказалі, што ёсць у нас такі незвычайны кампазітар Алег Хадоска, які адной левай за паўтары гадзіны, едучы ў электрычцы, піша сімфонію, і дадалі да гэтага яшчэ пару-тройку эфектных гісторый, я б, верагодна, кінулася шукаць, дзе можна паслухаць яго музыку. Ды толькі вам, творцам, не сорамна хацець для сябе папулярнасці такім чынам?

Канстанцін Селіханаў:

— Часам гэта нават і карысна. У нашай сітуацыі ўсе сродкі добрыя, — я адказваю за свае словы. Бо сёння мы настолькі заглыблены ў свой так званы андэграўнд, які на паверку бывае даволі смешным, што часам нават скандал робіць добрую справу.

Іван Паўлаў:

— А колькі нашых засталося ў ценю з-за таго, што не надарылася “тая самая” хвіліна? Тут вельмі вялікую ролю адыгрывае Яго Вялікасць Выпадак. Вось зірнуў у свой час Тураў на мяне — і паверыў, хаця што я тады разумеў у кіно?

Сяргей Кавальчык:

— Скажы яшчэ, што ты ўвогуле не ведаў, хто такі Тураў.

Іван Паўлаў:

— Чаму ж, ведаў! Але не па яго вялікіх фільмах, а па “Кропцы адліку” — усе мы тады трызнілі каратэ…

(Заканчэнне на стар. 16.)

Квінтэсенцыя патрыятызму:
не быць трэскай, што плыве па цячэнні

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 9 — 10, 15.)

Алена Папова:

— Шчаслівы выпадак — гэта добра, але, акрамя яго, існуе пэўная агульная тэндэнцыя...

Канстанцін Селіханаў:

— ...А яшчэ — адсутнічае паралельны працэс, альтэрнатыўны падыход да мастацтва і погляд на яго.

Алена Папова:

— Так, нам толькі веславаць… Рабі, што можаш, а Бог потым вызначыцца, — іншага не дадзена.

Іван Паўлаў:

— І я нават вызначыўся для сябе, у якім накірунку патрэбна рухацца. Мне вельмі падабаецца думка з булгакаўскага “Сабачага сэрца” наконт таго, з чаго пачынаецца разруха: памятаеце — з “міма унітаза”. Вось ты ідзеш міма сметніцы, а нечакана дунуў вецер, так што твая паперка ці недакурак не трапілі ў яе, — спыніся, нахіліся, падымі і кінь яшчэ раз, ужо ў сметніцу! Калі гэткую дробязь зробіць кожны — мы прасунемся ой як далёка! І тады не толькі ў патрыятызме — ва ўсім будзем на першым месцы!

А, з іншага боку, нядаўна даведаўся, што ў Расіі на аднаго чалавека ў год вырабляецца 18 літраў абсалютнага алкаголю. І задумаўся: мы тут на вялікія творы замахваемся, а асноўнай масе народу, атрымліваецца, гэта нават не патрэбна?..

Алена Папова:

— Разумееце, Іван, але ж так заўсёды было ў сусветнай гісторыі.

Іван Паўлаў:

— І што, мы не прасунуліся з тых часоў ні на крок наперад?

Канстанцін Селіханаў:

— Прывяду цікавы прыклад, як у свой час было ў Амерыцы. У пяцідзесятыя гады перад ЦРУ была пастаўлена задача змяніць вобраз сярэдняга амерыканца — ператварыць яго ў высокаадукаванага культурнага інтэлектуала. І — узнік абстрактны імпрэсіянізм, міжнародная мастацкая плынь, якой не было на той момант ні ў Парыжы, ні ў Лондане, з’явіўся той самы знакаміты поп-арт. І сёння ва ўсіх самых прэстыжных музеях свету, у тым ліку і ў французскім Музеі сучаснага мастацтва, — творы Эндзі Уорхала.

Таццяна Команава:

— А я лічу, што сапраўднага творцу атрымаць “па замове” немагчыма. І мяне здзіўляе, што, замест непасрэднай творчай дзейнасці, некаторыя нашы мастакі лічаць “добрым тонам” патрабаванне для сябе спецыяльных умоў і гарантаванага дзяржаўнага фінансавання. Няўжо сапраўды, каб гаварыць мовай мастацтва пра набалелае і рэалізоўваць уласныя творчыя задумы, неабходна, каб нехта збоку гэта ўсё аплачваў?

Канстанцін Селіханаў:

— Ды не ад сёння вядома, што грошы нічога не змяняюць — талентаў ад гэтага болей не становіцца. І грошы — зусім не гарантыя поспеху. Яны могуць толькі падтрымаць таго, каму неабходныя дадатковыя магчымасці.

Таццяна Команава:

— Разумею, вам — скульптару, кінарэжысёру — патрэбны пэўныя сумы на вытворчасць. Але пра якія грошы ідзе гаворка ў дачыненні да таго ж кампазітара, у чым арсенале — нотная папера і канцылярскія прыналежнасці?

Канстанцін Селіханаў:

— Як так? Кампазітару патрэбны грошы нават для таго, каб з’ездзіць у Парыж і проста пасядзець там. А потым, вярнуўшыся, напісаць сваю сімфонію. Гэта — момант натхнення, а ў гісторыі пра тое, што можна займацца творчасцю пры лямпе ці на каленях, я асабіста не веру: усё гэта не працуе.

Іван Паўлаў:

— Ведаеце, які, на маю думку, самы геніяльны твор? “Залатая рыбка” Пушкіна! Вось ён, класічны сцэнарый: хап, хап, хап, а потым — усё, “разбитое корыто”!

Сяргей Кавальчык:

— Калі гаварыць пра пошукі моманту творчага натхнення, у кожнага чалавека гэты працэс — індывідуальны, і толькі ён сам ведае, як гэтага стану дасягнуць. Някрошус, да прыкладу, закрываецца на тры месяцы на лецішчы і так стварае свае спектаклі. А вось мне, да прыкладу, патрэбна пару дзён поўнай бяздзейнасці для таго, каб дабіцца пэўнай злосці, сказаць сабе: жыццё праходзіць, а ты… І потым я магу тыдзень працаваць, нават без сну. Аднаму, магчыма, сапраўды патрэбна з’ездзіць у Парыж, а другому дастаткова будзе і Жабінкі.

Зноў вяртаемся да таго, што мастаку ўласцівы неспакойны стан духу. І ў час, калі з ростам эканомікі і дабрабыту грамадства захоўваць гэты неспакойны стан душы становіцца ўсё больш складана, мы павінны, і тое — наша задача, выстаўляць “маякі” там, дзе парушаецца духоўнасць, сігналіць грамадству сваімі творамі.

Канстанцін Селіханаў:

— Усё гэта — звычайныя лозунгі.

Сяргей Кавальчык:

— Мы не можам проста назіраць за тым, што і як адбываецца навокал.

Канстанцін Селіханаў:

— Але мы нікому нічога не павінны! Гэта калі чыноўнікі на якім-небудзь пасяджэнні кажуць: мы павінны, — яны і сапраўды павінны, бо да гэтага іх абавязвае пасада.

Сяргей Кавальчык:

— Але ж калі творца не жадае палепшыць грамадства, у якім жыве, то ён проста трэска, што плыве па рацэ і сузірае берагі, — не болей.

Алена Папова:

— А чаму б і не? У жыцці ёсць многа цікавага, у тым ліку — унутраны пошук.

Сяргей Кавальчык:

— Нічога гэтага я не адмаўляю, і кажу, у першую чаргу — пра тое, што творца не мусіць быць унутрана заспакоеным.

Канстанцін Селіханаў:

— Але ж мы жывём не ў вакууме і так ці інакш судакранаемся з грамадствам: ці то ўключаем тэлевізар, ці проста нас цягнік задушыў. Тым не менш, любы творца існуе ў прасторы, таму натуральна і лагічна, што ён з ёю кантактуе. І адбываецца гэта аўтаматычна. Што ж да маякоў духоўнасці — няхай за гэта адказвае святар у царкве. Гэта ягоны абавязак, і людзі яго слухаюць. А мастак сядзіць у сваёй “шкарлупінцы” і, прапускаючы праз сябе ўсю гэтую рэальнасць, трансфармуючы яе, выдае пэўны прадукт. Іншая справа, што не кожны чалавек здольны і гатовы яго ўспрымаць. Адзін возьме, да прыкладу, “Вайну і мір” Талстога, пагартае крыху — і адкладзе ўбок, а іншы прачытае “ад” і “да” — і свет для яго перавернецца. Гэта індывідуальная здольнасць кожнага чалавека — успрымаць, перажываць, адчуваць творы мастацтва.

Сяргей Кавальчык:

— Можаш дзе заўгодна працаваць: у сваёй “шкарлупінцы” ці на Брадвеі, але вось ты прыходзіш у карцінную галерэю, спакойна праходзіш міма шэрагу работ, да прыкладу, Сярова, але раптам даходзіш да яго “Дзяўчынкі з персікамі” і разумееш, што перад табой не проста твор мастацтва, а — святло, сімвал чысціні і прыгажосці. І які-небудзь эпатажны стыліст Сяргей Звераў побач з гэтым выглядае… насмешкай, дзікім папіраннем усяго чалавечага!

Канстанцін Селіханаў:

— Тут я цалкам згодны: галоўнае — велічнасць задумы! Мы, зразумела, пішам, як умеем, так, як у нас атрымліваецца. Але ж задачы перад сабой мусім ставіць па максімуме. І гэта залежыць выключна ад самога творцы — наколькі ён гатовы быць патрабавальным да самога сябе і імкнуцца вырашаць гэтыя пастаўленыя перад сабою мэты і задачы.

Ад вядучай “круглага стала”.

“Нельга жыць у грамадстве і быць вольным ад яго” — гэтае філасофскае выслоўе не стамляецца пацвярджаць сваю правату, у тым ліку і ў дачыненні да творцаў. Бо мастацтва — гэта не толькі рэалізацыя ўласных творчых памкненняў, але і адказная місія: быць своеасаблівым культурным фарпостам, што вызначае маральныя арыенціры грамадства. І што б ні гаварылі пра неабходнасць паглядзець на творы мастацтва з пэўнай часавай адлегласці, дачакацца іх ацэнкі нашчадкамі, любы дзеяч, пераканана, марыць, каб плён ягонай працы ўбачылі, пачулі і ацанілі яго сучаснікі. І гэта — галоўная прычына, каб быць чуйным да духоўнага жыцця грамадства і вярнуцца да ўсведамлення таго, што творца не мусіць, не мае права быць адно толькі “самотнікам” у мастацтве, але і важнай функцыі — служэння свайму народу. Пераканана, поруч з праблемамі прафесіяналізму, мастацкага ўзроўню і якасці творчасці заўсёды мусіць ісці пытанне актыўнай грамадзянскай пазіцыі і маральнай адказнасці дзеячаў культуры і мастацтва за тыя ідэі, якія яны прапагандуюць. Каб не давялося чуць услед: “Страшно далеки они от народа…”

У кантэксце тэмы

Стваральны элемент:
вера, веды, этыка, эстэтыка

27 мая свой 70-гадовы юбілей адзначыў тэатральны крытык, эстэтык, доктар філасофскіх навук Вадзім САЛЕЕЎ. І да гэтай лічбы мы таксама вырашылі падысці “па-філасофску” — даючы слова юбіляру для разважанняў пра наша сучаснае жыццё і ролю ў ім мастацтва і навукі.

— Вадзім Аляксеевіч, ці схільны вы ў сваё 70-годдзе падводзіць пэўныя вынікі сваёй дзейнасці?

— Зусім не, бо да мяне сама дата падступіла нечакана: я гэтых гадоў не адчуваю. Лічба вымушае “спыніцца, азірнуцца” на мінулае, на зробленае і незробленае. І — паспрабаваць зразумець, што ты ўяўляеш з сябе ў гэтым свеце і што хацелася б яшчэ зрабіць. Мне прыспеў час падумаць пра наступны этап жыцця: адчуваю, што пара ўзяцца за стварэнне выніковай работы. У маім багажы дастаткова кніг па культуралогіі, эстэтыцы, ёсць і мастацкія. Але патрэбна ўжо апошняя, філасофская, кніга: яна абавязкова мусіць быць філасофскай. Зараз мяне цікавіць праца над канцэпцыяй неаксіялогіі — філасофскага вучэння, дзе злучаюцца паняцці каштоўнасці і ацэнкі.

— Ці маглі б вы абазначыць вяршыні ў мінулым і тыя, да якіх яшчэ імкняцеся?

— Няхай нават я філосаф паводле адукацыі, але большай часткай — чалавек: я проста жыву, стаўлю, безумоўна, перад сабою пэўныя мэты, але ж не адсочваю і не ацэньваю ўсё сваё жыццё з рацыянальных пазіцый. Думаю, рэдкія людзі здольныя на такое. Што да майго лёсу... Нарадзіўся я ў Ленінградзе, але амаль не жыў там. Дзяцінства і юнацтва правёў на беразе Чорнага мора, і лічу, што буйны ўклад у маё выхаванне, які я адчуваю нават зараз, зрабіў абхазскі народ. Калі мне было 5 гадоў, мы прыехалі ў толькі што вызваленае Запарожжа, дзе ў мяне з’явілася любімая бабуля — Еўфрасіння Саўчук, хаця і народная. Родам з Брэст-Літоўска, як яна казала, бабуля была уніяткай і па сваёй уніяцкай Бібліі вучыла мяне беларускай мове. З гэтага і пачалося маё збліжэнне з Беларуссю.

— Вы ствараеце ўражанне чалавека-касмапаліта. Што ж прывязала да Беларусі?

— Ёсць праўда ў тым, што вы кажаце. Мой эмацыянальны характар пэўным чынам адасабляе мяне ад беларускай ментальнасці — для мяне як для навукоўца гэта зразумела. Але, у той жа час, сучасная французская сацыялогія вызначае нацыянальнасць чалавека паводле яго самасвядомасці. Дык вось, я лічу сабе напалову рускім, напалову — беларусам. І калі я жыў у дзевяностыя гады ў Германіі, у мяне псаваўся настрой ад таго, што ўставаў раніцай і не чуў ніводнага беларускага слова. Сёння я магу сказаць, што вельмі добра ведаю Беларусь, бо хоць раз пабываў у кожным яе гарадку. Толькі ў трох райцэнтрах не чытаў лекцый па лініі аб’яднання “Веды”. А ў Нароўлі, да прыкладу, распрацоўваў праграму эстэтычнай рэабілітацыі дзетак, там была наша першая практычная пляцоўка.

— Вы шмат выкладаеце гуманітарныя дысцыпліны. У чым, на вашу думку, заключаецца праблема духоўнасці сёння?

— Гэта ўвогуле адна з галоўных праблем сучаснага быцця: з нашага жыцця сышло выхаванне — мэтанакіраванае ўздзеянне, напрыклад, на моладзь, з мэтай фарміравання пэўнай сістэмы каштоўнасцей. А ў нас цяпер скажоная сістэма, якая зыходзіць з таго, што рэй вядуць грошы і папулярнасць. Людзі глядзяць з зайздрасцю на тых, хто “засвяціўся” на экране, у каго ёсць дачы, машыны, і самі імкнуцца да таго ж, — а гэта і ёсць бездухоўнасць: пагоня за матэрыяльным, знешнім не закранае ўнутранай сутнасці чалавека, ягонай душы. Я вітаю высілкі нашага Філарэта, які імкнецца далучыць моладзь да веры, што надае ёй пэўны маральны тонус. Але я не згодны з тымі нашымі дзеячамі, у тым ліку і рэлігійнымі, хаця глыбока паважаю і падзяляю іх нематэрыяльныя памкненні, у тым, што духоўнасць складаецца з веры, і толькі. Як сучасны навуковец і метадолаг лічу: духоўнасць, якая з’яўляецца ядром культуры, складаецца з чатырох узаемапранікальных структур: вера, веды, этычная і эстэтычная культура.

— Якая, на вашу думку, роля гуманітарыя і навукоўца ў сучаснасці?..

— Варта адрозніваць два гэтыя паняцці. Я не належу да тых людзей, якія лічаць, што навука павінна замыкацца на “бліжніх” і практычных мэтах. У маладосці ў мяне быў выпадак, які хачу зараз згадаць. Я паступіў на месца малодшага навуковага супрацоўніка ў Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук, мяне выбралі намеснікам сакратара камітэта камсамола, і там мы ледзь не выключылі з камсамола аспіранта, які часта не наведваў пасяджэнні ды і ўвогуле на працы рэдка з’яўляўся. Але раптам высветлілася, што гэты чалавек зрабіў такое адкрыццё ў сферы элементарных часціц, за якім японцы ганяліся трыццаць гадоў і якое адразу ж дало эфект для народнай гаспадаркі ў мільёнах рублёў! Гэты выпадак паказаў, што навука патрабуе вельмі сур’ёзнага да сябе стаўлення. Сёння, аднак, лічу, навуцы не заўсёды надаецца належная ўвага і месца, у параўнанні з агульнаграмадскімі пытаннямі.

З мастацтвам жа справы яшчэ больш складаныя: яго запаланіла масавая культура. Вы запыталіся пра гуманітарыяў, дык вось: без гуманітарнай адукацыі ў чалавека няма культуры. Ён не развіты, у першую чаргу, як асоба, а грамадства вядуць наперад менавіта асобы. Без гуманітарных ведаў, без мастацтва, без развіцця эмоцый з чалавека нічога не атрымаецца, адно толькі — функцыянальны “працяг” станка ці нейкай прылады. На жаль, сёння мае месца ўяўленне: маўляў, калі ты ажыццяўляеш нейкую функцыю, то ў гэтым і заключаецца тваё чалавечае прызначэнне. Я, канешне ж, не падзяляю гэты пункт гледжання.

— Ці змяняюцца функцыі мастацтва і культуры ва ўмовах сусветнага крызісу?

— Не, не змяняюцца. У прынцыпе, гэтыя функцыі заўсёды скіраваны на адно: людзі маюць патрэбу ва самаўдасканаленні. Яшчэ Ніцшэ сказаў, што чалавек — гэта напалову звер, напалову анёл. У чалавеку ёсць высокія моманты і ёсць моманты нізкія. Людзі, якім бракуе духоўнасці, па словах Фрома, гэта “аднамерныя людзі”: з імі нічога не цікава. Але самае галоўнае — у грамадстве губляецца крэатыўны стваральны элемент, які не купіш ні за якія грошы. Для нашай краіны гэта асабліва важна, бо ў нас няма карысных выкапняў, і менавіта людзі — наш галоўны рэсурс. Таму пытанне ставіцца рубам: здолеем мы цывілізавацца да пэўнай ступені ці не? Я вельмі перажываю за нашу школьную рэформу, у якой зніжаецца значнасць гуманітарных ведаў, а гэта, на мой погляд, не аднаўляльна. Мастацтва робіць чалавека — чалавекам, складанай істотай. А крызіс жа, у рэшце рэшт, страшны тым, што пасяляецца ў нашых галовах. Эканамічныя цяжкасці мы пераадолеем — я ў гэта веру. А вось недахопы ў фарміраванні асобы не выпраўляюцца.

Гутарыў Алекс СТРЭЛ

сарве кветку, альбо злосны?

Мядзведзь. Гэта яшчэ горш! Злосны чалавек і так не здольны ні на што добрае. А маючы ў руках такое чараўніцтва, ён пачне сеяць зло па ўсёй зямлі! І тады бяда будзе не толькі людзям, але і звярам, іншым істотам.

Вожык. Значыць, небяспекі больш няма?

Мядзведзь. Пакуль што няма, але трэба быць уважлівымі.

Заслона.

КАРЦІНА ПЯТАЯ

Зноў двор сялянскай хаты. З'яўляецца Ночка, за ёй ідзе павесялелы Ясь.

Ясь. Ну, нарэшце дома... *(Да каровы.)* Усё з-за цябе! А можа, яно і лепей? *(Паварочваецца да залы.)* Каб не ўцякла карова, дык і не пайшоў бы я ноччу ў пушчу, не пабачыў бы столькі цудаў. Да гэтага б часу думаў, што шчасце можна папросту знайсці на дарозе.

На ганак выходзіць Марыся.

Марыся. Ну, нарэшце! Дзе ж цябе насіла ўсю ноч?

Ясь. Ой, Марыська! Калі табе ўсё распавесці, ты нават не паверыш!

Марыся. Хто ж табе паверыць? Ты ў нас хлус вядомы. Хто мінулым летам шчупака двухметровага бачыў у нашай рэчцы?

Ясь *(ускоквае).* Але ж я бачыў яго, бачыў! Нават стаў на яго: думаў — бервяно!

Марыся *(смяецца).* Во-во! Ты яшчэ скажы, што катаўся на ім.

Ясь. Не, не катаўся, хлусіць не буду. Я толькі праўду кажу.

Марыся *(смяецца).* Ты ў нас самы праўдзівы. І хто з цябе выйдзе? Хіба толькі казачнік. *(Ідзе ў хату.)*

Ясь. Хай сабе і казачнік. Справа нядрэнная: людзям радасць прыносіць. *(Звяртаецца да залы.)* Ну, а я што казаў? Ніхто не паверыць пра Папараць-кветку. А можа, хай лепш і не вераць. Хай проста слухаюць. Такі цуд здарыўся — цяжка і паверыць.

Марыся выходзіць на ганак.

Марыся. Якая ноч была цудоўная... Мы з сяброўкамі вянкі ў рэчку пускалі, а хлопцы за намі падглядалі. Вось насмяяліся! Відаць, і ты там быў?

Наш Яначка не выспаўся,
Да дзевачак ходзячы,
Гасцінчыкі носячы,
Гасцінчыкі-цукерачкі
Да Манечкі-паненачкі.

Ясь. Патрэбна мне ваша варажба! Я і не такое чараўніцтва бачыў. Але, паколькі ты не верыш, дык красамоўства сваё я на цябе траціць не буду. А ноч і сапраўды была дзівосная... Ты нават не здагадваешся, наколькі!

Марыся. На, летуценнік, падсілкуйся. *(Дае кубак малака і акраец хлеба.)*

Ясь *(садзіцца на ганак).* Вось і ранак надыходзіць. Сонца ўзыходзіць. Неба сінее над зялёнай пушчай. Ці было гэтае начное здарэнне, Папараць-кветка і Чароўная лясная дзева? Неяк ужо і не вельмі верыцца. І што прынясе нам новы дзень? Можа, новыя цуды?

Чуваць цокат капытоў, бразготкі і песню маці. Ясь устае.

Ясь. Бацькі з кірмашу вяртаюцца. *(З асалодай.)* Напэўна, абаранкі вязуць. Во шчасце!

На сцэну выходзіць Падарожнік.

Падарожнік. А можа, і цукеркі? А можа, яшчэ што-небудзь. Гэта не так ужо і важна. А важна тое, што з гэтых маленькіх радасцей і складаецца вялікае шчасце. Найбольшае ж шчасце дае нам наша родная зямля. Няма нідзе на свеце — колькі ні блукай — такіх зялёных дубраў і палеткаў, такіх глыбокіх і празрыстых рэчак, працавітых і добрых людзей. Нідзе так ласкава не свеціць сонца, як тут, на нашай радзіме. Нідзе няма столькі чараўніцтва і цудаў, як тут.

У свой час і я шукаў Кветку шчасця. Будзеце, мусіць, шукаць яе і вы. І для гэтага не трэба чакаць Купальскай ночы. І няма патрэбы ісці ў лес. Бо ваша Кветка шчасця — талент, які абавязкова ёсць у кожнага з вас.

Звяртаецца да гледачоў. У гэты час у глыбіні сцэны з'яўляецца Чароўная лясная дзева.

У гэтай зале сядзяць вялікія матэматыкі, архітэктары, славутыя артысты, мастакі і музыканты!..

Чароўная лясная дзева. Але, каб раскрыўся ваш талент, трэба шмат працаваць і не баяцца цяжкасцей. І вось тады яскрава расцвіце ваша Папараць-кветка — ваш талент! І вы зможаце падзяліцца шчасцем з усімі і нічога не страціце. А станеце яшчэ больш шчаслівымі! А талент ваш заззяе яшчэ больш яскрава!

Да пабачэння, сябры!

Усе дзейныя асобы выходзяць і кланяюцца.

Заслона.

ляны сялянскі стол, які стаіць ля вакна. На ім гарыць свечка. За сталом сядзяць два хлопчыкі, а разам з імі — старэнькая бабуля. Грыміць гром і бліскае маланка.

Вядучы-Падарожнік. Неяк восенню, пад вечар, узняўся страшэнны вецер. Ён ірваў саламяныя стрэхі, гнуў і ламаў дрэвы. Мы з маім сябрам Янкам схаваліся ў яго дома. На вуліцы грымела бура, і, каб мы менш баяліся, Янкава бабуля, старэнькая Сяргеіха, якую ён зваў Бабунька, баяла нам розныя казкі. Вось тады я ўпершыню пачуў тую легенду, што ўразіла мяне да глыбіні душы і запомнілася на ўсё жыццё. Я зараз паспрабую вам яе пераказаць. А калі мо і наманю трошкі, дык выбачайце, — не дзеля падману, а дзеля прыгажосці.

ДЗЕЯ ПЕРШАЯ

КАРЦІНА ПЕРШАЯ

Двор сялянскай хаты. Плот са жбанкамі, вёдры, іншы рыштунак. Ганак. Уваход у дом. Калодзежны журавель. Варотцы ў хляўчук. На гарызонце сінее хмара. З ганка спускаюцца Бацька і Маці. За імі ідуць Ясь і Марыся.

Бацька. Ну вось, здаецца, усё ўзялі. Час выпраўляцца.

Маці. Так. Ужо і сонца хутка ўзыйдзе.

Бацька. Глядзіце ж, каб парадак быў! Ты, Ясь, слухай сястрыцу: яна старэйшая.

Ясь. Хоць і старэйшая, але я за мужыка застаўся ў хаце. Хай яна лепш мяне слухае.

Бацька. Глядзі ў мяне, "мужык"! Як пагоніш скаціну на пашу — авечак не пагубляй! Ваўкі ў нашай пушчы яшчэ не перавяліся.

Марыся. Нічога! Я прасачу. Усё будзе добра.

Маці. Ну, і хораша! Калі вы нічога не баіцеся, дык і мы заспакоены.

Знікаюць за кулісамі. Чуваць, як Фыркае конь, тупацяць капыты, звоняць бразготкі. Паступова ўсё сціхае.

Ясь. Ну, то і мне самы час.

Расчыняе варотцы. На сцэну выходзяць дзве каровы, адна з іх — чорная, і тры авечкі.

Ясь. Но! Пайшлі! Каб вас воўк!

Марыся. Ціха ты, "мужык"! А то бяду наклічаш! Сусед наш сапраўды ваўкоў нядаўна бачыў.

Ясь. Нічога не здарыцца! А ваўкоў тых, акрамя суседа, даўно не бачыў ніхто. Можа, яму здалося спрасонку. Ды і лета ж цяпер. *(Гоніць жывёл са сцэны.)* Но! Пайшлі!

Марыся. Лета... І дзень будзе цудоўны. Пятроў дзень. Але пара ўжо за працу брацца. *(Здымае з плота жбанок. Пачынае яго мыць і спявае.)*

А на Купалле, на Яна,
Дзевачка зелля капала.
Яна капала й плакала,
Дзе ж яго горачка брала?
Ой, кіну, кіну пярыну,
Сама паеду ў даліну.
Сама паеду ў даліну,
Дзе мяне людзі не знаюць.

КАРЦІНА ДРУГАЯ

Поплаў. Некалькі кустоў. Недалёка — лес. Чуваць, як цурчыць ручай. Прыгожа спяваюць птушкі, асабліва — жаўрук.

Ясь *(сядзіць на пяньку).* Ух, гарачыня якая! Нават Ночка з авечкамі пад вярбу схавалася. Яно і зразумела: чорнай жывёліне пад такім пякучым сонцам асабліва цяжка. *(Расшпільвае кашулю.)* І мне — таксама... І рабіць няма чаго. Можа, матылёў налавіць? Не. Не буду. *(Устае з пянька.)* А то Васілька, мой сябра, налавіў тых бедных матылёў, панасаджваў іх на іголкі і радуецца немаведама чаго. Не... Хай яны лепш лётаюць. Такая прыгажосць павінна быць жывая і вольная. Лепей я жалейку зраблю. Дзядзька Сымон абяцаў навучыць мяне граць на ёй.

Зразае галінку і пачынае майстраваць жалейку. Гучыць прыемная і цягучая мелодыя.

Ясь. Нешта сумна стала... Лепей я сам заспяваю!

Я зраблю, зраблю дуду,
Заіграю, загуду:
Дзеўкі будуць танцаваць,
А я буду ім іграць!

***Прыпеў**:*
Ох, дудка мая,
Весялушка мая,
Весяліла ты мяне
На чужой старане!
Як павесіў я дуду
На зялёненькім дубу —
Дуда з дуба звалілася,
На трэсачкі пабілася.

Прыпеў.
Плачуць хлопцы, плачуць дзеўкі:
Не складаюцца прыпеўкі!
А я плакаць не буду —
Зраблю новую дуду!

У гэты час чорная карова ціхенька праходзіць у глыбіню сцэны і хаваецца ў кустах. Паступова музыка сціхае. Другія жывёліны скубуць траўку, матляюць галовамі і хвастамі, адганяючы аваднёў, "танчаць".

Ясь. Ого! Ужо і пасвяжэла. Ды і жалейка амаль гатова. А як там мой статак? От як добра траўку скубуць! А Рагуля, як заўсёды, — наперадзе. Бы той камандзір! А за ёй — авечкі. А Ночка... *(Занепакоена азіраецца навокал.)* Ну што ты будзеш рабіць?! Ночка, як заўсёды, знікла... Дня не праходзіць, каб не трэба было яе шукаць! Ну што за памаўзлівае стварэнне?

(Пачынае бегаць па сцэне, за сцэну і клікаць.)

Ночка! Ночка! Ночка!

(Вяртаецца на сцэну.)

Паганю статак дадому: мо яна ўжо там?

Сцэна пусцее. Потым з аднаго боку выходзіць Мядзведзь, а з другога — Ліса і Вожык.

Мядзведзь. Ну, што чуваць? Якія навіны?

Ліса. Нічога асаблівага не здарылася.

Мядзведзь. Значыць, усё добра?

Ліса. Усё.

Вожык. Усё. Толькі ў пастушка цялушка ўцякла. Але гэта, спадзяюся, не наша турбота.

Мядзведзь. Пакуль што — не. Але як там далей будзе — не ведаю. Усё залежыць ад таго, куды яна пайшла. *(Звяртаецца да Лісы і Вожыка.)* Можа, вы бачылі?

Ліса. Не!

Вожык. А мне навошта?

Мядзведзь *(цяжка ўздыхае).* Пакуль не ведаю.

На сцэну шпарка выбягае Заяц. Ён так разагнаўся, што некалькі разоў аббягае звяроў і, нарэшце, цяжка дыхаючы, спыняецца.

Заяц. Прывітанне! Пра што клапоціцеся?

Мядзведзь. Ды вось, не ведаем куды цялушка падалася, што ад пастушка ўцякла.

Заяц. Нам што за турбота? Хай сабе пасвіцца ў лесе.

Мядзведзь. У якім лесе? Ты што, яе бачыў?

Заяц. Бачыў.

Мядзведзь. І дзе ж яна?

Заяц. Як "дзе"? У лесе! Спачатку па ўскрайку хадзіла. А потым глыбей зайшла: палянкі там ёсць з травой сакавітай, яшчэ нікім не чапанай. Я гэтыя палянкі добра ведаю.

Мядзведзь. А вось гэта ўжо дрэнна.

Заяц. Чаму? Усю траву саскубе?

Мядзведзь. Якая там трава? Хто пра што, а Заяц — пра канюшыну! Хіба ты забыўся, які сёння дзень і якая будзе ноч?

Заяц. Якая?

Ліса. І сапраўды! Сёння ж ноч на Івана Купалу! І сёння, магчыма, расцвіце Папараць-кветка...

Мядзведзь. Не магчыма, а расцвіце напэўна!

Вожык. Ну і што нам з таго?

Мядзведзь. Як што? Хлопчык пачне шукаць карову, зойдзе ў пушчу. І можа ўбачыць Папараць-кветку! А калі сарве...

Ліса. А вось гэта ўжо дрэнна.

Мядзведзь. І не проста дрэнна, а — бяда! *(Да Зайца.)* Шкада, што ты адразу не здагадаўся выгнаць карову з пушчы.

Заяц. Як ты гэта сабе ўяўляеш? Я ж табе не воўк які-небудзь! Цялушка мяне не толькі не спалохаецца — не заўважыць нават!

Мядзведзь. Яно так... Сам паспрабую. Але пакуль я датупаю... *(Да Лісы.)* Ты, Лісачка, бяжы хутчэй і не дай ёй зайсці ў гушчар! Можа, у цябе атрымаецца. Але баюся, што ўжо позна...

Вожык. І нічога нельга будзе зрабіць?

Мядзведзь. Не ведаю. Мо што і прыдумаю.

Заяц. Я ведаю! *(Усе глядзяць на яго.)* Трэба пастушка напужаць! *("Палохаецца" сам.)* Каб ён спалохаўся і заблудзіўся! *("Палохаецца" яшчэ больш і хаваецца за Мядзведзя).*

Ліса *(з'едліва).* О... Смелая прапанова! Дык ты ў нас проста герой!

Заяц *(высунуўшыся з-за Мядзведзя).* А што? Мядзведзь будзе грозна бурчаць. Я — страшна тупаць. *(Зноў хаваецца за Мядзведзя.)* Вожык будзе чмыхаць.

Вожык. Тупатун знайшоўся! *(Чмыхае і смяецца.)* Глядзі сам не памры са страху!

Мядзведзь. Але калі нічога больш не застанецца, дык так і зробім. Галоўнае — не даць хлопчыку знайсці Папараць-кветку!

Разыходзяцца.

КАРЦІНА ТРЭЦЯЯ

Той самы сялянскі двор. На ганку стаіць Марыся, гледзячы ўдалечыню з-пад далоні. Чуецца голас Яся: ён кліча Ночку. Карова і авечкі заходзяць у двор. Ясь адчыняе варотцы хлеўчука — усе жывёлы хаваюцца ў ім.

Марыся. Што здарылася? Ночка прапала?

Ясь. Так. Няма нідзе. Я спадзяваўся, што яна, можа, ужо дома?

Марыся. Не! Няма! Але хіба ж гэта ўпершыню? Я вось гадаю, хто з вас разумнейшы: ці пастух, які за галоўнага "мужыка" застаўся ў хаце, ці тая жывёліна? Колькі разоў яна ўжо ад цябе ўцякала?

Ясь. Немагчыма і падлічыць.

Марыся. Дык ты ж усе яе любімыя хованкі ведаеш! Там і шукай.

Ясь. Шукаў: няма яе нідзе!

Марыся. Нічога страшнага. Пакуль ты ў адным месцы глядзеў, яна ў іншае перабегла. Пашукай яшчэ.

Ясь. Добра!

Выбягае са сцэны. Здалёк чуваць ягоны голас, які паступова сціхае. Марыся пачынае завіхацца па гаспадарцы: мые вядро, даёнку, падмятае двор. Спявае.

Марыся.

Ой, у нядзельку на Яна
Іграла соненька, йграла!
Дзеўкі зелле капалі,
Ды яны яго не зналі.
Ды яны яго ні зналі —
У старога дзеда пыталі:
— Скажы, бацька, што за зелле:
На ім — чорнае насенне?
— Што ж вы, дзеванькі, капалі,
Калі вы яго не зналі?
Гэта дзявоцка красота,
А для хлопцаў — сухота.

З'яўляецца Ясь.

Ясь. Нідзе няма! Ну што ты з ёй будзеш рабіць!

Марыся. Ты добра глядзеў? Усюды?

Ясь. Усюды! Няма дзе ёй і схавацца! З аднаго боку поплава — рэчка, карове не перайсці. А з другога, хоць і далёка, — ільняное поле. Я дабег да самага краю. Няма ёй дзе там схавацца: усё — як на далоні!

Марыся *(спалохана).* Ой, Яська! Засталося толькі адно месца, дзе яна можа быць...

Ясь *(таксама спалохана).* Пушча?

Марыся. Так, пушча. Бяжы, Яська! І пашукай на ўзлеску. Толькі глыбей не ідзі: бо няма ёй ні канца, ні краю. І калі сыдзе туды наша цялушка, дык ніколі мы яе ўжо не ўбачым. І будзе нам сорамна перад бацькамі за такое недарэчнае гаспадаранне. Ды і ты сам можаш заблудзіць.

Яська. Добра! *(Адыходзіць убок.)* Бацька мяне пакінуў за галоўнага "мужыка" ў хаце. А я так яго падвёў... *(Рашуча, але каб не чула Марыся.)* Ну што ж, сам згубіў — сам і знайсці павінен! *(Знікае са сцэны.)*

Заслона.

ДЗЕЯ ДРУГАЯ

КАРЦІНА ЧАЦВЁРТАЯ

Вельмі стары і змрочны лес. Ясь з цяжкасцю прабіраецца скрозь гушчар. Час ад часу кліча Ночку. З усіх бакоў даносяцца страшныя начныя гукі. Вухкае пугач. Успыхваюць драпежныя вочы і кляцаюць зубы. Трашчаць галіны, быццам там з тупатам прабіраецца вялікі драпежны звер... Ясь паступова выходзіць на палянку. Гукі страшнага лесу сціхаюць.

Ясь. Нарэшце выбраўся! Але цікава, куды гэта я трапіў? Здаецца, канца-краю таму лесу не было! Каровы не відаць. Але яна такая "разумная" жывёліна, што і не ў такую шчыліну можа залезці.

Раптам у глыбіні сцэны загараецца святло і на невялікім пагорку расцвітае кветка незвычайнай прыгажосці. Яна ўся зіхаціць, і ад яе становіцца яшчэ святлей.

Ясь. А гэта што за дзіва?

Папараць-кветка. Так, дзіва. І нават — цуд. Падыдзі бліжэй.

Ясь. Навошта?

Папараць-кветка. Як, ты не ведаеш, што сёння за ноч?

Ясь *(схамянуўшыся).* Ой! Як жа я забыўся? А маці яшчэ ўчора казала пра гэта... І сапраўды: настала святочная і чароўная ноч — ноч на Івана Купалу!

Папараць-кветка. Так!

Ясь. Дык вось ты якая, славутая Кветка шчасця...

Папараць-кветка. Так. І цяпер ты можаш сарваць мяне, пажадаць і атрымаць усё, што толькі захочаш! І будзеш шчаслівым, калі зможаш.

Ясь *(радасна).* Змагу! *(Робіць крок у бок Папараць-кветкі).*

На сцэне з'яўляецца прыгожая жанчына ў залацістай кароне, у прыгожай сукенцы, якая блішчыць і ўвесь час змяняе колер ад зялёнага да залатога.

Чароўная лясная дзева. Не чапай! Перш-наперш добра падумай!

Ясь. Што тут думаць? Я ж магу атрымаць усё!



Папараць-кветка. Так!

Чароўная лясная дзева. Не!

Ясь *(разгублена).* Хто ты?

Чароўная лясная дзева. Не палохайся! Я — гаспадыня і абаронца гэтых мясцін. Людзі завуць мяне Чароўнай лясной дзевай. Я яшчэ раз табе раю: падумай! Ты — разумны хлопчык, рашучы і смелы. Ты не пабаяўся ноччу пайсці ў пушчу, каб давесці даверaную табе справу да завяршэння. А значыць, шчасце тваё — гэта тое, што здабыта ўласнай працай. І ты на гэта здольны.

Ясь. Але ж я змагу ўсё атрымаць дарма?..

Папараць-кветка. Так!

Чароўная лясная дзева. Не! Усё, што ты атрымаеш дарма, — будзе толькі тваё, асабістае. А калі ты падзелішся хоць з кім-небудзь, дык усё адразу знікне. Але і гэта яшчэ не самае дрэннае: варта толькі дакрануцца да Кветкі, як яна атрымае ўладу над табой. І ты ўжо не зможаш адмовіцца ад багацця і лёгкага жыцця. І назаўсёды забудзешся пра блізкіх і родных табе людзей.

Папараць-кветка *(злосна).* Ну і што? Якая табе справа да іх усіх?

Ясь *(расчаравана).* І падарунка нельга зрабіць? *(Яшчэ больш разгублена.)* Боты або гадзіннік для бацькі? Ці хустку для маці? Або *(задуменна)* завушніцы залатыя? Яна так даўно пра іх марыла...

Папараць-кветка *(жорстка).* Не!

Ясь *(з надзеяй).* А пацеркі для сястрыцы? Зусім танныя, са звычайнага шкла?

Папараць-кветка *(яшчэ больш жорстка).* Не!

Ясь *(расчаравана).* Дык вось чаму ніхто не ведае тых, хто знайшоў Папараць-кветку і стаў шчаслівым?..

Чароўная лясная дзева. Так! Бо іх папросту не можа быць! Адзінота не бывае шчаслівай. І ніякае багацце не выратуе.

Ясь. І мне такое шчасце таксама не патрэбна! *(Адварочваецца.) Кветка злосна пыхае і яе святло гасне. Чароўная лясная дзева гладзіць Яся па галаве і знікае.*

Ясь. Ну вы бачылі? Звычайны стары корч і гнілушка на ім. І свеціцца цьмяна. А здавалася — такая прыгажосць! Так зіхацела! Брыдота драпежная! А я амаль паверыў! Разявіў рот на дармовае. Праўду маці кажа: за так і гузак не ўскочыць!

На другім краі сцэны з 'яўляецца карова.

Ясь. І ты тут? *(Карова ківае.)* Усё бачыла? *(Карова зноў ківае.)* Але ж хто мне паверыць? *(Карова ўвесь час ківае, у залежнасці ад сэнсу.)* Ну, то лепш нікому і не казаць. Хадзем лепей дадому. Ужо і ноч сыходзіць.

Сцэна ненадоўга пусцее, а потым з-за куста вылазіць Мядзведзь. На сцэну з розных бакоў выходзяць Ліса, Вожык і Заяц.

Мядзведзь. Ой! Ледзь вытрымаў. Цяжка мне ў маім узросце, ды ў цёплым футры, скурчыўшыся, хавацца пад кустом. Ды і жудасна так было! Як казаў адзін грыбнік, які выпадкова мяне ўбачыў: са страху ўсе блохі здохлі!

Ліса. А што, у грыбнікоў таксама блохі бываюць?

Мядзведзь. Не ведаю. Але ён так казаў свайму здзіўленаму сябру, бо дзесяціметровую канаву перасскочыў амаль без разбегу са страху.

Заяц. Шкада, што я з табой побач не схаваўся.

Мядзведзь. Навошта?

Заяц *(чухаецца).* Можа, і мае блохі здохлі б...

Мядзведзь *(смяецца).* Наўрад ці! Гэта толькі кажуць так. Прымаўка.

Заяц *(расчаравана).* А-а-а-а...

Ліса. Я магу табе параіць...

Заяц. Слухаю.

Ліса. Бяжы на поле: там ляжыць вялізная куча калійнай солі. Набяры цэлую жменю і добра абсыпся.

Заяц. І ўсё?

Ліса. Усё.

Заяц. І блохі здохнуць?

Ліса. Хутчэй за ўсё. А калі не, дык футра ўсё роўна аблезе, і яны самі паўцякаюць. Ха-ха-ха!

Заяц *(кланяецца).* Дзякуй табе, Лісічка. Ты сёння вельмі добрая.

Вожык. Ну, хопіць вам. *(Да Лісы.)* А ты жартуй, ды меру ведай. Не хапала нам толькі лысых зайцаў. *(Да Мядзведзя.)* Растлумач, калі ласка, чаго ты так баяўся?

Мядзведзь. Як жа не баяцца? Ясь вельмі добры і працавіты хлопец. І сарві ён гэтую драпежную кветку, дык хутка стаў бы самым няшчасным чалавекам на свеце!

Заяц. А калі дрэнны чалавек

Прапановы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў ЗВОДНЫ ПЛАН (праект) устаноўкі манументальных збудаванняў у Рэспубліцы Беларусь у 2009 — 2012 гг.

МІНСК

I. Мемарыяльныя збудаванні гістарычным дзеячам і выбітным асобам у гісторыі Беларусі

1. Помнік полацкаму князю, заснавальніку Мінска **Усяславу Брачыславічу*.**
2. Помнік першаму мінскаму князю **Глебу Усяславічу***.
3. Мемарыяльны знак/мемарыяльная дошка мастаку **Яну Дамелю.**
4. Помнік кампазітару **Станіславу Манюшку.**
5. Помнік кіраўніку паўстання 1863 — 1864 гг. у Беларусі **Вікенцію Канстанціну Каліноўскаму.**
6. Помнік паэту XIX ст. **Янку Лучыну.**
7. Помнік выдаўцу, лінгвісту, літаратуразнаўцу, грамадскаму дзеячу **Браніславу Эпімах-Шыпілу.**
8. Помнік гісторыку, грамадскаму дзеячу, этнографу, фалькларысту, літаратуразнаўцу, эканамісту **Мітрафану Доўнар-Запольскаму.**
9. Помнік пісьменніку, мастаку, грамадскаму дзеячу **Карусю Каганцу.**
10. Помнік вучонаму-гісторыку, грамадскаму і палітычнаму дзеячу, першаму прэзідэнту Беларускай акадэміі навук **Усеваладу Ігнатоўскаму.**
11. Помнік **братам Івану** (палітычнаму дзеячу, гісторыку, этнографу) і **Антону** (палітычнаму дзеячу, гісторыку, публіцысту) **Луцкевічам**.
12. Помнік палітычнаму дзеячу, пісьменніку **Зміцеру Жылуновічу.**
13. Помнік палітычнаму дзеячу **Аляксандру Чарвякову.**
14. Помнік палітычнаму дзеячу, філолагу **Браніславу Тарашкевічу.**
15. Помнік дзяржаўнаму дзеячу, удзельніку вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі **Сяргею Прытыцкаму.**

II. Мемарыяльныя збудаванні да значных гістарычных падзей, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі

1. Помнік-мемарыял, прысвечаны **бітве на рацэ Нямізе 3 сакавіка 1067 г.**
2. Помнік-мемарыял у гонар **Статутаў Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566, 1588 гг.**
3. Помнік-мемарыял у гонар **уз'яднання Заходняй Беларусі з БССР у 1939 г.**

** Можа быць усталяваны адзін помнік адразу двум гэтым гістарычным дзеячам (бацьку і сыну).*

МІНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

I. Мемарыяльныя збудаванні гістарычным дзеячам і выбітным асобам у гісторыі Беларусі

1. Беразіно. Мемарыяльны знак/мемарыяльная дошка мастакам — **братам Апалінарыю і Іпаліту Гараўскім.**
2. Лагойск. Помнік-бюст славяназнаўцу, археолагу, этнографу **Зарыяну Даленгу-Хадакоўскаму.**
3. Лагойск. Помнік археолагам, гісторыкам, краязнаўцам — **братам Канстанціну і Яўстафію Тышкевічам.**
4. Любань. Помнік пісьменніку, этнографу **Уладзіславу Сыракомлю**.
5. Мар'іна Горка. Помнік-бюст скрыпачу і кампазітару **Міхаілу Ельскаму.**
6. Мар'іна Горка. Помнік-бюст гісторыку, краязнаўцу, публіцысту **Аляксандру Ельскаму.**
7. Мар'іна Горка. Помнік палітычнаму дзеячу **Аляксандру Чарвякову.**
8. Мар'іна Горка. Помнік беларускаму цымбалісту, дырыжору, кампазітару, педагогу **Іосіфу Жыновічу.**
9. Маладзечна. Помнік або мемарыяльны знак паэту, грамадскаму дзеячу **Тамашу Зану.**
10. В. Будслаў, Мядзельскі раён. Мемарыяльны знак/мемарыяльная дошка арганісту і кампазітару **Іахіму Глінскаму.**
11. Нясвіж. Помнік канцлеру ВКЛ **Мікалаю Радзівілу Чорнаму.**
12. Нясвіж. Помнік-бюст заснавальніку Нясвіжскага замка **Мікалаю Крыштофу Радзівілу Сіротку.**
13. Нясвіж. Помнік або мемарыяльны знак графіку, гравёру, друкару, картографу **Тамашу Макоўскаму.**
14. Нясвіж. Помнік-бюст палітычнаму і культурнаму дзеячу ВКЛ Міхалу **Казіміру Радзівілу Рыбаньку.**
15. Нясвіж. Помнік-бюст палітычнаму і культурнаму дзеячу ВКЛ **Каралю Станіславу Радзівілу.**
16. Нясвіж. Мемарыяльны знак/мемарыяльная дошка мастакам, стваральнікам габеленаў, карцін і роспісаў для касцёлаў і замка Нясвіжа **бацьку і сыну Францішку Ксаверыю Дамініку і Юзафу Ксаверыю Гескім.**
17. Нясвіж. Мемарыяльны знак/мемарыяльная дошка кампазітару **Яну Давіду Голанду.**
18. Слуцк. Помнік асветніку, літаратару, выдаўцу, стваральніку кірылічнага грамадзянскага шрыфта **Іллю Капіевічу (Капіеўскаму).**
19. Г.п. Старобін, Салігорскі раён. Мемарыяльны знак/мемарыяльная дошка актрысе **Галіне Макаравай.**
20. Чэрвень. Помнік кампазітару **Станіславу Манюшку.**
21. Чэрвень. Мемарыяльны знак/мемарыяльная дошка архітэктару, дзяржаўнаму дзеячу **Уладзіміру Каралю.**
22. Узда. Помнік-бюст фізіку і медыку **Якубу Наркевічу-Ёдку.**
23. Узда. Помнік пісьменніку, мовазнаўцу, грамадскаму дзеячу **Кандрату Крапіве (Атраховічу).**

II. Мемарыяльныя збудаванні да значных гістарычных падзей, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі

1. В. Малы Трасцянец, Мінскі раён. Помнік-мемарыял у памяць **аб ахвярах аднаго з найбуйнейшых у Еўропе месцаў масавага знішчэння людзей, створанага фашыстамі.**

БРЭСЦКАЯ ВОБЛАСЦЬ

I. Мемарыяльныя збудаванні гістарычным дзеячам і выбітным асобам у гісторыі Беларусі

1. Баранавічы. Помнік беларускаму тэатральнаму дзеячу, драматургу, першаму народнаму артысту Беларусі **Уладзіславу Галубку.**
2. Брэст. Помнік або мемарыяльны знак канцлеру ВКЛ **Міхалу Чартарыйскаму.**
3. Івацэвічы. Помнік ваеннаму і палітычнаму дзеячу, кіраўніку нацыянальна-вызваленчага паўстання 1794 г. у Рэчы Паспалітай **Андрэю Тадэвушу Касцюшку.**
4. Камянец. Помнік уладзіміравалынскаму князю, заснавальніку Камянца **Уладзіміру Васількавічу.**
5. Камянец. Помнік вучонаму-гісторыку, грамадскаму і палітычнаму дзеячу, першаму прэзідэнту Беларускай акадэміі навук **Усеваладу Ігнатоўскаму.**
6. Ляхавічы. Помнік першаму беларускаму пісьменніку-мемуарысту **Фёдару Еўлашоўскаму.**
7. Пінск. Мемарыяльны знак/мемарыяльная дошка пінскаму старасту, канцлеру ВКЛ, пісьменніку **Міхалу Вішнеўскаму.**
8. Пінск. Мемарыяльны знак/мемарыяльная дошка пінскаму старасту, палітычнаму і культурнаму дзеячу ВКЛ **Міхалу Казіміру Агінскаму.**
9. Пружаны. Помнік спеваку **Міхаілу Забэйду-Суміцкаму.**

ВІЦЕБСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

I. Мемарыяльныя збудаванні гістарычным дзеячам і выбітным асобам у гісторыі Беларусі

1. Г.п. Бешанковічы. Помнік канцлеру ВКЛ **Льву Сапегу.**
2. Браслаў. Помнік або мемарыяльны знак вучонаму-географу **Каралю Вырвічу.**
3. Верхнядзвінск. Помнік геолагу, географу **Івану Чэрскаму.**
4. Віцебск. Помнік віцебскаму князю, пасля — вялікаму князю літоўскаму **Альгерду*.**
5. Віцебск. Помнік віцебскаму князю, пасля — вялікаму князю літоўскаму **Ягайлу*.**
6. Віцебск. Помнік або мемарыяльны знак віцебскаму ваяводу, палітычнаму і культурнаму дзеячу ВКЛ **Марціну Агінскаму.**
7. Віцебск. Мемарыяльны знак/мемарыяльная дошка кампазітару **Антону Абрамовічу.**
8. Віцебск. Помнік або мемарыяльны знак пісьменніку і асветніку **Арцёму Вярыгу-Дарэўскаму.**
9. Віцебск. Помнік-бюст археолагу, краязнаўцу, этнографу, фалькларысту **Аляксандру Семянтоўскаму (Семянтоўскаму-Курылу).**
10. Віцебск. Помнік-бюст этнографу, фалькларысту, асветніку **Мікалаю Нікіфароўскаму.**
11. Лепель. Помнік або мемарыяльны знак пісьменніку і асветніку **Арцёму Вярыгу-Дарэўскаму.**
12. Полацк. Помнік або мемарыяльны знак архітэктару **Іагану Крыстафу Глаубітцу.**
13. Полацк. Помнік або мемарыяльны знак полацкаму ваяводу, палітычнаму і культурнаму дзеячу ВКЛ **Мікалаю Тадэвушу Лапацінскаму**.
14. Полацк. Помнік або мемарыяльны знак полацкаму ваяводу, палітычнаму і культурнаму дзеячу ВКЛ **Аляксандру Сапегу.**
15. Полацк. Помнік выдаўцу, лінгвісту, літаратуразнаўцу, грамадскаму дзеячу **Браніславу Эпімах-Шыпілу.**

II. Мемарыяльныя збудаванні да значных гістарычных падзей, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі

1. Полацк. Помнік-мемарыял **"Полацк — калыска беларускай дзяржаўнасці".**

** Можа быць усталяваны адзін помнік адразу двум гэтым гістарычным дзеячам (бацьку і сыну).*

ГОМЕЛЬСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

I. Мемарыяльныя збудаванні гістарычным дзеячам і выбітным асобам у гісторыі Беларусі

1. Гомель. Помнік-бюст этнографу-фалькларысту, археолагу **Еўдакіму Раманаву.**
2. Гомель. Помнік дзяржаўнаму і палітычнаму дзеячу **Кірылу Мазураву.**
3. Лоеў. Мемарыяльны знак/мемарыяльная дошка гісторыку, акадэміку **Іларыёну Ігнаценку.**
4. Мазыр. Мемарыяльны знак/мемарыяльная дошка мазырскаму ваяводу, палітычнаму і культурнаму дзеячу ВКЛ **Гервазію Людвіку Аскерку.**
5. Рэчыца. Помнік гісторыку, грамадскаму дзеячу, этнографу, фалькларысту, літаратуразнаўцу, эканамісту **Мітрафану Доўнар-Запольскаму.**
6. Рагачоў. Помнік драматургу **Андрэю Макаёнку.**

ГРОДЗЕНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

I. Мемарыяльныя збудаванні гістарычным дзеячам і выбітным асобам у гісторыі Беларусі

1. Г.п. Вялікая Бераставіца. Помнік або мемарыяльны знак гетману ВКЛ, заснавальніку Заблудаўскай друкарні **Рыгору Хадкевічу.**
2. Г.п. Вялікая Бераставіца. Помнік або мемарыяльны знак лінгвісту, вучонаму-арыенталісту **Осіпу Кавалеўскаму.**
3. Воранава. Помнік або мемарыяльны знак гісторыку і археолагу **Тэадору Нарбуту.**
4. Гродна. Помнік першаму гродзенскаму князю **Усеваладку Давыдавічу.**
5. Гродна. Помнік старасту, гродзенскаму князю **Давыду Гарадзенскаму.**
6. Гродна. Помнік гродзенскаму князю, вялікаму князю літоўскаму **Вітаўту.**
7. Гродна. Помнік канцлеру, дзяржаўнаму дзеячу ВКЛ **Астафію Валовічу.**
8. Гродна. Помнік вялікаму князю літоўскаму і каралю польскаму **Стэфану Баторыю.**
9. Гродна. Мемарыяльны знак/мемарыяльная дошка будаўніку Старога замка **Стэфана Баторыя Антонію дэ Грыпу.**
10. Гродна. Помнік або мемарыяльны знак вучонаму-геральдысту, картографу **Аляксандру Юзэфу Ябланоўскаму.**
11. Гродна. Помнік або мемарыяльны знак гісторыку, археографу, кіраўніку нацыянальна-вызваленчага руху **Віктару Каліноўскаму.**
12. Г.п. Карэлічы. Помнік паэту, этнографу, члену таварыства філаматаў **Яну Чачоту.**
13. Ліда. Помнік вялікаму князю літоўскаму **Гедыміну.**
14. Ліда. Мемарыяльны знак/мемарыяльная дошка мастаку **Казіміру Альхімовічу.**
15. Ліда. Мемарыяльны знак/мемарыяльная дошка кампазітару **Канстанціну Горскаму.**
16. Навагрудак. Помнік першаму вядомаму навагрудскаму князю **Ізяславу.**
17. Навагрудак. Помнік князю навагрудскаму, вялікаму князю літоўскаму **Войшалку Міндоўгавічу.**
18. Ашмяны. Помнік пісьменніку, грамадскаму дзеячу ВКЛ **Андрэю Волану.**
19. Слонім. Помнік канцлеру ВКЛ **Льву Сапегу.**
20. Слонім. Помнік грамадска-палітычнаму дзеячу ВКЛ, кампазітару, заснавальніку шэрагу прадпрыемстваў у горадзе, а таксама слонімскіх тыпаграфіі, тэатра і капэлы **Міхалу Казіміру Агінскаму.**
21. Шчучын. Помнік або мемарыяльны знак гісторыку-архівісту, правазнаўцу **Мацею Догелю.**

II. Мемарыяльныя збудаванні да значных гістарычных падзей, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі

1. Гродна. Помнік-мемарыял **у гонар Грунвальдскай бітвы.**

МАГІЛЁЎСКАЯ ВОБЛАСЦЬ

I. Мемарыяльныя збудаванні гістарычным дзеячам і выбітным асобам у гісторыі Беларусі

1. Бабруйск. Помнік або мемарыяльны знак палітычнаму і культурнаму дзеячу ВКЛ, расійскаму фельдмаршалу, бабруйскаму старасту **Яну Казіміру Сапегу.**
2. Клімавічы. Помнік кіраўніку сялянскага руху супраць феадальнага прыгнёту **Васілю Вашчылу.**
3. Магілёў. Помнік беларускаму інжынеру і тэарэтыку артылерыі **Казіміру Семяновічу.**
4. Магілёў. Помнік выдатнаму праваслаўнаму царкоўнаму і грамадскаму дзеячу, епіскапу магілёўскаму **Георгію Каніскаму.**
5. Магілёў. Помнік-бюст вучонаму-археолагу **Мікалаю Турбіну.**
6. Магілёў. Помнік беларускаму краязнаўцу, грамадскаму і дзяржаўнаму дзеячу, магілёўскаму губернатару **Аляксандру Дамбавецкаму.**
7. Мсціслаў. Помнік або мемарыяльны знак мсціслаўскаму старасту, палітычнаму і культурнаму дзеячу ВКЛ **Мікалаю Тадэвушу Лапацінскаму.**
8. Мсціслаў. Помнік-бюст гісторыку, этнографу, археолагу, выдаўцу, грамадскаму дзеячу **Адаму Кіркору.**
9. Чавусы. Помнік-бюст мовазнаўцу-лексікографу, фалькларысту, этнографу **Івану Насовічу.**

Чаму ў школе нельга грукаць дзвярыма?

Выкладчыкі Вілейскай ДШМ: “Металічны шчуп прайшоў скрозь бэльку літаральна наскрозь”.

Базіс рэгіёна: установа культуры ў “інтэр’еры” горада

Вядучая роля ў працы па выхаванні маладых талентаў сярод установаў культуры рэспублікі належыць дзіцячым школам мастацтваў. Вілейка ў гэтым плане не выключэнне, а наадварот — яскравы прыклад таго, як у малым горадзе можна стварыць некалькі унікальных творчых калектываў, запатрабаваных і вядомых не толькі ў раёне і вобласці, але літаральна ва ўсёй Беларусі. Калі з дзецьмі працуюць неабыякавыя людзі, калі настаўнікі сапраўды перажываюць за няўдачы і поспехі сваіх навучэнцаў — толькі тады можна весці гаворку пра мэтанакіраваную перадачу назапашаных ведаў наступнаму пакаленню. Ці варта паўтарацца яшчэ пра тое, што дзеці — наша будучыня, што дзейнасць установаў, у тым ліку і навучальных, падпарадкаваных Міністэрству культуры, накіравана, у тым ліку, і на выкананне Прэзідэнцкай праграмы “Дзеці Беларусі”?

Зразумела, у той установе, дзе зроблены адпаведныя захады па паляпшэнні ўмоў навучання, журналісту толькі і застаецца паглыбляцца ў вывучэнне менавіта мастацкіх і педагагічных бакоў дзейнасці. Але цяпер гаворка — пра дыяметральна адваротную сітуацыю: у горадзе над Віліяй навучэнцы і выкладчыкі мясцовай ДШМ працуюць, у тым ліку, і ў будынку, што знаходзіцца ў аварыйным стане...

Пра Вілейку наша газета пісала апошнім разам у кастрычніку мінулага года. Што ж змянілася або з’явілася новага ў Вілейцы за гэтыя паўгода? У гарадскім Доме культуры летась прайшоў касметычны рамонт глядзельнай залы, былі заменены крэслы, асвятляльная апаратура. Па словах дырэктара ГДК Васіля Сляпцова, цяпер праводзіцца тэндэр, каб увосень зрабіць новае “адзенне” для сцэны, а на лета запланавана замена аконных блокаў на фасадзе ўстановы культуры.

У мясцовым краязнаўчым музеі на пачатку мая адкрыўся новы раздзел экспазіцыі “Пакуты”, прысвечаны Першай сусветнай вайне. Рыхтуецца горад і да святкавання 65-годдзя з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У ліпені з гэтай нагоды будзе ўсталяваны бюст Азі Асланава — двойчы Героя Савецкага Саюза, які камандаваў танкавай брыгадай, што вызваліла Вілейку.

Карацей, станоўчых з’яў у культурным жыцці горада хапае. А вось дзіцячая школа мастацтваў, якой сёлета спаўняецца 56 гадоў, агульны партрэт Вілейкі аптымістычнымі фарбамі ніяк не ўпрыгожвае. Хоць ДШМ і мае слаўную гісторыю. Сярод найбольш вядомых яе выпускнікоў — народны артыст Беларусі, прафесар, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага аркестра народных інструментаў імя І.Жыновіча Міхаіл Казінец, саліст ансамбля “Россия” пад кіраўніцтвам Людмілы Зыкінай — Дзмітрый Шкет. Далёка за межамі Міншчыны вядомы лаўрэат міжнародных конкурсаў, узорны духавы аркестр і ўзорны дзіцячы хор “Cantus”...

“Не фатаграфуйце!”

На вілейскай вуліцы Вадап’янава звярнуў увагу на шматок паперы, прылеплены да акна аднаго з будынкаў. Імправізаваная “шыльда” сцвярджала, што тут размешчана Дзіцячая школа мастацтваў. Вырашыў зайсці... І быў зусім не прыемна ўражаны тым, што ўбачыў за дзвярыма: у вялікім двухпавярховым будынку, відавочна, збудаваным не адно дзесяцігоддзе таму, вяліся рамонтныя работы, у вочы кідаліся пашкуматаныя сцены, толькі што пракладзеная праводка... А сярод гэтага “гармідару” чуліся гукі духавых інструментаў...

Толькі дастаў фотаапарат, каб зафіксаваць незвычайнае суіснаванне музыкі і рамонту, як вахцёрка, якой, дарэчы, на ўваходзе паказаў журналісцкае пасведчанне і патлумачыў мэту прыходу, катэгарычна забараніла фатаграфаваць:

— Без начальства — не дазволю! — сказала яна мне.

Спрачацца, зразумела, не захацеў. Завітаў да дырэктара Вілейскай школы мастацтваў Анатоля Шагава ў цэнтральны будынак гэтай установы, што месціцца непадалёк на той жа вуліцы. З дапамогай кіраўніка ДШМ вахцёрскае “табу” на фотаздымкі было адразу ж скасавана. Яны, спадзяюся, і перададуць уражанне ад будынка, дзе цяпер паралельна вядзецца рамонт і адначасова ладзяцца заняткі. Выкладчыкі ж, з якімі давялося паразмаўляць, кажуць, што ўжо прывыклі да такога становішча, але, канешне ж, марыць пра заканчэнне рамонтных работ. Асабліва ж здзівіла цярплівасць тых хлопцаў і дзяўчат, якіх давялося пабачыць у навучальных пакоях і якім прыходзіцца навучацца ў такіх небяспечных умовах.

Таму першае пытанне, якое я задаў дырэктару, было, натуральна, пра сітуацыю са школай.

Рамонт, рамонт, рамонт...

Паводле слоў Анатоля Шагава, заслужанага дзеяча культуры Беларусі, гісторыя з памяшканнямі Вілейскай школы мастацтваў доўжыцца ўжо шмат гадоў. Адразу выпаўстагоддзя, безумоўна, састарэў, дырэкцыю і навучэнцаў ніякім чынам не здавальняе.

— Я на пасадзе кіраўніка ДШМ працую больш за 20 гадоў і цягам гэтага часу заўжды імкнуўся павялічыць колькасць навучэнцаў: калі раней іх было 150, дык цяпер 320 — на асноўных аддзяленнях і 40 — на падрыхтоўчым. Таму, зразумела, востра паўстала пытанне пра іншы, больш зручны школьны будынак. З гэтым пытаннем я неаднаразова звяртаўся да раённых улад.

Нельга сказаць, што захады дырэктара не былі падтрыманы. Прыкладна ў канцы 1989 — пачатку 1990 гг. школа атрымала будынак зачыненага дзіцячага садка ў аварыйным стане. Быў праведзены неабходны рамонт, пасля чаго тут размясцілася духавое аддзяленне, а таксама аддзяленне эстэтычнага выхавання. Частка “духавікоў” займела невялікі будынак побач, што з’яўляўся раней кухняй дзіцячага садка. Харэаграфічнае аддзяленне размясцілася ў двух пакоях новага Дома культуры Вілейкі.

А на пачатку 1990-х школа мастацтваў атрымала будынак гарвыканкама, які перабраўся ў колішні гмах райкама партыі, што месціцца ў цэнтры горада. У 2003 годзе гарвыканкамаўскія памяшканні былі адрамантаваны, і цэнтральны будынак мастацкай школы цяпер выглядае прыстойна.

Але, як кажа Анатоль Аляксандравіч, цалкам праблему гэта не вырашыла, таму што змясціць усіх навучэнцаў у досыць невялікім цэнтральным будынку, а таксама ў былых памяшканнях дзіцячага садка, пакоях новага ДК і драўляным будынку па вуліцы Маркава — не ўдалося...

270 подпісаў — замала?

Пойдзем далей. З 2003 года апошні з названых карпусоў прызнаны экспертнай камісіяй Інстытута “Мінскграмадзянпраект” аварыйным, а з 2005 года далейшая эксплуатацыя гэтага будынка пастановай № 2 Дзяржпажарнагляду з 1 красавіка 2005 года была ўвогуле забаронена, хоць потым дырэкцыі ўдалося ліквідаваць недахопы і зняць прэтэнзіі пажарнікаў... Шматлікія звароты Анатоля Шагава да раённых, абласных улад з просьбай аб прадастаўленні новых памяшканняў для ДШМ так нічога і не змянілі: заняткі працягваліся, нягледзячы на прамую рызыку для дзяцей і выкладчыкаў. Дайшло нават да таго, што Анатолю Аляксандравічу давялося тады ж, чатыры гады таму, збіраць подпісы бацькоў навучэнцаў, каб стары будынак школы зачынілі. Хоць і падпісаліся 270 чалавек, справу гэтая акцыя не зрушыла з месца.

1.

2.

3.

4.

5.

І толькі летась пачаліся хоць і невялікія, але змены. Паводле рашэння раённых улад, аддзелу культуры быў перададзены будынак старога Дома культуры, што знаходзіўся перад тым на балансе аддзела адукацыі, каб з цягам часу размясціць там духавое аддзяленне школы мастацтваў. У гэтым навучальным годзе тут адбываліся заняткі: частка “духавікоў” летась пераехала сюды з памяшканняў былога дзіцячага садка (цяпер усе пакоі ў ім займае “Цэнтр мастацкай творчасці навучэнцаў”, які быў ператвораны ў асобную ўстанову з аддзялення эстэтычнага выхавання ДШМ і доўгі час суседнічаў з музыкантамі), а другая частка так і вучыцца ў будынку былой кухні.

Але будынку 1930-х гадоў па вуліцы Вадап’янава таксама неабходны рамонт. Я ў гэтым пераканаўся, пачаўшы менавіта з гэтага адраса сваё знаёмства з ДШМ. Як кажа начальнік аддзела культуры Сяргей Паўлоўскі, летась для ДШМ (“раскідана” яна сёння па пяці месцах) выдаткавана каля 150 мільёнаў рублёў, сёлета — яшчэ каля 200. На гэтыя грошы ў старым ГДК па Вадап’янава быў зроблены рамонт да-

ху, даведзены да ладу некалькі кабінетаў, заменены праводка і сантэхніка.

Па словах Анатоля Шагава, сёлета было прынята рашэнне аб тым, каб правесці экспертызу аб мэтазгоднасці далейшай эксплуатацыі будынка па вуліцы Вадап'янава. Вердыкт — стан тэхнічных канструкцый адпавядае нормам. Але ў сувязі са змяненнем


6.

9.

11.

13.

7.

На здымках: Карпусы Вілейскай ДШМ: 1. Аварыйны будынак на вуліцы Маркава; 4. У колішняй кухні дзіцячага садка цяпер месцяцца "духавікі"; 8. Будынак былога ГДК; 12. У новым ГДК школа мае толькі адзін пакой; 13. Цэнтральны будынак ДШМ; 2, 3. Пусты кабінет на другім паверсе і дзіркі ў сценах у будынку па вуліцы Маркава; 5. 270 подпісаў, сабраных бацькамі навучэнцаў; 6, 9. Рамонт у будынку былога ДК у разгары; 7. Складское памяшканне на другім паверсе па Маркава; 10. Шматлікія звароты дырэкцыі аб аварыйным стане будынка; 11. Заняткі вядуцца ў будынку на вуліцы Вадап'янава адначасова з рамонтам.

8.

12.


10.

функцыянальнага прызначэння будынка патрабуецца капітальны рамонт. Цяпер упраўленне капітальнага будаўніцтва рыхтуе праектна-каштарысную дакументацыю. За яе неабходна будзе заплаціць прыкладна 40 з 200 мільёнаў, якія выдаткаваны школе мастацтваў. Таму і дырэктар, і начальнік аддзела культуры Сяргей Паўлоўскі, і намеснік старшыні Вілейскага райвыканкама Мікалай Кароткі кажуць, што рамонт зацягнецца яшчэ не на адзін год.

— Я рэаліст, — кажа Анатоль Шагаў. — Дай Бог, каб мы ўкладаліся ў чатырохгадовы тэрмін. Думаю, каб адрамантаваць фасад будынка, усе класы і кабінеты, глядзельную залу, замяніць падлогу, спатрэбіцца блізу 750 мільёнаў...

Інакш лічыць кіраўніцтва раёна. На думку Сяргея Паўлоўскага і Мікалая Кароткага, на рамонт былога ГДК спатрэбіцца меншая сума: ад 250 да 300 мільёнаў рублёў.

А як жа быць навучэнцам у аварыйным корпусе на Маркава? Па словах Мікалая Кароткага, будуць прыкладзены ўсе намаганні, каб навучэнцы выселіліся адтуль як мага хутчэй. Але адбудзецца гэта, зразумела, толькі пасля капітальнага рамонту перададзенага на баланс аддзела культуры будынка. Карацей, як у вядомай песні, і туды гара, і сюды гара...

"Як вы тут працуеце?.."

Пытанне, вынесенае ў назву гэтага раздзела, неаднаразова задаваў тым выкладчыкам, якія вымушаны ісці кожны дзень на працу ў будынак, што знаходзіцца ў аварыйным стане.

Дарэчы, гэта не толькі маё пытанне. Прыкладна такія словы былі сказаны адным з членаў камісіі Інстытута "Мінскграмадзянпраект", якая правярала стан перакрыццяў у корпусе ДШМ. Амаль кожны супрацоўнік школы згадваў несуцяшальную гісторыю: калі правяралі перакрыцці, дык металічны шчуп, якім ударылі ў бэльку ў паддашшы, прайшоў літаральна наскрозь!.. Пасля гэтага члены камісіі засведчылі наступнае: у такім будынку працаваць нельга...

— Як жывём? Як бачыце. Выжываем. І сапраўды, страшна часам бывае. Нехта грукне дзвярыма — і бачна, як дрыжаць сцены. Абяцаюць кожны год, што мы пераедзем, але абяцанні так і застаюцца абяцаннямі, — кажа выкладчык школы Уладзімір Лапцік.

— У памяшканнях — вельмі холадна, праз дзіры і шчыліны дзьме вецер, вокны старыя і, канешне ж, не могуць утрымаць цяпла або засцерагчы ад холаду, — дадае выкладчыца Аксана Зюбіна.

Я пахадзіў па школе. На першым паверсе бачны шматлікія трэшчыны, шчыліны на сценах, а на столі — плямы ад вады, якая заліваецца з другога паверха, бо працякае дах. Як кажуць супрацоўнікі, пад час вялікага дажджу яны выстаўляюць у шмат якіх месцах на другім паверсе тазы і вёдры, каб не было патопу. Але, канешне, справу гэтыя паўмеры не вырашаюць.

Што да другога паверха, дык разруха там яшчэ большая. Акром шматлікіх шчылін і дзірак, няўзброеным вокам відаць: падлога ў некаторых кабінетах знаходзіцца пад вуглом. Мне распавялі: аднойчы, пасля таго, як у адным пакоі сабралі аркестр, дык на першым паверсе заўважылі, што столь пачала прагінацца. Тады і было прынята рашэнне праводзіць рэпетыцыі на першым паверсе, перанесці ўсе фартэп'яна ўніз і ўвогуле зачыніць другі паверх для навучэнцаў... Заняткі цяпер праходзяць толькі на першым, і, зразумела, месца для ўсіх не стае.

Аркестр народных інструментаў, што таксама займаецца ў гэтым будынку і складаецца з 20 удзельнікаў, вымушаны праводзіць свае рэпетыцыі ў холе. Заўсёдныя скразнякі і адчыненыя дзверы здароўя дзецям не дадаюць.

Сумна было глядзець на пустыя класы, на старыя інструменты, якія адміністрацыя складзіруе ў невялічкім пакойчыку на другім паверсе. Але пагаджаюся з выкладчыкамі: працаваць у такім будынку страшна.

Праблема аварыйнага будынка Вілейскай ДШМ патрабуе неадкладнага вырашэння, і не гаварыць аб гэтым трэба, а крычаць, бо дзеці і выкладчыкі (а іх, нагадаю, толькі ў корпусе на Маркава пад сто чалавек) дасюль працуюць у такіх умовах і ходзяць кожны дзень, літаральна кажучы, нібыта па лязе нажа...

У кухні — з духавымі інструментамі

Завітаў і ў невялічкі будынак былой кухні дзіцячага садка, у двух пакойчыках якога навучаецца каля 20 падлеткаў. Цесна і чуваць усё, што робіцца ў суседнім пакоі. Якая ж тут можа быць гаворка пра выкананне нормаў па гукаізаляцыі і сапраўднае навучанне?

Ды і сам будынак патрабуе неадкладнага рамонту. Калі галоўны фасад выглядае яшчэ нішто сабе, дык з боку двара тынкоўка адвалілася ад сцен.

— Нам таксама абяцаюць, што мы хутка пераедзем. Кожны год пачынаецца з таго, што прыходзім да дырэктара і пытаемся, калі будзе пераезд або рамонт. Але абяцанні так і застаюцца толькі словамі, — распавялі мне выкладчыкі.

Каменціраваць гэтую сітуацыю не буду. Але звярну ўвагу яшчэ на адну праблему, якая паўстае з-за таго, што Вілейская школа мастацтваў фактычна раскідана цяпер па пяці розных месцах. Як расказала намеснік дырэктара школы па вучэбна-выхаваўчай рабоце Ірына Балуш, часам адбываецца так, што два заняткі ў школьнікаў праходзяць у розных будынках. Напрыклад, тэарэтычны курс — у адным, а практычны — у другім. І мала бяды, калі вясна і лета, а вечарам даволі светла. А вось зімой, а таксама ў асеннія месяцы гэта, канешне, стварае праблемы, звязаныя з бяспекай юных пешаходаў.

Жыццё насуперак

Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, Вілейская школа мастацтваў працягвае жыць. За мінулы год і за першы квартал бягучага ўдзельнікі дзіцячага хору "Cantus" і духавога аркестра, а таксама народнага хору "Любанія" неаднаразова пацвярджалі высокае выканальніцкае майстэрства. На конкурсе юных піяністаў Мінскай вобласці Настасся Раманоўская стала лаўрэатам І ступені, а яе сястра Марыя сёлета ўдзельнічала ў II Міжнародным конкурсе маладых піяністаў "Nad Kamenna", што праходзіў у Польшчы, і заваявала дыплом II ступені. Летась на абласным конкурсе выканаўцаў духавых інструментаў навучэнец Мікіта Мяцельскі быў адзначаны дыпломам І ступені. Напрыканцы 2008 года дзіцячы хор "Cantus" прымаў удзел у VIII фестывалі народнай творчасці "Напеў зямлі маёй", дзе быў уганараваны Гран-пры — аўтамабілем "газель". Можна было б пагаварыць і пра самога Анатоля Шагава — унікальнага хормайстра, заслужанага дзеяча культуры Беларусі...

А ўявіце, як павялічылася б вынікавасць спраў у ДШМ, калі б дырэктара не турбавалі рамонтныя клопаты, каб не было непакою за лёс і, паўтаруся, за здароўе дзяцей і настаўнікаў, якія дасюль вучацца і працуюць у аварыйным будынку па вуліцы Маркава... Нездарма ж, як прызнаваўся мне дырэктар, ён не можа спакойна спаць па начах...

— Нармальны варыянт — гэта будынак, дзе школа, дзе ўсе — і выкладчыкі, і навучэнцы — сабраны пад адным дахам, дзе не трэба бегаць па горадзе, каб пабачыць, як наладжаны навучальны працэс, — гаворыць Анатоль Шагаў. — Бо калектыў супрацоўнікаў і навучэнцаў — гэта адна сям'я, якая не можа жыць у розных месцах...

***

"Я спадзяюся, што публікацыя ў газеце "Культура" нейкім чынам паспрыяе вырашэнню праблемных пытанняў Вілейскай школы мастацтваў. Бо ў мяне баліць сэрца за маіх навучэнцаў, і, зразумела, тыя ўмовы, у якіх мы вымушаны працаваць, — гэта не тое, што павінна быць у нашых дзяцей", — сказаў мне на развітанне Анатоль Шагаў.

Цалкам пагаджаюся з дырэктарам і таму яшчэ раз стаўлю пытанне: калі ж будынак па Маркава будзе ўсё ж такі зачынены для наведвальнікаў? Калі завершыцца рамонтная эпапея? Чаму маўчаць прадстаўнікі тых мясцовых дзяржаўных органаў, якія адказваюць за тэхнічны стан гарадскіх будынкаў? Бо дасюль пытанне са школай мастацтваў у Вілейцы не вырашана. Да таго ж, і з заканчэннем рамонту Дзіцячая школа мастацтваў усё роўна будзе раскідана па некалькіх месцах. Можа, сапраўды варта падумаць над увасабленнем у жыццё мары дырэктара пра адзіны будынак для ДШМ?

А вось меркаванне начальніка аддзела тэхнічнага нагляду за капітальным рамонтам упраўлення культуры Мінскага аблвыканкама Таццяны Дубік, якая ў курсе сітуацыі з Вілейскай ДШМ. Яна пераканана, што недапушчальна, калі ў аварыйным будынку праходзяць заняткі і вучацца дзеці. Раённыя ўлады павінны адшукаць часовыя памяшканні, каб размясціць там навучэнцаў да таго часу, пакуль рамонт былога ГДК па Вадап'янава не завершыцца.

Дадам ад сябе, што лета — якраз той час, калі можна ажыццявіць усе пярэбары і рамонтныя работы. А наша газета будзе пільна сачыць за вырашэннем небяспечнай сітуацыі, якая склалася ў Вілейцы.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Вілейка — Мінск
Фота аўтара

Вядучы рубрыкі — Канстанцін АНТАНОВІЧ

Зорнае неба народных строяў



Якое святло палескай жырандолі?

Музей старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Акадэміі навук Беларусі нядаўна адзначыў 30-годдзе. За апошні час яго фонды папоўніліся цікавымі каштоўнымі прадметамі. Сёння гэтая музейная ўстанова займае пасля Нацыянальнага мастацкага музея і Нацыянальнага музея гісторыі і культуры ганаровае трэцяе месца ў краіне па колькасці захоўваемых тут унікальных экспанатаў.

Як адзначыў дырэктар Музея Барыс Лазука, сёння асноўную масу навінак складаюць падарункі, што дорыць мясцовае насельніцтва пад час экспедыцый. Ёсць энтузіясты, якія сябруюць з музеем, і, выпадкова знаходзячы цікавыя рэчы, прыносяць іх да супрацоўнікаў Інстытута. Вядома, шмат цікавага даюць навуковыя экспедыцыі.

Па словах Барыса Андрэевіча, за мінулыя два гады было ажыццёўлена некалькі экспедыцый на Піншчыну. Пад час адной з такіх паездак удалося адшукаць абраз XVII стагоддзя з выявамі Ісуса, Маці Божай і Іаана Хрысціцеля. Ікона мела вялікія пашкоджанні, таму давялося яе закансерваваць, замацаваць фарбавы слой. Цяпер абраз прадстаўлены на выстаўцы, прысвечанай 30-годдзю музея. Таксама з экспедыцый навукоўцы часам прывозяць і цікавыя скульптурныя прадметы. Напрыклад, пасля паездкі на Палессе музей папоўніўся на разное драўлянае ўкрыжаванне, а таксама металічную напольную жырандолю XIX стагоддзя.

Наведаўшы музей, можна пераканацца, што аўтэнтычныя рэчы знаходзяцца ў вельмі добрым стане. Калі глядзіш на вопратку, дык ствараецца ўражанне: гэта ж зроблена зусім нядаўна! Насамрэч, многім прадметам па 100 — 200 гадоў. Праўда, яны, па словах дырэктара Музея, перш чым трапіць у экспазіцыю, праходзяць вялікую рэстаўрацыю. "У нас ёсць жаночая світка, — адзначае Барыс Лазука. — Дык вось, калі яна трапіла да нас, праз яе можна было глядзець на зорнае неба і ўсе зорачкі ўбачыць: столькі там аказалася дзірачак. А цяпер складана нават уявіць, што на тканіне меліся значныя пашкоджанні, — настолькі добрая была праведзена рэстаўрацыя".

Дарэчы, значныя сродкі штогод выдаткоўваюцца менавіта на аднаўленне экспанатаў. І хоць у музеі працуе толькі адзін рэстаўратар, сур'ёзная праца ажыццяўляецца "Мінскрэстаўрацыяй". Да таго ж, кіраўніцтва музея ўскладае вялікую надзею на першыя выпускі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, нядаўна адкрытай спецыяльнасці, дзе рыхтуюць рэстаўратараў, у тым ліку — вучаць аднаўленню твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, адзення. Да таго ж, цяпер і Акадэмія мастацтваў таксама пачала рыхтаваць спецыялістаў гэтага профілю.

Што да планаў, дык у бліжэйшы час плануецца ажыццявіць рэканструкцыю музея. У адной з залаў мяркуецца размясціць экспанаты на двух узроўнях, паказаць археалагічныя рэчы як бы ў натуральных умовах, культурныя слаі, дзе яны знаходзяцца. Плануецца выкарыстанне новых тэхнічных сродкаў: камп'ютэраў, экранаў, на якіх можна будзе ўбачыць іншыя прадметы, новае размяшчэнне сакральных твораў, прадметаў этналагічных калекцый. Гэта ўсё будзе ажыццёўлена этапамі.

У музеі традыцыйна збіраліся і збіраюцца помнікі этнаграфіі: народныя строі, прадметы побыту, тканіны. А вось адмысловым пошукам прадметаў побыту гараджан, іх матэрыяльнага атачэння, на жаль, не займаліся. "Мы толькі пачалі збіраць падобныя прадметы, у тым ліку даваенны і пасляваенны касцюмы. Трэба прыкладаць намаганні, каб не згубіць гэты пласт", — падкрэсліў Барыс Лазука.

Немагчыма абмінуць і яшчэ адзін музейны клопат. Музей — добра вядомая і паважаная ўстанова, аднак ён не адкрыты для шырокага наведвальніка... Па словах дырэктара, музей знаходзіцца ў структуры Інстытута мастацтвазнаўства, таму абслугоўваюць яго супрацоўнікі аддзела старажытнабеларускай культуры. Але, тым не менш, у дзень праводзіцца па 2 — 3 экскурсіі, бываюць і асобныя наведвальнікі. Усяго ж штогод музей наведвае 3 — 4 тысячы чалавек.

"Але сёння музей пашырае свае межы. Не так даўно прайшла выстаўка касцюмаў і прадметаў побыту ў Заслаўі, адбылася выстаўка ў Ерэване пад час Дзён культуры Беларусі ў Арменіі. Да цікавых выставак можна аднесці экспазіцыю ў Слуцку: мы туды адвезлі слуцкі пояс і фрагменты паясоў. Выстаўка называлася "Ноч са слуцкім поясам". Прыехалі ў Слуцк на спецыяльным транспарце, з аховай, — расказвае Барыс Андрэевіч, — і самае вялікае ўражанне пакінула тое, якую зацікаўленасць у жыхароў горада выклікала падзея: да дзвюх гадзін ночы амаль паўтары тысячы чалавек паглядзела выстаўку. Сёлета слуцкія музейшчыкі збіраюцца сфарміраваць новую экспазіцыю. Цяпер у гэтым горадзе плануецца прадставіць сакральнае мастацтва: абразы, старадрукі, прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва".

Наталля КІРПІЧЭНКАВА

На здымках: экспанаты Музея старажытнабеларускай культуры.

Фота Юрыя ІВАНОВА

Неаднаразова на старонках "К" даследаваліся таямніцы і нечаканыя знаходкі з розных куткоў Беларусі. Сёння паспрабуем разабрацца ў сімволіцы загадкавых пяці калон, што размешчаны ў горадзе Петрыкаве Гомельскай вобласці.

Геаметрыя петрыкаўскіх калон

Кампазіцыя з "прызмы", "васьмікутніка" і "дзяржавы"

Калоны, помнік гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, для свайго "ўзросту" захаваліся даволі нядрэнна. Паводле звестак кнігі "Памяць", яны былі пабудаваны на могілках у знак пратэсту супраць трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай у 1795 годзе, — але час і вандалы пакінулі на іх свае адзнакі: ад лішайніку амаль зусім абсыпалася тынкоўка і пачала разбурацца цэгла, садраныя шыльды з надпісамі вымушаюць толькі здагадвацца пра сапраўднае значэнне помніка. На жаль, больш звестак пра калоны, што "перажылі" вайну 1812 года, рэвалюцыю, дзве сусветныя вайны, няма.

Пасля першага ўражання ад узросту калон у вочы кідаецца незвычайная разнастайнасць геаметрычных форм: куб, цыліндр, трохгранная прызма, васьмікутнік, што стварае атмасферу нябачнага храма і дадае адчуванне сувязі з невядомым архітэктарам. Паспрабуем прачытаць хаця б відавочныя сімвалы, зашыфраваныя ў застылай мове калон.

Тры з пяці петрыкаўскіх калон.

Адна з іх, прыкладна чатыры метры ў вышыню, мае форму цыліндра, умацаванага на чатырохкутнай аснове. Дзве іншыя вельмі падобны да першай, але замест цыліндра тут — васьміграннік. Астатнія дзве калоны значна вылучаюцца на агульным фоне: першая — цыліндрычная будова, увянчаная яблыкам-дзяржавай; другая ўяўляе з сябе трохгранную прызму на чатырохкутнай аснове. Дарэчы, такі пастамент характэрны для ўсіх калон. Цікавасць выклікае і размяшчэнне: "прызма", "васьмікутнікі" і "дзяржава" знаходзяцца побач, утвараючы пэўную кампазіцыю, а адна з калон вынесена далёка ў левы бок.

Звернемся да самых прыкметных калон: наяўнасць вянца ў выглядзе дзяржавы сімвалізуе завершанасць увасобленай у гэтай забудове думкі аўтара.

Інсігнія, ці сімволіка вышэйшай манархічнай улады, уяўляе з сябе ўвянчаную крыжам сферу з каштоўнага металу, паверхня якой упрыгожана самацветамі і святой сімволікай. Дзяржавы, або дзяржаўныя яблыкі (як называлі іх на Русі), сталі атрыбутамі ўлады шэрагу заходнееўрапейскіх манархаў задоўга да ўступлення на царства Барыса Гадунова (1698), аднак уводзіны іх ва ўжытак рускіх цароў не варта лічыць безумоўным перайманнем. Запазычанай магла аказацца толькі рэчыўная частка рытуалу, але не яго глыбіннае значэнне і сімволіка самога "яблыка".

Іканапіснай правыявай дзяржавы з'яўляюцца зярцалы архангелаў Міхаіла і Гаўрыіла — як правіла, залатыя дыскі з інцыяламі Ісуса Хрыста або паясным малюнкам Эмануіла. Такое зярцала, а ўслед за ім і дзяржаўны яблык, сімвалізуе Царства Нябеснае, улада над якім належыць Ісусу Хрысту і праз абрад памазання "дэлегуецца" праваслаўнаму цару. Той абавязаны прывесці свой народ на апошнюю бітву з Антыхрыстам і перамагчы яго ваяроў.

Гэтае ўкладзенае ў дзяржаву містыка-дагматычным светапоглядам рускіх людзей XVI стагоддзя хрысціянскае эсхаталагічнае ўтрыманне, нікім пасля не аспрэчанае, наводзіць на думку аб невыпадковым размяшчэнні калон на могілках. Што гэта? Знак прысягі пахаваных тут архангелам і Богу?

Калі правыявай дзяржавы з'яўляюцца зярцалы (перакладаецца са стараславянскай не толькі, як "люстэрка", але таксама як "трохгранная прызма" (!), з арлом наверсе і з трыма ўказамі Пятра I на гранях) у руках архангелаў, дык становіцца відавочнай сувязь сімволікі першай і другой калон (нагадаем, што другая ўяўляе з сябе трохгранную прызму). У сваю чаргу, васьміграннік (пачатак ператварэння квадрата ў круг і наадварот) у шматлікіх культурах сімвалізуе няўстойлівасць, пераход з аднаго стану ў іншы, ад матэрыяльнага да духоўнага.

Цяпер цяжка сказаць, ці былі на калонах якія-небудзь упрыгожанні, але нельга выключаць такую магчымасць, як і спыняць далейшае даследаванне гэтага аб'екта нашай гісторыі.

Ірына ЗАНКЕВІЧ,

супрацоўнік Нацыянальнага парку "Прыпяцкі"

Петрыкаў

Што пад шапачкай слуцкага "пеўніка"?

Па грыбы ў... XI стагоддзе

Адным з самых першых заняткаў, што дапамагалі выжыць першабытнаму чалавеку, у тым ліку і нашым продкам, было збіральніцтва. Аднак мала хто здагадваецца, што за ягады і грыбы былі ў даўніну ў беларускіх лясах.

Пра тое, што жыхары старадаўніх Полацка, Віцебска, Мінска, Брэста збіралі грыбы, сведчаць некаторыя археалагічныя знаходкі. Напрыклад, у час раскопак трапляліся рэшткі посуду менавіта для такога занятку: берасцянкі, лубкі, кашы. Але, каб трапляліся самі грыбы, пра тое наўрад ці хто думаў.

Між тым, у культурным слоі сярэднявечнага Віцебска, які вельмі добра захоўвае рэчы арганічнага паходжання, у пласце XIII — XIV стст. знойдзены грыбы-порхаўкі. Расліны гэтыя добра захаваліся, маюць карычневы колер. Іх памеры — 3,5-4 на 4,2-5,5 сантыметра. З якой мэтай ужываліся гэтыя грыбы? З народнай медыцыны вядома, што порхаўкамі загойвалі раны, парэзы, язвы. Хутчэй за ўсё, з гэтай нагоды збіраліся яны і ў той час.

Але, бадай, найбольш цікавай з'яўляецца знаходка грыба ў пласце XI — XII стст. з раскопак старажытнага Слуцка. Па вызначэнні старшага навуковага супрацоўніка Інстытута эксперыментальнай батанікі НАН Беларусі Г.І. Сяржанінай, знойдзены ў Слуцку грыб адносіцца да так званых "пеўнікаў". Гэта ядомы грыб, але рэдкі. Народныя назвы гэтага грыба — "пеўнік", "курачка", "лось". Па знешнім выглядзе гэтыя грыбы падобны да лісічак, але большых памераў, маюць карычневы колер і цёмна-карычневыя лусачкі на версе шапачкі. З адваротнага боку шапачка грыба мае светла-карычневыя ці крэмавыя шыпікі. Расце такі грыб пераважна ў сухіх хвойных лясах.

Знойдзены ў Слуцку пры раскопках ласіны грыб добра захаваўся. Яго вышыня — 5 сантыметраў, памеры шапкі — 9 на 9,5 сантыметра, таўшчыня ножкі — 2,5 на 3 сантыметры.

Варта адзначыць, што ласіныя грыбы па смаку не саступалі сённяшнім баравікам ды падбярозавікам. А ўжывалі іх у вараным і смажаным выглядзе, а таксама — салілі. Не выключана, што гэтыя грыбы пастаўляліся і на экспарт.

Леанід КАЛЯДЗІНСКІ,

кандыдат гістарычных навук, археолаг

На здымках: ласіны грыб з раскопак Слуцка XI — XII стст.

“Залатая пчолка — 2009”: калі спяваюць дзеці…

Захар Снапкоў.

Віталь Грышанаў.

Гран-пры — у Данілы Казлова з Жабінкі.

Артысткам з Кыргызстана даспадобы саламяныя брылі.

Атолі Харковіч.

У 1995 годзе па ініцыятыве намесніка старшыні Клімавіцкага райвыканкама Івана Баршчова адбылося свята радасці. Назвалі яго “Залатая пчолка”. Нездарма ж на гербе Клімавічаў выяўлена залатая пчала! У 2000-м фестываль стаў міжнародным… Сёлета ж 1100 хлопцаў і дзяўчат з 11 краін свету прыехалі ў Клімавічы, дзе з 28 па 31 мая праводзіўся, ужо дзевяты па ліку, Міжнародны фестываль дзіцячай творчасці “Залатая пчолка”.

Само надвор’е, падалося, спрыяла фестывалю. У Мінску і Магілёве ліў дождж, па-над Клімавічамі — ані аблачынкі. Мясцовы жыхар Аляксей Ляцко казаў мне: маўляў, цуды прыроды нават азадачваюць сіноптыкаў.

Кампетэнтнае журы пад старшынствам народнага артыста Беларусі Валерыя Іванова за тры дні праглядзела-праслухала сотні юных артыстаў і вызначыла пераможцаў. Вядома, справа гэтая — няпростая, бо ўдзельнікі здзіўлялі пастаянна. Прыкладам, самы юны ўдзельнік фестывалю — Захар Снапкоў сказаў пад апладысменты гледачоў: “Зорны сад я мару раскінуць на нашай планеце, каб малявалі яго ўсе дзеці на свеце. Няўжо я шмат жадаю?”

Трэба адзначыць, што сцэнарый свята стварылі таленавітыя аўтары і цікавым ён быў аднолькава і дзецям, і дарослым. Мо таму начальнік упраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Сінкавец сонечна ўсміхаўся?.. Зрэшты, гэта толькі падаецца, што ўсё было проста. А якая вялікая праца здзейснена, каб сёння лунаў у самой атмасферы Клімавічаў настрой “Залатой пчолкі”! Вось таму і ўсмешка Сінкаўца сапраўды абяззбройвала і нагадвала сонейка.

Запомнілася сёлетняя “…Пчолка” і шчырым прыёмам Вольгі Хаўранковай і Алены Дзіваковай, чый клопат незаўважна радаваў. Дарэчы, насельніцтва Клімавічаў тымі днямі значна папоўнілася жыхарамі бліжэйшых раёнаў. І было што паглядзець: на сцэне амфітэатра ў гарадскім парку — дзіцячыя калектывы з Расіі, Украіны, Казахстана, Кыргызстана, Польшчы, Малдовы, Румыніі, Турцыі, Балгарыі. Ну, а больш за ўсіх, вядома ж, — беларусаў.

Пагутарыў з гасцямі і членамі журы “Залатой пчолкі”, якія ахвотна дзяліліся ўражаннямі. Спявачка з турэцкай Анкары Чыідэм Гюрдал (яе муж Джэм — не ўпершыню ў журы) адзначыла высокі ўзровень выканаўцаў. Што да беларусаў наогул, дык Чыідэм адзначыла:

— Такіх шчырых людзей сустракаеш рэдка. Пасля майго выступлення да мяне на вуліцах падыходзілі, дзякавалі. Іх усмешкі доўга будуць суправаджаць мяне па жыцці.

Член журы фестывалю Уладзімір Скараходаў адзначыў, што дзённыя канцэрты фестывалю працягваліся салаўінымі спевамі-трэлямі. “Пэўна, тут — салаўіны край”, — заўважыў прафесар музыкі.

Мікалай Жукаў, музыка Клімавіцкага духавога народнага аркестра, удзельнічаў ва ўсіх папярэдніх “Залатых пчолках”. Цяпер ён падкрэсліў:

— Да наступнага, дзесятага, фестывалю аркестр рыхтуецца ўжо цяпер.

Штэфан Басцінэ з нямецкага Бінгена-на-Рэйне перадаў “Залатой пчолцы” грашовую суму, на якую набылі 150 мяккіх цацак для пераможцаў:

— Мне спадабаўся фестываль. Думаю, у наступным годзе тут выступяць дзеці з майго Бінгена-на-Рэйне, — адзначыў Штэфан.

Кіраўнік дэлегацыі Румыніі Іярдана Сакаўяну ў ацэнцы фестывалю была нешматслоўнай, але максімальна дакладнай: “Захапляльна!”

Старшыня Клімавіцкага райвыканкама Віталь Грышанаў надаў фестывалю максімум увагі, хаця клопатаў у яго, канешне, хапае. Вядома ж, асноўная задача — сельгасвытворчасць, але побач з эканамічнымі дасягненнямі ёсць станоўчыя вектары ў галіне культуры.

Сёлета на святочным шэсці ў дзень закрыцця фестывалю эмблему “Залатой пчолкі” несла вучаніца 8 класа Атолі Харковіч. Гонар ззяў у ейных вачах, астатнія ж удзельнікі шэсця ёй па-добраму зайздросцілі.

На той час міністр культуры Рэспублікі Беларусь Уладзімір Матвейчук назваў удзельнікаў фестывалю народнымі дыпламатамі. Верыцца: сяброўства юных, народжанае на беларускай зямлі, дасць у будучыні свае высакародныя плады.

Памятае Клімавіччына і подзвіг сваіх землякоў у гады Вялікай Айчыннай вайны. У вёсцы Малышкавічы нядаўна з’явілася вуліца імя брыгаднага камісара Васіля Васькіна, які загінуў у час баёў пад Клімавічамі. Хутка вуліца імя героя з’явіцца і ў райцэнтраўскай новабудоўлі.

Нечакана тэма подзвігу народа ў Вялікай Айчыннай атрымала свой працяг. Кіраўнік Управы раёна Ізмайлава Усходняй адміністрацыйнай акругі Масквы Сяргей Чаблакоў паведаміў: пад Вязьмай мясцовыя пошукавікі знайшлі медальён ураджэнца вёскі Краснаполле Клімавіцкага раёна — радавога Леаранцэвіча Георгія Мікалаевіча, 1912 года нараджэння.

Так, вайна пакідае шрамы ў нашай памяці…

Сёння ж на мірнай зямлі Беларусі гучаць песні. У адной з іх ёсць словы: “Когда поют солдаты, спокойно дети спят…”

А калі спяваюць дзеці, сэрца радуецца!

Юрый ІВАНОЎ,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Клімавічы — Мінск
Фота аўтара

P.S. *У дзень адкрыцця фестывалю “Залатая пчолка” ў старшыні Клімавіцкага райвыканкама Віталя Грышанава нарадзіўся сын. Хто ведае, мо на 15-й “…Пчолцы” мы пабачым Мікіту сярод удзельнікаў?*

Ю.І.

“Залатая пчолка” і ўсе-ўсе-ўсе!

Журы фестывалю .

Юлія Бутома (у цэнтры) і танцавальны ансамбль.

Віншаванне ад міністра культуры Уладзіміра Матвейчука.

У дні фестывалю ў Клімавічах праходзілі выпускныя.

Конкурс дзіцячага малюнка.

Алена Дзівакова.

Іярдана Сакаўяну.

Аляксей Ляцко.

Чыідэм Гюрдал.

Іван Баршчоў.


Дзмітрый Камбур.

Штэфан Басцінэ.

АК Афіша "К"

з 6 чэрвеня — да 13 чэрвеня 2009

МУЗЕІ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РБ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 227 45 62.

■ Мастацтва Беларусі XII — XIX стст.
■ Мастацтва Беларусі канца XIX — пач. XXI стст.
■ Мастацтва Расіі XVIII — пачатку XX стст.
■ Мастацтва краін Усходу XV — XX стст.
■ Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.
■ Выстаўка фатаграфіі **"Схаваная Японія"** Кідзюра Яхагі.
■ Выстаўка **"Традыцыйнае мастацтва Карэі"**.
■ Выстаўка **"Людзі Егіпта"** Вадзіма Качана.
■ Выстаўка **"Алтарны жывапіс XVIII — XIX стст."**.
■ Выстаўка В.Касцючэнкі **"Цяпло свету"**.
■ Выстаўка П.Асоўскага **"Рамантыка славянскіх земляў"**.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея РБ:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX ст.".

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 227 87 96.

■ Выстаўка фотаздымкаў XIX ст.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі р-н, Гродзенская вобл. Тэл.: (8–01596) 2 30 35.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА ў в.Раўбічы

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі р-н. Тэл.: 507 44 68.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка дзіцячай творчасці.

МУЗЕЙ ВІТОЛЬДА КАЭТАНАВІЧА БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ ў г.МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37. Тэл.: (8–0222) 22 48 87.

■ Пастаянная экспазіцыя.

МУЗЕІ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 227 43 22.

Экспазіцыі:
■ **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пачатку XX стст."**.
■ **"Старажытная Беларусь"**.
■ **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы"**.

Выстаўкі:
■ **"Халодная і агнястрэльная зброя"**.
■ **"Скарбніца мудрасці"**.
■ **"Невядомы Смаляк"** (персанальная выстаўка Андрэя Смаляка).
■ **"Крыніцы адвечнай прыгажосці"**.

Дом-музей I з'езда РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

■ Пастаянная экспазіцыя **"Гісторыя I-га з'езда РСДРП"**.
■ Выстаўка **"Чароўныя лялькі"**.

ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 15. Тэл.: 334 72 61.

Выстаўкі:
■ Выстаўка, прысвечаная 85-годдзю А.Савіцкага.
■ **"Спадарожнікі дзяцінства"**.
■ **"Хата — мой сусвет"**.
■ **"Жыццё Л.М. Талстога ў фатаграфіях сучаснікаў"**.
■ Выстаўка музейных прадметаў XI — XX стст. з фонду музея **"Вякоў мінулых успамін..."**.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

"Вызваленне Беларусі" *(хроніка вызвалення і мультымедыйная прэзентацыя аперацый Чырвонай Арміі па вызваленні Беларусі ў верасні 1943 — ліпені 1944 гг.).*

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца Румянцавых і Паскевічаў

Выстаўкі:
■ **"Агнястрэльная і халодная зброя краін свету"** (выстаўка макетаў).
■ **"Усмешка клоуна"** (з калекцыі М.Чалнакова).
■ **"Нараджэнне і адраджэнне"**.

Экспазіцыі:
■ **"Культавыя прадметы"**.
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"**.
■ **"Загадкавыя фантазіі мора"** *(грот палаца).*
■ Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.

Вежа палаца Румянцавых і Паскевічаў

Гісторыка-мемарыяльная экспазіцыя
■ **"Гравюра XVII — пачатку XX стст."**.
■ **"Паэзія XVIII — пачатку XX стст."**.

Паўночнае крыло палаца

Выстаўкі:
■ **"У ценю дрэваў, над ракой"** экзатычных рэптылій.

Зімовы сад

■ Свет субтрапічных раслін і жывёл.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 60 60.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Лакальныя экспазіцыі ў санітарным вагоне; у партызанскай зямлянцы.

■ Пастаянная выстаўка ваеннай тэхнікі.
■ На тэрыторыі музея працуе пнеўматычны цір.
■ У выставачнай зале: **"Выстаўка новых паступленняў з фондаў музея"**.
■ У выставачнай зале: **"Палітра памяці"**.

ГАЛЕРЭІ*

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс: 290 60 10.

■ **"Адзін дзень у Чэшскай Рэспубліцы"**.
■ **"Мастак і кніга"**.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ "УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, Кастрычніцкая плошча, 1 (Палац Рэспублікі). Тэл.: 227 26 12.

■ **"Пункт гледжання"**.

ГАЛЕРЭЯ ТЫЗЕНГАУЗА

г. Гродна, пл. Тызенгауза, 4. Тэл./факс: (8–0152) 72 27 57.

■ Выстаўка гродзенскіх мастакоў.

КАРЦІННАЯ ГАЛЕРЭЯ Г.ВАШЧАНКІ

г. Гомель, вул. Карповіча, 4. Тэл.: (8–0232) 77 75 20.

Экспазіцыі:
■ **"Г.Х. Вашчанка"**.

Выстаўкі:
■ Выстаўка **Васіля Шаранговіча.**
■ Выстаўка плакатаў **Уладзіміра Цэслера і Сяргея Войчанкі** з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.
■ Выстаўка экзатычных рыбак. *(фотаздымкі птушак і вавёрак Гомельскага парку фотааматара Яўгена Шастакова).*
■ **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.
■ Працуе куток жывых

Паважаныя чытачы!

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА

на газету "Культура"
Падпісныя індэксы: індывідуальная падпіска — 63875, ведамасная падпіска — 638752;

на часопіс "Мастацтва"
Падпісныя індэксы: індывідуальная падпіска — 74958, ведамасная падпіска — 749582.



НА II ПАЎГОДДЗЕ 2009 ГОДА!

ТЭАТРЫ*

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, тэл./факс: 334 11 56. (пл. Парыжскай каммуны, 1)

■ **6 — "Шчаўкунок"** П.Чайкоўскага.
■ **9 — "Багема"** Дж.Пучыні.

РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. тэл./факс: 334 60 08.

■ **8 — "Ах, гэтыя вольныя матылькі!"** Л.Герша.
■ **10 — Творчая сустрэча з Міхаілам Мішыным.**
■ **11 — "Дзённік паэта ("Інтымны дзённік")** С.Кавалёва.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.

■ **Тэатр знаходзіцца на гастролях.**

МАЗЫРСКІ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР ІМЯ І.МЕЛЕЖА

г. Мазыр, вул. Ленінская, 23. Тэл.: (8–02351) 211 31.

■ **Тэатр знаходзіцца на гастролях.**

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА — АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

Выдаецца з кастрычніка 1991 года
Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 418
Галоўны рэдактар — Людміла КРУШЫНСКАЯ

Рэдакцыйная калегія:
Лілія АНАНІЧ, Уладзімір АРЛОЎ, Уладзімір ГІЛЕП, Ірына ДРЫГА, Аляксей ДУДАРАЎ, Уладзімір ЗАМЯТАЛІН, Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ, Міхаіл КАЗІНЕЦ, Віктар КУРАШ, Аляксандр РАШЧУПКІН, Барыс СВЯТЛОЎ, Рычард СМОЛЬСКІ, Святлана СУХАВЕЙ, Міхаіл ФІНБЕРГ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, Уладзімір ШЧАСНЫ.

Рэдакцыя:
Сяргей ТРАФІЛАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Пётр ОВАД (адказны сакратар).

Рэдактары аддзелаў:
Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Таццяна КОМАНАВА, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілля СВІРЫН, Антон СІДАРЭНКА.

Спецкарэспандэнты:
Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Наталля КІРПІЧЭНКАВА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ.

Загадчык аддзела фотаілюстрацый — Юрый ІВАНОЎ
Карэктар — Інга ЗЕЛЬГІС
Мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр.Незалежнасці,77.
Тэлефон: (017) 289-34-66 (прыёмная) (017) 286-07-97,
Тэлефон/факс: (017) 334-57-23 (017) 334-57-35.
Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334-57-41
www.kimpress.by
E-MAIL: kultura@tut.by

Выдавец — **Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва"**
Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №02330/0131892 ад 27 снежня 2006 г.
220013, Мінск, пр.Незалежнасці, 77.
Тэл. (017) 289-34-66.
Бухгалтэрыя: тэл. (017) 334-57-35

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца работы, зваротны адрас. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
***Матэрыял на правах рэкламы.**

© "Культура", 2009.

Індэкс 63875
Наклад 9034
Падпісана ў свет 04.06.2009 у 18.15
Замова 2987
РУП "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". 220013, г.Мінск, пр.Незалежнасці, 79

ISSN 1994-4780